№ 33 (439) 2 верасьня 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыдня, у пятніцы



**Ян Маўзэр**

«Усе ня раз тлумачылі мне, які я дэбіл». Лідэр новай хвалі беларускага року пра сябе.

старонка 18

**Чатыры цэнтры Эўропы за паўгадзіны**

Экспэдыцыя «НН» на возера Шо.

старонка 12

**Маркотная рыба-сонца**

Брат ваўка, Шніп, выпусьціў пранізьлівую кнігу вершаў. Піша Аляксандар Фядута.

старонка 10

ПАЛІТЫКА

**Палякі сталі нашымі поўнасьцю**

Улады Беларусі хочуць, каб у краіне не засталося ніводнай арганізацыі, якая прымала б дапамогу ад замежных краінаў. Міністар замежных справаў Польшчы Адам Ротфэльд заявіў, што Варшава і надалей будзе падтрымліваць Саюзу палякаў на чале з Анжалікай Борыс. Новы старшыня СПБ Юзаф Лучнік пагладае на начальніка ідэалягічнага аддзелу аблвыканкаму Ўладзімера Амельку. Рэпартаж з Ваўкавыску Аркадзя Шанскага. **Старонка 3.**

ГАСПАДАРКА

**Мірны атам?**

Новая канцэпцыя энэргетычнай бясьпекі, зацьверджаная ўказам прэзыдэнта № 399, утрымлівае палажэньне аб магчымасьці будаўніцтва ў Беларусі атамнай электрастанцыі да 2010 году. **Старонка 5.**

ГРАМАДЗТВА

**Бум інтэрнэт-сатыры на Лукашэнку**

Апошні піск «ультравожыкаў» — «Атлянтыда» — увайшоў у тройку найлепшых песень у інтэрнэтаўскім гіт-парадзе. А сайт «Майкі патрыётаў» прапануе набыць саколкі з выявамі замызганых француժанак і вершамі Быкава. **Старонка 9.**

ЛІТАРАТУРА

**Барсэлёнскія сУчасьнікі**

Новыя творы Адама Глёбуса. **Старонка 19.**

## Не забудзьцеся падпісацца на квартал

Падпісны індэкс газэты «Наша Ніва» 63125. Падпіска для прыватных асобаў будзе каштаваць 4510 рублёў у месяц, для арганізацыяў — 5631 рубель. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» таньнейшая: 3340 рублёў на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень.

**Падпіску прымаюць да 15 верасьня.**

# Стопард у Менску

Ён выглядаў так, як і мусіць выглядаць клясык сучаснасьці, які не згубіў дэмакратызму, нягледзячы на тое, што бачыў свае пастаноўкі на найлепшых сцэнах сьвету, а на палічцы ў ягоным доме стаіць залаты «Оскар». Сусьветна вядомы драматург **Том Стопард** зладзіў у сталіцы майстар-клясу. Рэпартаж **Алеся Кудрыцкага** на **старонцы 9**.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Новыя дзяржаўныя манаполіі

За калійнымі ўгнаеньнямі падыходзіць чарга нафтапрадуктаў. У выпадку калію пад выглядам цэнтралізацыі Беларусь папросту замяніла партнэра.

Дзяржава прыбірае да рук усё, адкуль можна атрымаць грошы. У першую чаргу, валютаносныя галіны — калійныя ўгнаеньні ды нафтапрадукты.

У краіне створаная дзяржаўная манаполія на экспарт калійных угнаеньняў. 29 жніўня А.Лукашэнка ўказам №398 надаў выключнае права на экспарт прадукцыі «Беларуськалію» створанаму ў красавіку ААТ «Беларуская калійная кампанія». Указ уступіць у сілу 25 верасьня.

**Працяг на старонцы 5.**

## Прыднястроўская Малдаўская РБ

Рэпартаж з Тыраспалю **Лёліка Ушкіна**.

2 верасьня ў Тыраспалі будуць адзначаць 15-ты Дзень незалежнасьці. Але бізнэсмэнам «Шэрыфу», якія кантралююць прыднястоўскую эканоміку, становіцца цесна ў рамках непрызнанай ПМР. Яны марань выйсьці на шырокі прастор, а дзеля гэтага патрэбны саюз з Малдовай у любым фармаце — канфэдэрацыя або фэдэрацыя.

**Працяг на старонцы 11.**

## Маці Божая Студэнцкая

У сьвеце два дзясяткі каранаваных абразоў. Тры зь іх знаходзяцца ў Беларусі.

28 жніўня ў Горадні, ля бэрнардынскага касьцёлу, адбылася каранацыя абраза Маці Божай Кангрэгацкай. У гэты ж дзень адзначалася таксама 300-годзьдзе Фарнага касьцёлу. На сьвята прыбылі ня толькі герархі каталіцкай царквы Беларусі на чале з кардыналам Казімерам Сьвёнткам, але й госьці. З Масквы прыехаў пастыр расейскіх каталікоў карэнны гарадзенец арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч.

**Працяг на старонцы 7.**

# Дойчэ Вэле, браты-русафілы

**АНДРЭЙ ДЫНЬКО**

Пытаньне было прынцыповым. Адзіны мэдыйны праект для Беларусі, падтрыманы Нямеччынай і Эўразьвязам, — па-расейску.

Пратэст супраць такое «Дойчэ Вэле» зрабіў шмат карысьці. Ён прабіў крыху беларускае мовы ў праект. Ён мабілізаваў супольнасьць на змаганьне за свае вартасьці. Гэта была нармальная рэакцыя здаровага грамадзтва на справу, якая яго кранае. Абарона вартасьцяў заўжды вартая. Стаяньне за вартасьці — гэта той штодзённы плебісцыт, які і робіць супольнасьць супольнасьцю. Стаяньне, якое перадумовай для дэмакратыі.

Аднак нечага важнага не адбылося, для чаго была нагода і на што я спадзяваўся, пішучы два тыдні таму свой адказ сайту «Наша думка».

З аднаго боку, ніхто зь беларусафілаў не задумаўся, чаму масквафілам зь незалежнага грамадзтва так хочацца мець менавіта сваю радыёстанцыю (яны вераць, быццам адчэпны праект Эўракамісіі з часам вырасьце ў сапраўднае радыё). З другога боку, з інтэлектуалаў-масквафілаў ніхто не сказаў: так, мне асабіста было б выгадна, каб радыё вяшчала па-расейску, але я ахвярую сваім інтарэсам дзеля маіх братоў-беларускамоўных. Аднолькава шкада, што не адбылося ні першага, ні другога.

Першага, бо застаёмся безуважнымі да русафілаў, не адсочваем іхнай эвалюцыі, ня лічымся зь іхнымі інтарэсамі. А яны памяняліся! Іхнае жаданьне мець у дадатак да іншых СМІ радыё па-расейску — праз імкненьне мець усе інструмэнты для паўнапраўнага ўдзелу ў незалежным грамадзтве, быць застрахаваным ад магчымага закрыцьця газэтаў. Нам цяжка зразумець, як можа спалучацца масквафільства і жаданьне будаваць незалежную Беларусь. Нам гэта падаецца абсурдам пераходнага пэрыяду. Пакінем гэта. Але запомнім, сябры, што мы мусілі б наступны раз памятаць пра сваіх братоў-масквафілаў. Яны, у прынцыпе, таксама бачаць сябе будаўнікамі Беларусі. Паводле свайго праекту, але Беларусі, не Заходняй Расеі.

Каб дабіцца перамены палітычнага курсу краіны, мусова актывізаваць русафільскую частку грамадзтва. Сілы адных беларусафілаў мала, як паказалі 1991 ці 1996 гады. Як гэта зрабіць? Так, вяшчаньне замежнага радыё на расейскай мове — кепская рада. Але што добрая рада, што магло б зачапіць? Што магло прышчапіць ЭГУ нязломны ліцэйскі дух? — калі вывернуць тое самае пытаньне іншым бокам. Беларуская мова, беларуская ідэя — ужо гаварылася. Што яшчэ, калі гэта немагчыма?

З боку ж масквафілаў не пачулі пакаяньня за культур-расізм (мінулы, але ня ўсімі зжыты). Камусьці пакажацца: ну і хай, нацыянальная, культурная абмежаванасьць калечыць таго, хто сябе абмяжоўвае. Не цікавая камусьці беларуская традыцыя, ягоная бяда. Аднак бяз моманту сымбалічнага раскаяньня перад беларускай мовай цяжка будаваць новую Беларусь як дзьвюхмоўную супольнасьць. Няма салідарнасьці ў фундамэнце.

«Рашэньне пра расейскую мову «Дойчэ Вэле» разбурыла адзінства незалежнага грамадзтва. Для мяне гэтага досыць, каб яно было перагледжанае». Так не сказаў ніхто з маіх апанэнтаў. Нават сымбалічна — вядома ж, рашэньне, што прымалася чатыры гады, двойчы даўжэй будзе пераглядацца. З гэтага маўчаньня я раблю выснову, што салідарнасьць незалежнага грамадзтва не для ўсіх — закон і мэта.

Дыскусія прымусіла мяне ўсумніцца ў грамадзянскасьці маіх апанэнтаў. Немцы дыпляматычна аддаюць нас у расейскую Эўропу, і нацыяналісты (вы ж «расейскамоўныя беларускія нацыяналісты», спадару Дракахруст?) з гэтым пагаджаюцца! Эўразьвяз дэманструе Расеі, што ён ня будзе ўсур'ёз мяшацца ў беларускія справы, і яны пляскаюць у далоні. Далі 15 манэтаў, дзякуй і за гэта, сказаў бы Колас.

Спадабалася ж стрыманасьць большасьці ўдзельнікаў дыскусіі, сумленнае абдумваньне аргумэнтаў працiўнага боку, інтэлектуальны рост незалежнага грамадзтва.

Нашы дыскусіі пра нацыянальныя інтарэсы ўплываюць на лукашыскую частку грамадзкай эліты, трэці бок беларускага трохкутніка. Гэтае ўзьдзеяньне на таго, хто побач маўчыць, мо й важнейшае за ўсе астатнія іх вынікі.

Беларускую мову варта аберагаць любымі спосабамі. Гэта наш культурны скарб. Гэта таксама найлепшая гарантыя дзяржаўнай стабільнасьці, як піша Аркуш. Усе нацыі Ўсходняй Эўропы разьвілі і абараняюць свае мовы. Чаму беларусам ісьці нейкай асобнай дарогай?

Але беларускамоўныя, расейскамоўныя — мы адна грамада, незалежна ад мовы. Сіліцкі па-расейску, Вячорка па-беларуску належаць да аднаго перакананьня, таксама як Бондар па-беларуску, Шэйман па-расейску — да іншага. Мы творым сваю нацыю поплеч, а ня побач.

Я б так сфармуляваў карэктную тактыку на сёньня, якая прывядзе да ўмацаваньня дзяржаўнасьці: ніводнага СМІ безь беларускай мовы. Дзе менш, дзе больш, дзе цалкам. Напрыклад, украінцы робяць рэкляму нават у расейскамоўных СМІ толькі па-ўкраінску. Інакш нам не сплаціць гістарычнага доўгу перад беларускай мовай. Ды, імаверна, доўга заставацца каляніяльнай плямай на карце эўрапейскіх аб'яднаных нацый. Чаго ў палітычных і грамадзкіх элітах Беларусі ня хоча больш ніхто. З апошнім вы ня будзеце спрачацца, браты-русафілы?

**Меркаваньне Зінаіды Бандарэнкі і водгукі чытачоў на тэму беларускага праекту «Дойчэ вэле» на старонках 16—17**.

# «БДГ» прыпыняе існаваньне

Міністэрства інфармацыі не зарэгістравала ўзгодненай ва ўсіх інстанцыях назвы «БДГ. Деловая газета». Міністар Уладзімер Русакевіч загадаў выдаўцу газэты Пятру Марцаву патлумачыць, што значыць «Б» у абрэвіятуры. Марцаў сказаў, што «большая». Русакевіч загадаў перапісаць дакумэнты, расшыфраваўшы абрэвіятуру ў дужках. Марцаў адмовіўся, спаслаўшыся на тое, што цягам трох месяцаў назва ўзгаднялася й нарэшце была зацьверджаная Менгарвыканкамам, а таксама былі ўнесеныя зьмены ў статут прадпрыемства «Марат». Цяпер жа трэба перарабляць і перападаваць усе дакумэнты наноў. Русакевіч паабяцаў, што націсьне на каго трэба, каб усе зьмены ўнесьлі за адзін дзень, сказаў, што атрымаў на тое згоду намесьніка кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта Алега Праляскоўскага. Марцаў не паверыў. І правільна зрабіў, бо чыноўнікі падманвалі яго за 13 з паловай гадоў, што існавала газэта, тысячы разоў. Шкада. Добрая была газэта. А ведаючы Марцава, упэўненыя, што газэта будзе існаваць і надалей. Пакуль — у Інтэрнэце.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Галоўны рэдактар «БДГ» Пятро Марцаў і вярстальнік Андрэй Вашкевіч разглядяюць новы лягатып газэты.**

## «ARCHE» ў Горадні

Сустрэча з чытачамі ў Горадні 12 верасьня будзе не звычайнай. На ёй адбудзецца ўрачыстая цырымонія прэміі часопісу за 2005 год. Да гарадзенцаў прыедуць рэдактар «ARCHE» Валер Булгакаў, філёзаф Пётра Рудкоўскі. Сьпяваць будзе гурт «4:8».

Запрашаем усіх а 19-й у майстэрню Зьмітра Іваноўскага на Будзённага, 48а.

## ДЗЕНЬ ВЕДАЎ

**1 верасьня** а 18-й ля помніка Янку Купалу моладзь ладзіць Беларускі дзень ведаў. Ускладаем кветкі песьняру, сьпяваем разам любімыя песьні. Проста, яскрава, па-беларуску.

## Напішы пісьмо Севярынцу

Павал Севярынец адбывае свой тэрмін высылкі на крайняй Поўначы Беларусі. Каб вырваць з грамадзкага жыцьця, яго закінулі ў глухі край. Там у радыюсе 30 км няма газэтнага шапіка й царквы, ня кажучы пра Інтэрнэт і мабільную сувязь. Але Паўлу можна напісаць на адрас:

**Да запатрабаваньня Паўлу Севярынцу П.а. Малое Сітна 211652 Полацкі раён**

## ЦЫТАТНІК

**Напярэдадні ўласнага 51-годзьдзя Аляксандар Лукашэнка даў шэраг рэцэптаў посьпеху ў Інстытуце земляробства і сэлекцыі НАН.**

«Кожнаму дадім па калхозу ўбытачнаму. Нет, убытачных у нас нет, атстаюшчаму».

«Іспользаваць толька беларускую сельскахазяйственную цехніку в аснаўном!»

**БТ**

## ВІСЛАВА ШЫМБОРСКА

### Першы фатаздымак Гітлера

А што гэта за немаўлятка ў паўзунках?
Дык гэта ж Адольфік, сын пана й пані Гітлераў!
Можа, стане доктарам права?
Альбо будзе тэнарам у венскай опэры?
А чыя гэта ручка, чыё вочка, вушка, носік?
Чый жывоцік, поўны малака? Яшчэ не вядома —
друкара, службоўца, гандляра, ксяндза?
А куды гэтыя сьмешныя ножкі зойдуць, куды?
Да садка, школы, кабінэту, да шлюбу
мо з дачкою бурмістра?

Дзіцятка, анёлік, сынулька…
Калі год назад зьяўляўся на сьвет,
не было недахопу ў знаках на небе й зямлі —
вясновае сонца, герань у вокнах,
на падворку кручіць катрынку музыка,
шчасьлівае прадказаньне на ружовай паперцы,
тут жа перад родамі прарочы сон маці:
голуба ўбачыць у сьне — радасная навіна,
злавіць яго — госьць зьвяіцца доўгачаканы.
Тук, тук, хто там? Гэта стукае сэрцайка Адольфіка.

Дунда, пялюшка, сьлінявчык, бразготка,
хлопчык, хвала богу, здаровы,
падобны да бацькоў, да коціка ў кошыку,
да дзетак зь іншых радзінных альбомаў.
Ну, ня будзем жа мы зараз плакаць —
пан фатограф пад чорнай радніна зробіць пстрык.

Атэлье Клінгер, Грабэнштрасэ мястэчка Браўнаў,
а Браўнаў — гэта невялічкае, але вартае места.
Салідныя фірмы, пачцівыя суседзі,
смурод рашчыннага цеста і старога мыла.
Не чуваць скавыту сабак і крокаў лёсу.
Настаўнік гісторыі папраўляе каўнерык
І пазяхае над сшыткамі.

Пераклаў
Сяргей Прылуцкі

# Палякі сталі нашымі поўнасьцю

Улады Беларусі хочуць, каб у краіне не засталося ніводнай арганізацыі, якая прымала б дапамогу ад замежных краінаў. Міністар замежных справаў Польшчы Адам Ротфэльд заявіў, што Варшава і надалей будзе падтрымліваць Саюз палякаў на чале з Анжалікай Борыс. Юзаф Лучнік пагладае на начальніка ідэалягічнага аддзелу аблвыканкаму Ўладзімера Амельку. Рэпартаж з Ваўкавыску **Аркадзя Шанскага**.

Пераз'езд Саюзу палякаў у Ваўкавыску адбыўся, паводле ацэнак дзяржаўных СМІ і высокіх чыноўнікаў, «у адпаведнасьці з заканадаўствам і ў канструктыўнай атмасфэры». Яго арганізацыяй займаўся ідэалягічны аддзел Гарадзенскага аблвыканкаму. Ад непажаданых візітэраў форум ахоўвала міліцыя. На мерапрыемства не пусьцілі ніводнага журналіста і нячэснага члена СПБ. Варта адзначыць, што многія дэлегаты зьезду не гаварылі па-польску. «Естэм хора», — так адказвалі яны на просьбы журналістаў пра размову. У дадатак да нашай апазыцыі (ЛДПБ), нашых прафсаюзаў (ФПБ) і нашай моладзевай арганізацыі (БРСМ) у кране ёсьць цяпер і канструктыўная нацменшыня пад дахам СПБ.

## Апэрацыя «Пошук»

Ні на адно падпольнае мерапрыемства апазыцыі журналісты не дабіраліся з такімі прыгодамі, як на гэты зьезд. 26 жніўня Ваўкавыск ператварыўся ў аблажаную фартэцыю: усе дарогі былі перакрытыя супрацоўнікамі ДПС — нібыта з Івацэвіцкай калёніі зьбеглі злачынцы. Праўда, ва ўправе міліцыі Берасьцейскай вобласьці пра зьбеглых злачынцаў нічога ня чулі.

Карэспандэнт «НН» меў няшчасьце паехаць у Ваўкавыск, скарыстаўшыся з паслуг аднае апазыцыйнае суполкі, што наняла аўтобус для «паломніцтва па Гарадзеншчыне». Сярод пілігрымаў былі Вячаслаў Сіўчык, Валер Шчукін, маладафронтавец Зьміцер Дашкевіч, а таксама беларускі жаночы хор. Праўда, як гэта вядзецца ў нашай апазыцыі, канспірацыя была настолькі добрая, што адразу па выезьдзе зь Менску аўтобус пачала «пасьвіць» міліцэйская «Шкода-Актавія» з нумарам 0110 МО. На першым пункце ДАІ нас затрымалі, і старшы лейтэнант Ігар Лойка пачаў праверку дакумэнтаў пасажыраў, патлумачыўшы, што шукаюць зьбеглых злачынцаў «па арыенціроўцы». Аказалася, што 12 з 50 пілігрымаў выправіліся ў адказнае падарожжа без дакумэнтаў.

Карацей, зьезд прайшоў у прысутнасьці мінімуму назіральнікаў ад апазыцыі.

## Апэрацыя «Перахват»

Нас спынялі на кожным пасьце. Паміж другім і трэцім даібрэйкам прыйшла інфармацыя, што журналістаў Івана Романа і Андрэя Пачобута затрымалі на выезьдзе з Шчучына ў Ваўкавыск і зьвінавацілі ў тым, што яны едуць на крадзенай машыне. А актывістаў СПБ Мечыслава Яскевіча, Стася Пачобута й Ігара Банцара затрымалі проста для высьвятленьня асобы.

На чацьвертым посьце нам патлумачылі, што правяраюць усіх: «Ніхто не павінен пратачыцца» — і завярнулі аўтобус у Стаўпецкі РУУС для высьвятленьня асобаў дванаццаці «бяспашпартных». У райцэнтры коласаўскага краю нас праверылі і міліцыя, і ДАІ, і нават транспартная інспэкцыя. Адпусьцілі. Але пакінуць межы раёну мы не пасьпелі. Здагнала міліцэйская машына і вярнула: прабачце, атрымалі інфармацыю, што ў кіроўцы ня ўсё ў парадку з дакумэнтамі. Як толькі мы перастулілі парог РУУСу, дзяжурны перадаў па рацыі: «Усім пастам ДАІ, я Стоўпцы-4. Адбой па пляне «Перахват». Увесьці ў дзеяньне плян «Пошук». Маўляў, лапайце наступных.

Пачуўшы, што міліцыянты лічаць аўтобус крадзеным і чакаюць групу экспэртаў зь Менску, журналісты аддзяліліся ад пілігрымаў і прадоўжылі шлях дызэлем праз Баранавічы.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Удзельнікі зьезду перад пачаткам упарта чыталі ваўкавыскую раёнку «Наш час».**

## Хіба не бывае праваслаўных палякаў?

Таксіст падвозіць па дагледжаных ваўкавыскіх вулачках да Дому культуры. «На зьезд прыехалі?» «Ну так, — адказваем. — А што ў вас кажуць пра яго?» «Як заўжды: выбіраем не таго, каго хочам, а каго трэба».

У Ваўкавыску ўсё спакойна. Знаёмы мне міліцыянт расказвае, што міліцыя працуе ў адпаведнасьці з загадам: «Тых, хто размаўляе па-польску, не чапаць, што б яны ні рабілі». Нешта такое, мусіць, было загадана і 18 кастрычніка мінулага году ў Менску. Фантастычна, як гэтая сыстэма здольная мабілізаваць сотні сілавікоў па краіне дзеля аднаго зьезду СПБ і як умела яна ставрае фасад дэмакратыі.

Зьезд прайшоў цалкам дэмакратычна. Дэлегатаў прывезьлі чатырма аўтобусамі пад аховай. Частка зь іх размаўляе міжсобку па-расейску. Польскіх журналістаў асабліва пацешыла, як з раніцы некаторыя дэлегаты пры ўваходзе ў касьцёл (традыцыйна зьездам папярэднічае маша) ня кленчылі, а схіляліся па-праваслаўнаму ў глыбокім паклоне. Але жагналіся ўсе правільна, зьлева направа.

«Ці не маглі б пракамэнтаваць прынятыя рашэньні?» — пытаюцца журналісты ў адной з дэлегатак. «Естэм хора, естэм хора» («Я хварэю»), — мармыча яна. Вядома, якое ўжо тут здароўе, калі арганізацыяй зьезду займаецца ідэалягічны аддзел аблвыканкаму.

Выбары старшыні адбываліся на безальтэрнатыўнай аснове. Тадэвуш Кручкоўскі ўзяў самаадвод. За кандыдатуру сапоцкінскага пэнсіянэра Юзафа Лучніка прагаласавалі 149 дэлегатаў з 174, супраць — 3, астатнія не ўзялі ўдзелу ў галасаваньні. Намесьнікамі абраны Эдуард Калоша, Казімер Знайдзінскі, Яўген Скрабоцкі. Галоўную раду ўзначаліў Канстанцін Тарасевіч.

## Сумленны пэнсіянэр

Ці здолее Юзаф Лучнік прымірыць Польшчу й Беларусь?

Новы старшыня СПБ нарадзіўся ў 1936 г., яшчэ за польскім часам. Мае ўзнагароды польскага ўраду. У скандалы апошняга году замяшаны ня быў, у фільмах БТ не выступаў. Таму ягоную кандыдатуру можна разглядаць як па-свойму кампрамісную. «Ні Борыс, ні Кручкоўскі», — як казаў у свой час пасол П.Латушка.

Прапануючы кандыдатуру Ю.Лучніка, беларускія ўлады нібыта робяць крок насустрач Польшчы. Пагатоў, калі ўлічыць заслугі новага кіраўніка перад польскім культурным адраджэньнем і ягоную ролю ў заснаваньні Саюзу палякаў Беларусі. Што будзе вырашаць 69-гадовы пэнсіянэр, атачаны крэатурамі ўладаў?

На прэс-канфэрэнцыі амаль пасьля кожнага пытаньня журна-

Працяг на старонцы 4.

### Марэк Бэлька: «Беларусь — палітычны скансэн»

**Прэм'ер Польшчы Марэк Бэлька на спатканьні прэм'ераў краінаў Вышаградзкай групы ў Будапэшце адкамэнтаваў апошнія падзеі вакол Саюзу палякаў такім чынам: «Гэта апошняя дыктатура Эўропы, палітычны скансэн. Праз год выбары. Уражаны вынікамі Аранжавай рэвалюцыі ў Кіеве, Лукашэнка імкнецца ўзяць пад кантроль усе грамадзкія арганізацыі. У Беларусі адбываецца не канфлікт паміж беларусамі й палякамі. У краіне спрабуе ўзмацніцца дыктатура».**

**30 жніўня Польшча сьвяткавала юбілей «Салідарнасьці». 25 гадоў таму польскія працоўныя ўзьняліся на барацьбу за людзкую годнасьць і сваё чалавечыя правы. Бяз гэтага ня ўпаў бы савецкі рэжым і Беларусь не атрымала б незалежнасьць. Голасам Беларусі на сьвяткаваньні быў Лявон Вольскі. Ён узьняў над Варшавай бел-чырвона-белы сьцяг.**



ФОТОАР/СОМР

## СЬЦІСЛА

### Хутка выбары

Лідзія Ярмошына заявіла ў інтэрвію «Звяздзе», што прэзыдэнцкія выбары найхутчэй што адбудуцца 16 ліпеня 2006 г. Старшыня Цэнтравыбаркаму лічыць, што 100 тысячаў подпісаў зьбяруць ня больш за чатыры кандыдаты і што выбары пройдуць у адзін тур. Яна таксама намякнула, што Цэнтрвыбаркам будзе здымаць з гонкі кандыдатаў, якія будуць карыстацца дапамогай з-за мяжы.

### Геніюш на CD

Абвешчаны конкурс на выданьне кампакт-дыску зь песьнямі на вершы Ларысы Геніюш. Праектам займаецца БМАgroup. У зборку ўвойдуць як вядомыя творы («Kriwi» — «Беларуска», «Песьняры» — «Краю мой родны», Цярэшчанка — «Запяі мне песьню»), так і песьні маладых выканаўцаў. Збор фанаграмаў працягнуты да канца верасьня.

### Біблія Скарыны

У Нямеччыне знойдзены асобнік Бібліі ў перакладзе Скарыны. Надрукаваная ў 1517—1519 г. у Празе кніга была выяўленая ў бібліятэцы Гёрліца (Саксонія) Верхнялужыцкім навуковым таварыствам. Яна трапіла туды ў 1524 годзе. Біблія ўключае ў сябе 1316 старонак. У сьвеце вядома 258 асобнікаў спадчыны Скарыны.

### Хвароба Руговы

Стан здароўя прэзыдэнта Косава, 61-гадовага пісьменьніка Ібрагіма Руговы, рэзка пагоршыўся. Лідэр краю быў шпіталізаваны ў мінулую суботу з дыягназам «грып» і знаходзіцца ў амэрыканскім вайсковай бальніцы блізу Франкфурту. Зь імем Руговы, філёзафа й старшыні Саюзу пісьменьнікаў краю, які двойчы абіраўся прэзыдэнтам і за апошнія паўтары гады перажыў два замахі на жыцьцё, зьвязана нацыянальнае адраджэньне Косава. Яго назвалі балканскім Гандзі — за палітычную мэту дабіцца незалежнасьці Косава негвалтоўным шляхам.

**AP; belta.by**

# Палякі сталі нашымі поўнасьцю

Працяг са старонкі 3.

лістаў Ю.Лучнік бездапаможна абводзіў вачыма залю, нібы шукаючы падказкі. А ў заднім шэрагу сядзеў Уладзімер Амелька, кіраўнік ідэалягічнага аддзелу Гарадзенскага аблвыканкаму. І то круціў, то ківаў галавою. Ад сябе новаму старшыню заставалася дадаваць, што ён есьць і хоча застацца «лёяльным обыватэлем панства бялорускего».

### Два кампрамісы, якія немагчымы?

«Лучнік і Гавін (першы старшыня Саюзу палякаў, прынцыповы прыхільнік незалежнасьці СПБ ад уладаў) сапраўды былі ў добрых адносінах. Але вось 2 верасьня Гавін выйдзе з турмы — і як яны будуць глядзець адзін аднаму ў вочы?» — пытаецца журналіст Анджэй Пісальнік.

Былы рэдактар «Глосу знад Немна» Андрэй Кусяльчук няверыць, што дзьве часткі СПБ знойдуць паразуменьне: «Хоць абраны ў Ваўкавыску старшыня сказаў, што ні перад кім не зачыняе дзьвераў, людзі прынцыпу, што падтрымліваюць Борыс, наўрад ці пойдуць на кантакт. Тым больш што Польшча выразна паабяцала Борыс падтрымку». На думку А.Кусельчука, непрызнаны ўладамі СПБ Борыс пасьпяхова працягне сваю дзейнасьць у такім самым рэжыме, у якім функцыянуюць іншыя грамадзкія аб'яднаньні ў Беларусі — у падпольлі: «Яны могуць дзейнічаць як зарэгістраваная за мяжой міжнародная арганізацыя ў рамках ЭРПА. Наўрад ці яны стануць дзейнічаць праз культурна-адукацыйную «Мацеж Польску», бо гэта засталася адзіная польская арганізацыя, якую прызнаюць улады. Думаю, яны не захочуць падстаўляць гэтую арганізацыю».

Калі нават польскія ўлады і пойдуць на маўклівы кампраміс вакол новага кіраўніцтва СПБ, то незалежныя актывісты СПБ прыніжацца не зьбіраюцца. Зрэшты, і ў міждзяржаўных адносінах прымірэньнем пакуль ня пахне. Польскія ўлады заявілі, што кіраўніцтва СПБ, абранае недэмакратычным чынам, ня можа разьлічваць на фінансавую дапамогу Польшчы. Кішэнаму СПБ няма як разьлічваць і на падтрымку польскіх недзяржаўных арганізацыяў. Ясна выказалася Эўрапейская рада польскіх аб'яднаньняў (ЭРПА), якая злучае 41 арганізацыю з 29 краінаў (СПБ уваходзіць у раду з 1996 г.): сход у Ваўкавыску ў заяве гэтай арганізацыі названы «прыватнай сустрэчай дзеячаў СПБ, якія сябе скампрамэтавалі». Рада выказала падтрымку Анжаліцы Борыс. Дарэчы, у дзень зьезду яе выклікалі на чарговы допыт у міліцыю (абвінавачваюць у фінансавых злоўжываньнях), а праз два дні пасьля зьезду кватэру А.Борыс перагрэс крымінальны вышук.

У аўторак у Варшаве ў часе міжнароднай канфэрэнцыі «Ад «Салідарнасьці» да свабоды» міністар замежных справаў Польшчы Адам Ротфэльд заявіў, што Варшава і надалей будзе падтрымліваць кіраўніцтва СПБ на чале з Анжалікай Борыс. Паводле А.Ротфэльда, канфлікт вакол Саюзу палякаў Беларусі, — гэта ня польска-беларуская справа, але ўдар, накіраваны супраць усяго беларускага грамадзтва, частка якога — палякі. Таму Варшава будзе ў гэтай справе і надалей настойваць, каб ініцыятыву ўзяў у свае рукі Эўразьвяз. Ён, дарэчы, дагэтуль ніяк сябе не праявіў у гэтай справе.

А.Ротфэльд падкрэсьліў, што Варшава не пакіне А.Борыс без дапамогі. «Сапраўдная польская грамада зрабіла свой выбар у сакавіку».

Дарэчы, пра Ротфэльда. «Газэта Выборча» апісала, як Тадэвуш Кручкоўскі скардзіўся польскім журналістам, што яго, выхадца з «чыста польскай сям'і», пазбавіў польскай візы «міністар замежных справаў зь няпольскім прозьвішчам».

### Справа Ціцянкова жыве

Саюз палякаў быў самай багатай з грамадзкіх арганізацыяў Беларусі, непадкантрольных уладзе. Ацаніць маштабы нерухомасьці Саюзу палякаў можна па тым, што на ўтрыманьне толькі Дому Польскага ў Горадні штомесяц выдаткоўвалася 4000 даляраў. «Верагодна, на вялікія Дамы польскія ў Магілёве, Віцебску ці Баранавічах ішло яшчэ больш грошай», — адзначае актывіст арганізацыі Андрэй Пачобут. Цяпер улада возьме пабудаваную за грошы Польшчы маёмасьць пад свой кантроль.

Ужо сёньня частка маёмасьці знаходзіцца пад кантролем «афіцыйнага» СПБ, а фактычна — пад апекай улады. «Сцэнар з штурмам АМАПам і КДБ гарадзенскай сядзібы можа быць паўтораны ў любым рэгіёне», — кажа А.Пачобут. «Польскай дзяржаве варта ўзьняць дамовы на кожны аб'ект — пад якімі ўмовамі выдаваліся грошы, ці ёсьць магчымасьць выставіць фінансавыя прэтэнзіі», — прагігвае яго думку А.Пісальнік.

Улады ў розных рэгіёнах ужо цікавяцца, у якую суму абыдзецца ўтрыманьне таго ці іншага Дому польскага. Юзаф Лучнік выказаў спадзяваньне, што цяпер арганізацыя будзе існаваць за дзяржаўныя датацыі. А.Пачобут успамінае, як Тадэвуш Кручкоўскі ў свой час прамацаў варыянты перадачы нерухомасьці на баланс Міністэрства культуры.

У Горадні й Ваўкавыску працуюць польскія школы. Няясна, на якую дапамогу Польшчы ім цяпер разьлічваць. Ні СПБ, ні польскія ўлады даўно ўжо ня мелі ніякага ўплыву на дзейнасьць гэтых навучальных установаў. «Школы былі пад кантролем уладаў даўно, яшчэ да зьезду, і незалежна ад асобы Кручкоўскага, — кажа актывіст, блізкі да Анжалікі Борыс. — Школы ня раз адмаўлялі Саюзу палякаў у памяшканьні пад надуманымі прычынамі, проста каб паказаць, хто насамрэч тут кіруе. Вы ж разумееце, дырэктар школы — чалавек паднявольны…»

Захаваць вольнасьць, захаваць польскую самаарганізацыю, незалежную ад уладаў — такія задачы ставяць сабе тыя палякі, якіх у залю зьезду, насуперак статуту арганізацыі, не пусьцілі. Яны правялі дзень на прыступках перад Домам культуры.

Тэлеканал АНТ назваў зьезд у Ваўкавыску «апошняй і найважнейшай баталіяй у польска-беларускай інфармацыйнай вайне». У нядзельнай праграме «Контуры» АНТ паінфармавала, што Юзаф Лучнік грошай ад афіцыйнай Варшавы выпрошваць ня будзе, а гэта азначае, што ён будзе самастойны ў прыняцьці рашэньняў.

Улады Беларусі хочуць, каб у краіне не засталося ніводнай арганізацыі, якая прымала б дапамогу ад замежных краінаў. Гэтым патрыятычным мэтам служыць новы дэкрэт прэзыдэнта аб выкарыстаньні замежнай дапамогі. Пасьля ваўкавыскага зьезду ўлады могуць ганарыцца сваёй чарговай перамогай. Грамадзяне Беларусі кантралююць уладу ўсё менш, яна іх — усё больш.

**Аркадзь Шанскі**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Намесьнікамі Юзафа Лучніка (стаіць) сталі прыхільнікі Тадэвуша Кручкоўскага.**

## Юзаф Лучнік: «Не адчуваю страху, бо не адчуваю віны»

Пасьля зьезду **Юзаф Лучнік**, абраны старшынём СПБ паводле вэрсіі беларускіх уладаў, адказаў на пытаньні журналістаў.

**— Як Вы мяркуеце дзейнічаць надалей?**

— Ні перад кім не зьбіраюся зачыняць дзьверы. Ні з кім ня буду ў канфлікце. Я ня меў ворагаў, не належаў ні да чыіх прыхільнікаў. Я толькі заўсёды выконваў статутныя мэты і задачы.

**— Польскія палітыкі заявілі, што не прызнаюць вынікаў гэтага зьезду…**

— Я ня ведаю стаўленьня польскага ўраду да мяне і іншых сяброў Галоўнай рады. Лічу недэмакратычным забараняць палякам уезд у Польшчу. Я не адчуваю страху, бо не адчуваю віны.

**— Як ставіцеся да таго, што прыхільнікаў А.Борыс з надуманых прычынаў садзяць у турмы?**

— Я ня ведаю, за што яны сядзяць.

**— Ёсьць зьвесткі, што выбары дэлегатаў на зьезд ішлі пад прымусам.**

— Усе пратаколы выбараў правярала камісія: ніякіх парушэньняў ня выяўлена.

**— Як мяркуеце будаваць далейшыя зносіны зь беларускімі ўладамі?**

— Я ня меў ніякіх канфліктаў з уладамі. Мне ніхто не замінаў у маёй дзейнасьці ў Саюзе палякаў, у арганізацыі фэстаў, перазахаваньні парэшткаў польскіх салдатаў, у доглядзе магілаў паўстанцаў 1863 году ў Сапоцкіне. Думаю, у мяне ня будзе канфліктаў.

**— Як Вы ставіцеся да таго, што ваш былы паплечнік у стварэньні Саюзу палякаў Тадэвуш Гавін цяпер сядзіць у турме?**

— Гавін дзейнічае згодна з сваімі поглядамі. Я не нясу адказнасьці за ягоныя погляды і ўчынкі. Я з сакавіка не ўваходжу ў новаабраную Галоўную раду, і ні з кім сустрэчаў ня меў. Я нідзе не выступаў, і ў палітыку я не мяшаюся.

**— Чаму пагадзіліся заняць гэтую пасаду?**

— Я пагадзіўся, толькі каб выратаваць арганізацыю. Пасьля заўваг Мін'юсту стала зразумела, што бязь зьезду выратаваць арганізацыю немагчыма.

**— Як Вы ставіцеся да выказваньня аб Польшчы як прастытутцы, якое прагучала на Беларускай тэлевізіі?**

— Дужа прыкра мне было. Але польская й беларуская дыпламатыя не ўваходзяць у кампэтэнцыю Саюзу палякаў.

**Юзаф Лучнік**

былы настаўнік гісторыі й польскай мовы, дырэктар вясковай школы. Скончыў Ленінградзкі пэдынстытут. 16 гадоў настаўнічаў у Літве, потым — на Гарадзеншчыне. Адраджэньнем польскай культуры й самасьвядомасьці на Гарадзеншчыне займаецца з 1987 — пасьля сустрэчы Гарбачова зь Ярузэльскім, калі ў СССР дазволілі засноўваць польскія культурніцкія таварыствы. Заснаваў у Гарадзенскім раёне 15 суполак СПБ. Сваёй задачай на новай пасадзе Лучнік назваў уздым аўтарытэту Саюзу палякаў, справу школьніцтва («каб у школах вучылі польскую мову не факультатыўна, а пастаянна»), культурнага адраджэньня.

### Эўразьвяз мосьціць добрыя намеры

Але абяцаецца накіраваць свайго прадстаўніка ў Беларусь для азнаямленьня з сытуацыяй з правамі чалавека, заявіў старшыня Эўракамісіі Жазэ Мануэл Барозу ў аўторак. Толькі хто ж яго пусьціць? Барозу таксама ў чарговы раз выказаў намер «пачаць прамое фінансаваньне беларускіх грамадзкіх рухаў і арганізацыяў». Пакуль сумную вядомасьць набыло толькі вылучэньне Эўракамісіяй грошай на расейскае вяшчаньне «Нямецкай хвалі» ў рамках беларускага праекту.

# Новыя дзяржаўныя манаполіі

Працяг з старонкі 1.

Паводле ўказу «Беларуськалій» будзе ажыцьцяўляць мытнае афармленьне й вываз прадукцыі за межы Беларусі толькі праз БКК (98% у ёй належыць «Беларуськалію», 2% — ААТ «Гродня Азот»). А ўжо апошняя будзе прадаваць угнаеньні. Раней усімі гэтымі працэдурамі займалася Міжнародная калійная кампанія.

Дагэтуль «Беларуськалій» прадаваў угнаеньні (а гэта больш за 13% іх сусьветнай вытворчасьці) на экспарт выключна цераз збытавую сетку МКК. Афіцыйная прычына адмовы ад ранейшай схемы продажу самага прыбытковага з прадуктаў беларускай вытворчасьці — цэнтралізацыя экспарту ўгнаеньняў. Насамрэч Беларусь напросту замяніла партнэра.

### Пазбыцца МКК

Міжнародная калійная кампанія, праз збытавую сетку якой Беларусь з 1992 г. ажыцьцяўляла продаж калійных угнаеньняў, толькі намінальна складалася зь «Беларуськалію» ды расейскіх «Сільвініт» і «Ўралкалій». Апошнія некалькі гадоў самастойна прадае прадукцыю. І ягоны гендырэктар Дзьмітры Рыбалаўлёў некалькі разоў прыяжджаў у Беларусь, сустракаўся з А.Лукашэнкам. Вынікам сустрэчаў стала нядаўняя заява пра далучэньне «Ўралкалію» да Беларускай калійнай кампаніі — дзеля супольнай рэалізацыі прадукцыі на экспарт. Пры такім раскладзе па-за гульнёй апынулася салікамскае ААТ «Сільвініт», якое праз нейкі час таксама абвесьціла, што вядзе кансультацыі, як далучыцца да БКК.

Сваім указам прэзыдэнт вызваліў БКК адразу ад абавязковага продажу валюты ад гешэфтаў і ад афшорнага збору па дамовах марскіх перавозак і даставак прадукцыі да мора (15% ад агульнай сумы ўгоды).

Выглядае, што дзяржава канчаткова выкрэсьлівае з плянаў супрацу зь Міжнароднай калійнай кампаніяй, а да канца году МКК наагул застанецца безь сяброў, што прывядзе да яе зьнікненьня. Беларусь жа цалкам перахопіць ініцыятыву па экспарце больш за 40 % сусьветнага рынку калійных угнаеньняў.

### Званочак нафтатрэйдэрам

Тое самае адбываецца на рынку нафтапрадуктаў. Урад падрыхтаваў дакумэнты па стварэньні адзінага ЗАТ «Беларуская нафтавая кампанія» па экспарце нафтапрадуктаў. Яе заснавальнікамі будуць дзяржаўнае прадпрыемства «Беларуснафта», манапаліст нафтаздабычы ў краіне, Беларускі нафтавы гандлёвы дом — адна з даччыных структураў дзяржканцэрну «Белнафтахім», а таксама заводы «Нафтан» (Наваполацак) і МНПЗ (Мазыр). Доля кожнага з чатырох заснавальнікаў будзе 25%.

Існуў жа стварэньне адзінага апэратара па экспарце нафтапрадуктаў ставіць за мэту цэнтралізаваць экспарт адной з самых прыбытковых галінаў. Цяпер нафтапрадукты, якія выпускаюць беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы, прадаюць блізу 10 кампаніяў: «Юкола», «Слаўнафта-Старт», «Трайпл», «Міралекс», «Юнівэст-М», а таксама «дочкі» «Ітэры» і «Лукойлу». Да канца году ва ўсіх гэтых структурах могуць узьнікнуць тыя ці іншыя праблемы.

Дзяржава плянуе ад пачатку цэнтралізаваць закупку нафты ды яе экспарт, а потым — дадаць сюды яшчэ й пастаўшчыкоў нафты на беларускія НПЗ. Беларусь здабывае сваёй нафты меней за 2 млн тон на год, а нашыя заводы штогод агульна перапрацоўваюць амаль у 10 разоў болей (абсалютная большасьць — расейская). І толькі за першае паўгодзьдзе Беларусь экспартавала амаль 7 млн тон нафтапрадуктаў.

Заплянаваныя перамены настолькі маштабныя, што, магчыма, паўплываюць на ход наступнай выбарчай кампаніі.

**Зьміцер Дрыгайла**




**Засолана! Дайце запіць!..**

# Мірны атам?

Новая канцэпцыя энэргетычнай бясьпекі, зацьверджаная ўказам прэзыдэнта №399, утрымлівае палажэньне аб магчымасьці будаўніцтва ў Беларусі АЭС да 2010 году.

Галоўная мэта дакумэнта, падпісанага прэзыдэнтам, — павышэньне энэргетычнай незалежнасьці краіны. Сёньня Беларусь амаль цалкам залежыць ад Расеі ў пастаўках энэрганосьбітаў (з усходу імпартуецца больш за 85% паліваросурсаў, 70% складае расейскі прыродны газ). Такая сытуацыя ненармальная. А паколькі дывэрсыфікаваць каналы паступленьня энэргіі складана з-за таго, што Расея прадае нам энэргію па больш танных коштах, А.Лукашэнка можа прыняць рашэньне пра пабудову атамнай электрастанцыі. Пакуль на 100% ня вырашана, будзе гэта АЭС, ці ўсё ж некалькі гідраэлектрастанцыяў.

Цягам трох год магчыма ўвесьці ў эксплюатацыю некалькі гідраэлектрастанцыяў у Горадні, Полацку, Бешанковічах. Сёньня ў краіне працуюць 22 гідраэлектрастанцыі, тады як у Літве — больш за 60. Яшчэ 50 гадоў таму колькасьць ГЭС у Беларусі сягала 180. Але патэнцыял беларускіх ГЭС ня можа быць вялікі.

Калі ж вырашаць на карысьць АЭС, то, папершае, у краіне правядуць апытаньне насельніцтва на гэтую тэму, а па-другое, будаваць яе будзе не беларуская, а заходнеэўрапейская кампанія. У кожным разе, у пэрспэктыве мясцовыя рэсурсы павінны забясьпечваць ня менш як 25% энэргіі ад агульнай колькасьці, спажыванай Беларусьсю штогод.

Таксама энэргетычную бясьпеку плянуецца павышаць за кошт пераходу на энэргаэканамічныя вытворчасьці. Да 2010 году энэргаёмістасьць вытворчасьці мае зьнізіцца на 25% проці 2005-га. Колькі ж грошай пойдзе на саму праграму рэфармаваньня, пакуль невядома.

**Яўген Васілеўскі**

НАД ШУМАМ ДЗЁН

## Лясное жніво



**РУСЛАН РАВЯКА**

Што хвалюе беларусаў пры канцы лета? Замежнік, паглядзеўшы беларускую тэлевізію, пачытаўшы газэты, якія робіцца падобнымі адна да адной — ад «СБ» да раёнкі, — адкажа: жніво. І памыліцца…
Беларус ужо з часоў СССР не зважае на ўсе лічбы нарыхтоўкі, пераможцаў розных спаборніцтваў, камбайнэраў-тысячнікаў, даярак-міліянэрак — гэтая інфармацыя шырокаю плыньню праходзіць скрозь ягоны розум, ды бяз шкоды сплывае далей.
Шараговы беларус у гэты час рыхтуецца да іншых нарыхтовак. Зьбіраецца ў лес у грыбы. Сотні машынаў штодня выяжджаюць за горад. Шчасьліўцы, якія маюць сваякоў у вёсках, кіруюцца туды зь пятніцы, каб выпіць за вячэрай, а ранкам пацягнуцца з кошыкам да бліжэйшай пушчы. Небаракі, што ня маюць магчымасьці вырвацца з працы, едуць у грыбы ўвечары, каб за пару гадзінаў нарэзаць хоць па ведзярцы.
У каго няма свайго аўто, уціскваюцца ў раённыя аўтобусы.
Нацыя сноўдае па лесе, пільна выглядаючы сьвінкі й лісічкі.
Пад Баранавічамі народ, як Гаўрош, пад сьвістам снарадаў зьбірае грыбы на палігоне — вайскоўцам некалі аддалі ўраджайны на белыя лес.
Дый стрэльбы як на зло адбываюцца ў тую самую пару, калі вылазяць грыбы. І колькі б ні пужалі аматараў ціхага паляваньня таблічкамі «Увага! Стрэльбы», «Увага! Радыяцыя», колькі б ні выстаўлялі заслонаў, некаторым шчасьціць прабрацца хмызьняком на прагаліну ды каб пасьля пасьпець адпаўзьці пад кананадаю.
Усё, каб пасьля пахваліцца — маўляў, я за раз 400 белых знайшоў! Што ў параўнаньні з гэтым тоны збожжа?!
Нават калі палова з тых грыбоў была чарвівая, дык жа і зерне тое не з найлепшых, але ж сушаць і адно і другое.
Нават кіроўцы грузавікоў, што чакаюць чаргі да камбайну, пасьпяваюць прабегчыся па хмызьняках уздоўж поля, дзе растуць шызыя бабкі. Пра пажарнікаў, што пільнуюць бясьпеку жніва, і казаць няма чаго. Гэтыя зумысьля спыняюцца бліжэй да бору.
Няма калі простаму беларусу слухаць цяпер СМІ. Дай бог пасьпець перапрацаваць набыткі — выварыць ды высушыць. А пасьля яшчэ трапіць у брусьніцы і журавіны, па масьляты ды зялёнкі. Тутака не да Дажынак!
*Баранавічы*

СЬЦІСЛА

### Расейская выстава ў Менску

6—9 верасьня ў Менску пройдзе прадстаўнічая Расейская нацыянальная выстава. Удзел у ёй возьмуць прэм'ер-міністры Беларусі й Расеі Сяргей Сідорскі й Міхаіл Фрадкоў, кіраўнікі сталіцаў Міхаіл Паўлаў і Юры Лужкоў. На выставе будуць працаваць экспазыцыі Ніжагародзкай, Омскай, Смаленскай, Саратаўскай абласцей, Мардовіі, Чувашыі, Стаўрапольля.

### Прыйдуць расейскія банкі?

Некалькі айчынных банкаў у найбліжэйшы час могуць прадаць кантрольны пакет акцый буйным замежным — у тым ліку расейскім — банкам. Пра гэта паведаміў на прэс-канфэрэнцыі старшыня праўленьня Нацбанку Пятро Пракаповіч. Паводле яго слоў, замежныя банкі здольныя інвэставаць у рэсурсную базу беларускіх калегаў ад $100 млн да $200 млн. Агульны ўласны капітал айчынных банкаў на 1 жніўня склаў Br3,130 трлн.

### «Богданы» па-беларуску

Украінская кампанія «Богдан» (Чаркасы) ужо сабрала на Гомельскім аўтарамонтным заводзе 21 пасажырскі аўтобус малой клясы. Да канца году будзе сабрана яшчэ 50. Пакуль зборка ідзе з украінскіх дэталяў. Аўтобусы «Богдан» (21 месца для сядзеньня) зьявіліся ў Менску ўвесну — ААТ «Міндаўг» набыло 35 машын.

### Старчанка аб стане гаспадаркі

У сераду была прэзэнтавана 8-я справаздача прадстаўніцтва ААН і Міністэрства эканомікі «Аб чалавечым разьвіцьці за 2004—2005 гады». Прадстаўніца ААН у Беларусі Джыхан Султанаглу заначыла, што ў Беларусі яшчэ не ўсталяваны баланс паміж паскарэньнем эканамічных рэформаў і зьніжэньнем іх сацыяльных наступстваў. Аднак дадала, што высокі эканамічны рост дае дадатковыя магчымасьці.
Намесьніца міністра эканомікі Тацяна Старчанка наракала, што задача дыверсыфікацыі нашых рынкаў экспарту выконваецца марудна, бо асноўныя фонды прадпрыемстваў зношаны, што адбіваецца на якасьці прадукцыі. Патрэбныя інвэстыцыі ў мадэрнізацыю асноўных фондаў, зазначыла яна. Таксама яна сказала, што тэмпы прыватызацыі ня будуць паскораныя.

### КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 1 верасьня:**
1 амэрыканскі даляр — 2 151 рубель.
1 эўра — 2 627,02 рубля.
1 латвійскі лат — 3 774,68.
1 літоўскі літ — 760,93.
1 польскі злоты — 649,06.
1 расейскі рубель — 75,32.
1 украінская грыўна — 431,01.

**Паводле Нацбанку**

# Айцец Андрэй Абламейка: за Сьвятога Язэпа да канца

Менгарвыканкам распаўсюдзіў інфармацыю, што беларускім грэка-каталікам (уніятам) будзе перададзены будынак касьцёлу Сьв.Язэпа ў Верхнім горадзе, дзе сёньня месьцяцца Архіў-музэй літаратуры і мастацтва і архіў навукова-тэхнічнае дакумэнтацыі. Між тым вяртаньня касьцёлу вернікам ужо некалькі месяцаў дабіваліся рыма-каталікі.

Мы зьвярнуліся па камэнтар да пробашча парафіі Сьв.Язэпа, **а.Андрэя Абламейкі.** «Аніякіх афіцыйных паведамленьняў ці хоць бы запрашэньня для размовы ў Менгарвыканкам я не атрымліваў, — кажа ён і зьвяртае ўвагу на агаворку, што была ў распаўсюджанай афіцыйнай інфармацыі: «...*плянуецца* перадаць грэка-каталіцкаму прыходу...». Але гэта *плянуецца* ўжо ад 1990 году! Лісты з просьбамі выдзяліць грэка-каталікам лапік зямлі пад будоўлю сваёй царквы застаюцца без адказу. Сёлета гэткі ліст пробашч парафіі Сьвятога Язэпа ўжо быў скіраваў на адрас кіраўніка Менску Паўлава. Таму распаўсюджаная ў СМІ інфармацыя — правакацыя, разьлічаная на тое, што людзі, якія моляцца пад касьцёлам, разыдуцца. Таму стаяць за касьцёл варта ў любым выпадку да поўнага разьвязаньня праблемы, мяркуе ён.

Старшыня парафіі Сьв.Язэпа **Анатоль Сёмуха** кажа, што ў выпадку перадачы сьвятыні грэка-каталікам парафіяне палагодзілі б сытуацыю з рыма-каталікамі, і тут маліліся б усе.

І рыма- і грэка-каталікі зь нецярпеньнем чакаюць, што ўлады ад словаў пяройдуць да справы.

**Сяргей Харэўскі**

## СЬЦІСЛА


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Арыштаваныя актывісты грузінскай «Кмары» працягваюць адбываць адміністрацыйнае пакараньне. У аўторак да іх нарэшце дапусьцілі грузінскага дыплямата. Раней выказвалася думка, што да хлопцаў не пускаюць адваката й консула, бо іх паддаюць «псыхалягічнай апрацоўцы».**
**На фота: пікет салідарнасьці з арыштаванымі. Праз хвіліну пікетоўцаў заарыштуюць.**

### Асудзілі грузінаў

Затрыманых 24 жніўня разам з каардынатарам незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Уладзімерам Кабцом** актывістаў грузінскай «Кмары» **Георгія Кандэлакі** й **Луку Цуладзэ** зьмясьцілі ў спэцпрыёмнік на Акрэсьціна. Пракурор санкцыяваў іхнае затрыманьне на 3 сутак. МЗС Грузіі 25 жніўня асудзіла неабгрунтаванае затрыманьне сваіх грамадзянаў.

26 жніўня грузінаў зьвінавацілі ва ўмяшаньні ва ўнутраныя справы краіны. Аднак 27 жніўня не дэпартавалі, а пакінулі ў спэцпрыёмніку. 29 жніўня іх асудзілі на 15 сутак за «дробнае хуліганства». Затрыманым не далі 25 жніўня сустрэцца з грузінскім дыпляматам, 29 — з адвакатам Паўлам Сапелкам.

Акцыю ў падтрымку затрыманых актывістаў «Кмары» 26 жніўня, арганізаваную «зуброўцамі», жорстка разагналі АМАПаўцы. Затрымалі актывістаў «Зубра» **Аляксея Ляўковіча**, **Мікіту Шуцянкова**, **Аляксандра Курбіцкага**, **Антона Дубовіка**, **Натальлю Вушко**. Непаўнагадовых М.Шуцянкова й А.Дубовіка выпусьцілі праз гадзіну. Астатніх засудзілі на 10 сутак.

###Ператрус у кватэры Борыс

У кватэру **А.Борыс** 29 жніўня ўварваліся міліцыянты з крымінальнага вышуку. Удома была ейная сястра **Ганна**. Міліцыянты заявілі, што расьсьледуюць справу зьбіцьця **Міхала Дворчака**, прадстаўніка польскага камітэту «Салідарныя зь Беларусяй»: невядомыя напалі на яго каля дому Борыс і забралі заплечнік. Міліцыянты сышлі праз 15 хвілінаў, калі дадому прыехала А.Борыс з польскімі журналістамі.

### Журналістаў штрафуюць тройчы

Штрафамі ў дзьве базавыя адзінкі (51 тыс.) пакарала адміністрацыйная камісія Ленінскага раёну Горадні 24 жніўня рэдактара часопіса «Magazyn Polski» **Андрэя Пачобута** і рэдактара газэты «Głos znad Niemna» **Анджэя Пісальніка**. Іх зьвінавацілі ў вытоптваньні траўніка падчас несанкцыянаванага пікету ў абарону газэты «Głos znad Niemna» 6 ліпеня. За ўдзел у самім пікеце іх ужо каралі штрафамі, а таксама наклалі забарону на выезд за межы краіны, пакуль не сплоцяць штрафы.

### Затрымалі актывістаў СПБ

Карэспандэнта газэты «Салідарнасьць» **Івана Романа** і журналіста **А.Пачобута** 26 жніўня затрымалі на выезьдзе з Шчучына ў напрамку Ваўкавыску. Міліцыянты заявілі, што іхная машына крадзеная. Абодвух журналістаў павезьлі ў Горадню. 29 жніўня А.Пачобута аштрафавалі на адну базавую велічыню (25 500) за «дробнае хуліганства»: яго зьвінавацілі, што нецэнзурна лаяўся каля Шчучынскага райаддзелу міліцыі. І.Романа таксама аштрафавалі на 1 б.в. за дробнае хуліганства.

У Ваўкавыску ж 26 жніўня затрымалі кіраўніка Гарадзенскай гарадзкой арганізацыі СПБ **Мечыслава Яскевіча**: яму закідаюць намер арганізаваць несанкцыяваны мітынг падчас правядзеньня зьезду ў Ваўкавыску. Актывіста СПБ **Станіслава Пачобута**, затрыманага 26 жніўня, асудзілі 29 жніўня на трое сутак, зьвінавацілі ўшы, што нецэнзурна лаяўся ў прысутнасьці міліцыянтаў.

### Справа шчучынскіх ключоў

25 жніўня ў Горадні журналістаў **А.Пісальніка** і **А.Пачобута** і намесьнікаў старшыні Саюзу палякаў **Юзафа Пажэцкага** і **Веслава Кеўляка** назвалі падазраванымі ў крымінальнай справе паводле арт. 185 Крымінальнага кодэксу. З заявы дырэктара Дому польскага ў Шчучыне Віктара Богдана справу завяла тамтэйшая раённая пракуратура. Паводле ягонай заявы, зьвінавачаныя змушалі Богдана пад пагрозай расправы выдаць ім ключы ад Дому польскага і пакінуць сваю пасаду. Журналістаў выклікалі ў міліцыю як сьведкаў і толькі там выдалі ім пастанову аб прызнаньні падазраванымі. Максымальнае пакараньне паводле арт.185 КК — два гады абмежаваньня волі («хіміі»).

### Праблемы польскіх журналістаў

Апэратара польскай тэлевізіі **Рамана Варашыцкага** 25 жніўня не пусьцілі ў Беларусь. Па тлумачэньні памежнікі параілі зьвярнуцца ў Генэральнае консульства Беларусі ў Беластоку. Варашыцкі ўжо некалькі разоў прыяжджаў у Горадню асьвятляць канфлікт з Саюзам палякаў.

### Справа аўтамабіля Кручкоўскага

У Ленінскім РАУС Горадні 23 жніўня дапыталі віцэ-старшыню Саюзу палякаў **Юзафа Пажэцкага**: сьледчага цікавіла, дзе ён быў ночы з 6 на 7 студзеня, калі згарэў аўтамабіль Тадэвуша Кручкоўскага. Старшыньку СПБ **Анжаліку Борыс** дапытвалі з гэтай жа нагоды 22 і 26 жніўня.

### Беларусь адкідае абвінавачваньні ЭЗ

Прадстаўнік МЗС Р.Есін 25 жніўня заявіў, што Беларусь «як паўнапраўны чалец **Міжнароднай арганізацыі працы** ў поўным абʼёме выконвае забавязаньні, узятыя ў рамках гэтай арганізацыі». Камісія Эўразьвязу дала Беларусі 14 месяцаў для выкананьня рэкамэндацыяў Камісіі па расьсьледаваньнях МАП: шэсьць месяцаў — каб прывесьці заканадаўства ў адпаведнасьць з узятымі абавязкамі, і яшчэ восем месяцаў — на ўласна выкананьне рэкамэндацыяў МАП. У іншым разе Беларусь пасьля гэтага тэрміну пазбавяць гадлёвых прэфэрэнцыяў.

### Цісьнуць на прафсаюзы

25 жніўня ад **Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў** і **Беларускага прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці (РЭП)** запатрабавалі цягам двух дзён падаць у Мінʼюст зьвесткі пра колькасьць сяброў і структуру арганізацыі. Інфармацыю павінны падпісаць старшыня прафсаюзу і кіраўнік кантрольна-рэвізійнага органу. Кіраўнік РЭПу **Генадзь Фядыніч** заявіў, што выканаць патрабаваньне ў такі кароткі тэрмін немагчыма: сам ён у адпачынку, а сябры рэвізійнай камісіі жывуць у розных рэгіёнах краіны.

### Папярэджаньне рэдактару «Борисовских новостей»

Барысаўская пракуратура 25 жніўня вынесла афіцыйнае папярэджаньне рэдактару недзяржаўнай газэты «Борисовские новости» **Анатолю Букасу** за публікацыю матэрыялаў, што парушаюць заканадаўства. Падставай для папярэджаньня сталі публікацыі пра судовы разгляд крымінальнай справы Букаса. Работнікі пракуратуры палічылі, што закон парушаны публікацыяй па незавершаных матэрыялах судовай справы безь пісьмовага дазволу судзьдзі.

### У Бярозе цісьнуць Губарэвіча

Адміністрацыйная камісія Бярозаўскага райвыканкаму 26 жніўня разгледзела пратакол Дамачаўскага аддзяленьня Берасьцейскага РУУС на дэпутата Белаазерскага гарсавету **Юрася Губарэвіча**. Дэпутата вінавацілі ў распаўсюдзе «Інфармацыйнага бюлетэню», які «пагражаў існуючаму ладу». Губарэвіч зазначыў, што бюлетэнь, які мае выходныя зьвесткі, не распаўсюджваўся, а быў знойдзены ў багажніку ягонага аўтамабіля. Дэпутат запатрабаваў перанесьці разгляд пратаколу ў сувязі з шматлікімі парушэньнямі, а таксама выклікаць сьведкаў інцыдэнту. Камісія пагадзілася.

### Затрымалі ў Горадні

Юрыста незарэгістраванага праваабарончага цэнтру «Вясна» **Вадзіма Саранчукова** затрымалі ўвечары 26 жніўня на вакзале, адкуль ён меўся ехаць у Ваўкавыск, на зьезд СПБ. Нарад міліцыі ўзяўся правяраць дакумэнты, а потым «высьветліў асобу» так доўга, што даехаць у гэты дзень да гораду Саранчукоў ня здолеў.

### Высяляюць фонд Сапегі ў Віцебску

Віцебская філія **фонду імя Лява Сапегі** 27 жніўня атрымала з адміністрацыі Першамайскага раёну загад да 1 верасьня пакінуць памяшканьне. Памяшканьне зьбіраюцца тэрмінова перадаць іншаму наймальніку.

### Зьдзек у Магілёве

У Магілёве ўначы 29 жніўня бяз дай прычыны затрымалі актывіста незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Яўгена Суворава**: міліцыянты, як паведамляе сайт арганізацыі, проста пазналі хлопца, якога ўжо затрымлівалі два месяцы таму. У 1-м аддзяленьні Ленінскага РУУС Магілёва хлопца, паводле інфармацыі сайту, закавалі ў кайданкі, зрабілі «ластаўку». Дакумэнты пра затрыманьне не складалі.

### Штраф за партсход

Актывіст ПКБ **А.Новік** 29 жніўня аштрафаваны Берасьцейскім раённым судом на 40 б.в. (1 млн 20 тыс.) за «правядзеньне несанкцыянаванага сходу». Гэткім чынам быў кваліфікаваны сход суполкі ПКБ 9 ліпеня па вылучэньні дэлегата на Кангрэс дэмсілаў, што адбываўся па яе юрыдычным адрасе.

**АШ**

# Маці Божая Студэнцкая

**Працяг з старонкі 1.**







Сьвецкую ўладу прадстаўлялі кіраўнік Гарадзенскай вобласьці Ўладзімер Саўчанка, старшыня Камітэту ў справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў пры Саўміне Станіслаў Буко.

Пазалочаную срэбную карону для абраза зрабіў мастак-рэстаўратар Уладзімер Кіслы. «Ускладаньне кароны не зьмяняе нічога на небе. Гэта наш знак пашаны да гэтага абраза: мы сьведчым сваю павагу да зьдзейсьненых ім цудаў», — патлумачыў адзін з ксяндзоў, што прысутнічалі на каранацыі. Вядома 120 цудаў, зьдзейсьненых гэтым невялікім (18х22 см) абразом.

Гарадзенская выява Маці Божай Кангрэгацкай — трэці з каранаваных абразоў у Беларусі. Першы — у Лагішыне пад Пінскам, другі — у Будславе. Агулам жа ў сьвеце каранаваных каталіцкіх абразоў усяго каля двух дзясяткаў.

Ікона, якая знаходзіцца ў гарадзенскім фарным касьцёле з 1666 г., вядомая ва ўсім сьвеце як абраз Маці Божай Сьнежнай: ён зьявіўся ў храме Санта Марыя Маджорэ ў Рыме на Эсквілінскім пагорку, які ў жнівеньскую сьпёку 352 г. засыпала сьнегам. Асьвечаныя копіі цудатворнага абраза разыходзіліся па ўсёй Эўропе. Аднак толькі гарадзенская выява мае назву Маці Божай Кангрэгацкай.

Абраз зьявіўся на Гарадзеншчыне на пачатку XVII ст. праз дамініканаў, зьмяніў некалькі ўладальнікаў. А ў 1666 г. патрапіў студэнтам гарадзенскага езуіцкага калегіюму. Студэнцкая суполка (кангрэгацыя) у тым самым годзе падаравала абраз новазбудаванаму тады езуіцкаму касьцёлу. Так абраз атрымаў эпітэт «кангрэгацкі». Сам касьцёл ня быў тады асьвячоны: гэтая падзея адбылася толькі ў 1705 г. у прысутнасьці караля Аўгуста II і расейскага цара Пятра I.

Да 300-годзьдзя асьвячэньня і прымеркавалі абрад каранацыі абраза Маці Божай Кангрэгацкай, хоць Папа Ян Павал II даў дазвол на гэта яшчэ ў 2003 г. Сёлета новы пантыфік Бэнэдыкт XVI блаславіў усіх удзельнікаў урачыстай цырымоніі й павіншаваў вернікаў зь юбілеем асьвячэньня касьцёлу.

Нібы далучыўшыся да сьвята, на хмарным ад самай раніцы небе заблішчэла сонца пасьля таго, як кардынал Сьвёнтак замацаваў на абразе карону. Ці ня самай прачулай была прамова арцыбіскупа Кандрусевіча **(на верхнім фота крайні справа)**. Згадаўшы гарадзенскую маладосьць, арцыбіскуп распавёў: «Яшчэ калі я быў малады, то атрымаў параду: калі хочаш добра вучыцца, маліся гэтаму абразу». І нездарма: да Маці Божай Кангрэгацкай і цяпер перад кожнай сэсіяй прыходзяць багата студэнтаў. Нагадаў Тадэвуш Кандрусевіч і пра сам культ Маці Божай, які ў яшчэ ня так даўнія савецкія часы быў «катакомбным»: «Яна Маці Касьцёлу і ўсяго адкупленага чалавецтва». Дарма што ўжо колькі гадоў арцыбіскуп жыве ў Расеі, ягоная беларуская ані не пацярпела: прамова гучала чыста і сакавіта.

На цырымонію сабралося каля дзесяці тысячаў вернікаў з усёй дыяцэзіі. Спадарыня Фэліцыя прыйшла на мыліцах — незадоўга да таго зламала нагу. Сама яна парафіянка іншага касьцёлу, але гэта не нагода, каб прамінуць сьвята: «А як жа інача! Як правільна сказаў Кандрусевіч, бяз Бога — не да парога...»

**Адам Воршыч**
**Здымкі Юліі Дарашкевіч**

# Асалода быць жывотным

## Ржунімагу

«Гэты рэсурс створаны для сапраўдных жЫвотных», — так рэклямуе сябе інтэрнэт-праект пад назвай «В Бабруйск, жЫвотнае» (babruisk.com), піша **Сяргей Будкін**.




У Белнэце падхапілі моду на расейскі моладзевы слэнг-вірус. Вынаходка належыць рэсурсу «Udaff. com», які стварыў альтэрнатыву правільным чатам і форумам. На «Ўдафе» мат ужываюць прынцыпова, шыкам лічыцца вульгаршчына, і чым больш кічу, тым больш у кайф. Такая сабе субкультура «анфан тэрыбляў».

«Наш рэсурс для тых, каго ўціскаюць за нецэнзуршчыну, для тых, хто хоча адчуваць сябе свабодным», — маніфэст «удаваўцаў», і яны хутка знайшлі аднадумцаў. Штодзень сайт наведваюць 50 тыс. чалавек, слэнгавыя наватворы падхапілі мільёны.

Вядомы выпадак: у красавіку маскоўская моладзь, пратэстуючы супраць затрыманьня ў Менску актывістаў «Яблока», мітынгавала з плякатамі «Лукашэнка, выпей йаду», «Лукашэнка — в Бабруйск».

Выраз «В Бабруйск, жывотнае» (пазначае скрайнюю антыпатыю) — адзін з самых папулярных сярод слэнгавых нагрувашчваньняў кшталту «ржунимагу», «фтэму».

Менавіта «Бабруйск» выціснуў з ужытку колішнюю папулярную адсылку ва Ўрупінск. «Сам выраз спачатку зьмяшчаў у сабе нэгатыў, і наш праект мае на мэце зьмяніць гэта. Пакрысе спраўляемся, некаторыя цяпер ганарацца, калі называюць сябе жывотнымі і носяць званьне бабруйчан», — кажуць аўтары сайту babrujsk.com — менчукі Інф і Ромб. Аўтары папярэджваюць, што аніякім чынам ня хочуць зьняславіць аднайменны горад. Іх Бабруйск — ня горад на мапе Беларусі, а невялічкая вёсачка на ўскраіне Інтэрнэту. «Калі жывотныя стамляюцца працаваць на карысьць мясцовых паноў і капіталістаў, яны могуць з дапамогай сучасных сродкаў перамясьціцца ў Бабруйск, атрымаць дозу гумару і вярнуцца да выкананьня абавязкаў», — гавораць пра прызначэньне праекту аўтары, якія сябе называюць «жыватнаводамі, скатаводамі і вэтэрынарамі».

Ствальнікі забаўляльнага рэсурсу ўпэўнены, што іх гумар зразумеюць толькі славяне. Магчыма, яны памыляюцца: апошні жарт на сайце прысьвечаны Майклу Джэксану, які прызнаў сваю віну і дамагаецца, каб яго адправілі ў калёнію для непаўналетніх.

**Караценькі слоўнік «жывотнага»:**

**Албанец** — не славянін.
**Аффтар жжот** — прызнаньне таленту.
**Аффтар, выпей йаду** — выказваньне сваёй антыпатыі.
**Аццкий сотона** — выказваньне рэспэкту (павагі).
**Готично** — прыгожа.
**Креатифф** — тэкст.
**Нетбабланах** — скончыліся грошы.
**Ржунимагу** — выяўленьне добрага настрою.
**Ужаснах** — выказваньне агіды.




## З Мухасранску ў Бабруйск

Шарыкаўскаю тугою па «сапраўдным» адгукаецца крэда інтэрнэт-субкультуры «настаяшчых падонкаў»: «усе, каму не падабаюцца словы «п...» і «х...», могуць валіць нах...». Пра Бабруйск у галовах піша **Андрэй Скурко**.

«Вось усё ў вас як на парадзе, сурвэтку — туды, гальштук — сюды, ды «прабачце», ды «калі ласка — мэрсі», а так, каб па-сапраўднаму, — дык не». Успомніць «Сабачае сэрца» Міхаіла Булгакава змусіў сайт udaff.com. Тою самаю шарыкаўскаю тугою па «сапраўдным» адгукаецца крэда інтэрнэт-субкультуры «настаяшчых падонкаў»: «усе, каму не падабаюцца словы «п… » і «х… », могуць валіць нах… Усе астатнія пруцца».

Прычым як пруцца! Пруцца на міжнародную арэну — яны дасылаюць пахабныя каляжы дэпутатам Эўрапарлямэнту, якія заклікалі Расею аддаць Японіі Курыльскія астравы. Маўляў, Курылы ў Азіі, імі мусіць займацца «нейкі Азіяцкі парлямэнт», а ЭП хай ня лезе.

Але палітыкі на сайце «ўдаваў» вельмі мала. Зусім няма Чачэніі, карупцыі, сацыяльнага расслаеньня грамадзтва. Навошта парыцца? Калі можна «мачыцца міма ўнітазу» й «ташчыцца». Нарэшце можна рэалізаваць запаветную дзіцячую мару: мацюкнуцца пры настаўніцы. І двойку не паставяць, бо ня знойдуць. Спрэс псэўданімы.

Уявіць сабе Антона Луцкевіча, які гаворыць Магдалене Радзівіл «мы вас яшчэ разьясьнім», цяжка. Між тым сёньняшняя шарыкаўшчына-ўдаваўшчына — мода, што выйшла зь людзей прасунутых, цэнтравых, перасычаных жыцьцём. З цэнтру Масквы родам. І ўсё, што ляжыць за межамі «цэнтру», для іх — суць бабруйск і мухасранск.

Тым цікавей пачуць «голас бабруйску». Голас, захоплены фактам уласнай тэрытарыяльнай блізкасьці да месца, так папулярнага «ў самой Маскве». Ці мог бы ва Ўкраіне ці ў Літве зьявіцца сайт, кшталту менскага babrujsk.com? Мэханічна пераймаць правілы чужой гульні й ганарыцца найменьнем «жывотных» там не ў мэнталітэце. Хаця... Узьнікаюць жа й там філіі Нацыянал-бальшавіцкае партыі Расеі.

Толькі нацыянальныя рысы невынішчальныя. Цынізму і амаралкі ў «бабруйску» нашмат меней, чым на расейскім арыгінале «ўдаве». А ў цэлым — прэсны адпачынковы сайт «з нацяжкай». Іскры высякае хіба «гімн», варты оруэлаўскай зьверафэрмы:

Толпу полудиких животных бездомных
В объятья свои приняла Беларусь.
Да здравствует созданный скопом животных,
Вонючий, засратый зверями Бабруйск!

Зрэшты, ці можна удафф.ком назваць арыгіналам? У ангельскамоўнай частцы сьвету прапагандай маральных вартасьцяў «сапраўднага падонка» займаюцца коміксныя Бівіс з Батхэдам і герой кампутарнай гульні GTA San Andreas, вулічны бандыт і гвалтаўнік, вакол імаралізму якога зараз ідзе гарачая дыскусія ў ЗША. Так што тэза «бабруйчанаў» аб гумары, «зразумелым толькі славянам», крытыкі не вытрымлівае. Якім славянам? Ясна, што не харватам і не палякам, а насельнікам «адзінай культурнай прасторы». Акурат у гэтай культуры плодзяцца «бабруйскія жывотныя», якім, як пяецца ў гімне, «Лукашенко ... путь озарил». Гэта, як пісаў украінскі палітоляг Мікола Рабчук, цюлені, што спрабуюць гуляць па правілах леапарда. То бок мэханічна пераймаць неперамальнае — чужы нацыянальны сьветапогляд. Праз гэтыя акуляры ўласная краіна выглядае як «амеб и мутантов безмозглых оплот».



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Інтэрнэт-дыялект

«Жы» і «шы» пішы праз «ы»! — заклікае «залатая» расейскамоўная моладзь.

Чаго толькі ня зробіць з мовай, нават самай вялікай і магутнай, малады супрацоўнік кампутарнай фірмы, які мае прорву вольнага офіснага часу, Інтэрнэт і зарад цынічнага гумару! Хто першы пачаў ужываць той дыялект? Можа, старт дала памылка друку? Ці павыляталі з галавы недавучаныя правілы?

У дыялекце яўна праглядаецца аканьне. Мо гэта бомба, падкладзеная беларускімі інтэрнэт-тэрарыстамі пад расейскую моўную культуру? Многія словы выраблены па знаёмым прынцыпе «як чуецца, так і пішацца». Але ёсьць і адваротнае — гіпэрбалізаваная імітацыя марфэмнага прынцыпу артаграфіі. Калі па-расейску правільна пісаць «корона», чаму б не напісаць «сотона»?

Лінгвіст Зьміцер Саўка кажа: такі слэнг мог зьявіцца як пратэст ва ўмовах строгай моўнай рэгляментацыі. У Беларусі два правапісы — і жаданьне ісьці супраць «наркамаўкі» рэалізуецца праз традыцыйную артаграфію. Выходзіць, удаваўскі дыялект — мова пратэсту, расейская «тарашкевіца»?

Адно што існуе яна выключна ў межах моўнай графікі. Пачытайце ўдаваўскія «пэрлы» ўголас — і ўся арыгінальнасьць зьнікне. Толькі мацюкі як былі, так і застануцца мацюкамі.

**Алесь Кудрыцкі**

### Пістончык і ўдаф

Першым зь беларускіх карыстальнікаў слэнгу стаў малады літаратар пад псэўданімам Пістончык, які зьмяшчаў аповеды на сайце litara.net. Ён выкарыстоўваў і нецэнзурную лексыку, і пісаў словы транскрыпцыяй. Пістончык кажа, што ўласна й пачаў пісаць пад уплывам «падонкаў», але потым адмовіўся ад ускладненьня мовы. Праўда, пакінуў мат і спэцыфічны гумар.









# Стопард у Менску

Ён выглядаў так, як і мусіць выглядаць клясык сучаснасьці, які не згубіў дэмакратызму, нягледзячы на тое, што бачыў свае пастаноўкі на найлепшых сцэнах сьвету, а на палічцы ў ягоным доме стаіць залаты «Оскар». Сусьветна вядомы драматург **Том Стопард** зладзіў у сталіцы майстар-клясу. Рэпартаж **Алеся Кудрыцкага**.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Том Стопард** (Штраўсьлер) нарадзіўся ў 1937 у чэскім Зьліне. Ратуючыся ад нацыстаў, сям'я выехала ў Сынгапур. У 1941–м уварваньне Японіі ў Сынгапур зрабілася немінучым. Том, ягоныя брат і маці знайшлі паратунак у Індыі. Бацька не пасьпеў зьехаць і быў забіты японцамі. У 1946–м сям'я Штраўсьлераў эміґравала ў Брытанію, дзе маці Тома ўзяла шлюб з маёрам Кенэтам Стопардам. У 17 год Том кінуў школу і пайшоў працаваць журналістам. Тут выявіўся яго талент рэцэнзаваць спэктаклі. Том пачаў працаваць для часопісу «Scene». Пасьля ён сам паспрабаваў пісаць п'есы і хутка знайшоў сабе літаратурнага агента. Першая п'еса Стопарда, якая прабілася ў сьвет, называлася «Шпацыр па вадзе» і была напісаная адмыслова для тэлебачаньня. Але сапраўдная слава да Стопарда прыйшла ў 1966–м, пасьля лёнданскай прэм'еры п'есы «Разэнкранц і Гільдэнстэрн мёртвыя», дзе дзея «Гамлета» разглядаецца вачыма двух другарадных пэрсанажаў п'есы Шэкспіра. У 1977–м Том Стопард наведаў СССР з групай «Міжнароднай амністыі» і пачаў цікавіцца парушэньнем правоў чалавека ў таталітарных рэжымах Цэнтральнай ды Ўсходняй Эўропы. У 1999–м Стопард атрымаў «Оскара» за сцэнар да фільму «Закаханы Шэкспір» (супольна з Маркам Норманам).

Апрануты ў блакітныя джынсы ды нябеснага колеру кашулю Том Стопард сядзеў за сталом у адным са сталічных клюбаў перад некалькімі тузінамі зацікаўленых вачэй. Акторкі, якія толькі што адыгралі п'есу «Псыхоз 4.48», таксама паселі на зэдлікі ды прыціхлі, пацягваючы глінтвэйн. Трымаючы цыгарэту левай рукой, брытанскі драматург выпускаў дым у столь, устрэсваючы ўскалмачанымі валасамі зь сівізной.

Пачынаючы размову, Стопард павольна пацірае рукі, як чалавек, які жадае ўзяцца за справу, што захапляе. Зрэшты, так і было — драматург, які прыехаў у Беларусь на запрашэньне праекту «Свабодны тэатар», меўся правесьці ў сталіцы майстар-клясу для сваіх беларускіх калегаў. Яму самому, дарэчы, ня дужа спадабалася азначэньне «майстар-кляса» — ён палічыў за лепшае назваць сустрэчу дыскусіяй. Стопард, які не верыць у культурную герархію, жадаў гутарыць не пра тое, што ёсьць добрым тэатрам, а пра ролю тэатру для грамадзтва.

Некалі ў адным са сваіх нешматлікіх інтэрвію Стопард сказаў, што ня любіць чытаць кнігі пра сябе. Таму ён па магчымасьці пазьбягае размоваў з журналістамі — бо ня верыць у нязьменнасьць поглядаў. Драматург мяркуе, што нават калі ён кажа нешта сёньня, гэта зусім ня значыць, што ён будзе так думаць і заўтра. Удзельнікі дыскусіі маглі самі пераканацца ў гэтым — Стопард не выказваў готавых думак, а нараджаў і карэктаваў іх у працэсе гутаркі.

Паразуменьне Том Стопард і яго суразмоўцы знайшлі ў абмеркаваньні дачыненьняў сцэнарыст—рэжысэр. На думку Стопарда, драматург нечым падобны да дыктатара, бо менавіта ён вызначае, які тэкст атрымае глядач. Аднак гэтую дыктатуру абмяжоўвае рэжысэр, які мае магчымасьць вызначаць, якія падзеі пабачыць глядач — і для гэтага рэжысэру зусім не абавязкова зьмяняць тэкст.

Стопард, на грудзёх якога былі значкі з выявай зубра ды эмблемай «Хартыі'97», жыва цікавіўся Беларусьсю — адчувалася, што ён ведае пра нашую краіну нашмат больш, чым выпадковы візытэр. Яшчэ ў дзяцінстве ён паспытаў жахі таталітарных рэжымаў. Без усьмешкі, з сур'ёзным тварам ён слухаў прывычныя нам страшылкі пра скасаваньне кантрактаў, неабароненыя аўтарскія правы ды прыём п'есаў «худсаветамі» ды чыноўнікамі зь Міністэрства культуры. Сытуацыя, якая склалася ў беларускім тэатры, не ўкладваецца ў яго ў галаве: у Брытаніі моладзь ня можа дазволіць сабе схадзіць у тэатар, бо задарагі, а тут квіток можа набыць хто заўгодна, але гэта зусім ня значыць, што можна будзе пабачыць штосьці вартае.

Аднак, што да будучыні беларускага тэатру, тут Том Стопард быў аптымістычным. У пачатку 1990-х у харвацкім Заграбе ён пабачыў маленькі тэатар, арганізаваны сям'ёй актораў — мужам і жонкай. Яны нават самі расстаўлялі зэдлікі, каб некалькі дзясяткаў чалавек маглі паглядзець п'есу. Праз тры-чатыры гады маленькая сцэна зрабілася, бадай, самым знакамітым тэатрам у Заграбе, значнай часткай культурнага жыцьця гораду. І Стопард адчувае, што ў Менску таксама ёсьць аўдыторыя для такога тэатру.

А яшчэ Том Стопард пытаўся ў тутэйшых драматургаў, на якой мове яны пішуць — на беларускай ці на расейскай. Ён быў зьдзіўлены, калі даведаўся, што на конкурс «Свабоднага тэатру» прыйшла 231 п'еса, і толькі 4 зь іх — па-беларуску. Праўда, праблему ён бачыць ня столькі ў выбары мовы, колькі ў інтэрпрэтацыі арыгіналу. «Я думаю, калі сцэнарыст піша на абедзьвюх мовах, гэта нармалёва. Напрыклад, Сэмюэль Бэкет пісаў па-ангельску і па-француску ды сам рабіў пераклад. Няма праблемаў. Але паверце, калі я пішу па-ангельску, а хтосьці перакладае п'есу на нямецкую, францускую ці на любую іншую мову, я адразу адчуваю, што тут нешта ня тое. Мне здаецца, што пераклад — амаль што немагчымая справа. Я цікаўлюся моўнай сытуацыяй, бо не разумею, на якой мове тут размаўляюць. Бо ў 1990-м беларускую мову зрабілі афіцыйнай, а цяпер усё памянялася назад. Для мяне гэта загадка. Але гэта проста фантастыка, што я змог сюды прыехаць. Спадзяюся, завітаю ў Беларусь яшчэ раз».

# Бум інтэрнэт–сатыры на Лукашэнку

Апошні піск «ультравожыкаў» — «Атлянтыда» — увайшоў у тройку найлепшых песень у інтэрнэтаўскім гіт–парадзе. А сайт «Майкі патрыётаў» прапануе набыць саколкі з выявамі замызганых француженак і вершамі Быкава.

### Газэта патрыётаў

Пры канцы жніўня ў Белнэце распачало працу он-лайнавае выданьне «Белорусская патриотичная газета» (www.bpg.h15.ru). На галоўнай старонцы — здымак прэзыдэнта, збоку — спасылкі на сайт прэзыдэнта, «Советскую Белоруссию» і агенцтва БелТА. Навіны — скрозь пазытыўныя і па-расейску — бяруцца ўпрост зь дзяржаўных ураПатрыятычных СМІ. Рэчаіснасьць сама падводзіць да гратэску. «Да 1 верасьня Міністэрства культуры плянуе выпусьціць падарункавы набор цацак для садка пад назваю «Маленькі патрыёт». У яго ўвойдуць чырвона-зялёныя кубікі, дзіцячае выданьне «Советской Белоруссии» ў карцінках і канструктар «Зьбяры Нацыянальную бібліятэку».

### Майкі патрыётаў

Сайт моладзевага руху «Лімон» (www.limon.3dway.org) таксама падтрымлівае прэзыдэнта ва ўсіх пачынаньнях. «Мы хочам узьняць рэйтынг прэзыдэнта, які ўпаў ніжэй няма куды», — б'юць трывогу яны ў маніфэсьце. Удзельнікі праекту «Майкі патрыётаў» (www.cafepress. com/bel_t_shirts) папулярызуюць словы прэзыдэнта. Праз сайт можна замовіць «дыванкі для мышы і кубкі» зь ягонымі выказваньнямі. Можна таксама набыць саколкі з выявамі брудных француженак, Кандалізы Райс (з цытатай пра нэграў на мяжы Беларусі) і хлопчыка, які «ўзяўся за яйца». Саколкі з выявай чырвонаармейца з надпісам «А ты чытаў вершы Быкава?» каштуюць ад $9,89 да 18,69. Арганізатары зьвяртаюць увагу на тое, што гэта некамэрцыйны праект, «усе грошы ідуць на аплату хостынгу і на падтрымку таленавітай моладзі па лініі БРСМ».




### Музыка патрыётаў

Адзін з самых дасьціпных праектаў — музычны сайт «UltraВожык» (www.luka.rocks.it), дзе разьмешчаны сынгл «Ідэалёгія» ды іншыя песьні. У адных кампазыцыях выказваньні прэзыдэнта зьмікшаваныя пад тэхна-рытмы, у некаторых хлопцы пяюць самі: «У нас ёсьць прэзыдэнт, і герб свой ёсьць у нас / З Расеяй мы сябры, мы любім танны газ / Калі нячэсны ты, ты — апазыцыя / Такая нашая ідэалёгія». На сайце зьмешчаныя й запісы іншых выканаўцаў. У прыватнасьці, запісаная ў 1995 г. «Ляпісам Трубяцкім» песьня «Лу-ка-шен-ко».

Апошні піск «ультравожыкаў» — «Атлянтыда» — увайшоў у тройку найлепшых песень сэзону паводле галасаваньня на «Тузіне гітоў».

Спробы пракуратуры знайсьці творцаў сайту «Мульт-клюб» толькі падагрэлі палітычна-сатырычны бум у Белнэце. Беларусы замежжа працуюць над сваімі праектамі, а каардынатар праекту «Трэці шлях» Павал Марозаў, на сайце якога зьмешчаны «Мульт-клюб» і «Лімон», дамовіўся пра супрацу з украінскімі стваральнікамі флэшак пра Януковіча. Украінцы бяруцца стварыць наступныя сэрыі LLL-мультоў.

**Сяргей Будкін**

**Рэйтынг сатырычных інтэрнэт-сайтаў**

1. http://mult.3dway.org
2. http://www.luka.rocks.it (ці http://members01.chello.se/skywatcher/uv/index.htm)
3. http://www.cafepress.com/bel_t_shirts
4. www.limon.3dway.org
5. www.bpg.h15.ru

# Маркотная рыба-сонца



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Брат ваўка, Шніп, выпусьціў пранізьлівую кнігу вершаў. Піша Аляксандар Фядута.**

У старым мультфільме «Умка» белая мядзьведзіца расказвае сыну сумную казку. Маўляў, плавае недзе ў цёплым моры вялікая і круглая рыба-сонца. І яна такая вялікая і круглая, што ніяк ня можа ўнікнуць зубоў акулы.

Віктар Шніп у зборніку «Беларускае мора» таксама расказвае чытачу сумную казку пра сумную краіну і сумны народ.

Няма чаму радавацца.

Паэт — Максім Багдановіч —

…самотны, нібы пілігрым,
Які хоць вярнуўся дамоў,
А дому свайго не знайшоў.

Другі паэт — Уладзімер Караткевіч —

…ужо, як паэт, выпівае
І гаворыць, што можа памерці,
Быццам бы малако з вуснаў сьцерці,
І памерці ў любую хвіліну,
Ды з гарэлкі, а не за Айчыну.

Дый трэцяму паэту — Максіму Танку — «як няволя Радзіма».

Наагул, лёс паэтаў беларускіх, паводле Віктара Шніпа, надзвычай сумны. Беларусь — краіна, якой паэты ўжо не патрэбны:

Ты будзеш салдатам, мой хлопчык
сусед,
А мог бы зь цябе атрымацца паэт.
Ды сёньня паэтаў нікому ня трэба.
Над сьветам, як саван, зьніжэлае
неба…

Чаму так, Шніп ня ўтойвае. У «Балядзе пра царкву і ваўка» — паэтычна ці ня самым моцным вершы зборніка — ён гранічна шчыра гаворыць пра ўласны паэтычны лёс:

…воўк сівы — мой брат старэйшы,
Вольны ён, а я — у ланцугах
Зноў пайду зь сьлязамі на вачах
Да царквы старой прасіць аб
лепшым.

Воўк — старэйшы брат сабакі. У лірычным зборніку Шніп не наважваецца прыгадаць свае знакамітыя показкі пра Сабаку і Граждана, але ў тым, што ён адчувае сябе пасаджаным на ланцуг Сабакам, чытач «Беларускага мора» не сумняваецца ні хвіліны. Нават вобразы, што паўстаюць са старонак зборніка, дэманструюць яго абсалютную скаванасьць. Як быццам Граждан адтаптаў Сабаку нагу, пазбавіўшы яго магчымасьці нават на ланцугу гойсаць, дэманструючы ўнутраную сілу і імкненьне да свабоды.

Шніп пра свабоду помніць, але ўжо не імкнецца да яе. На ланцугу ўтульна і добра. Ёсьць міска, ёсьць будка, а ноччу ёсьць месяц, на які можна ўдосталь павыць.

Хаця — не. Гэта воўк вые:

Буду слухаць сумны шум травы,
Як выцьцё ваўка у шэрым полі…

Сабака ж скавыча, выклікаючы шкадаваньне, але ня зайздрасьць, горыч, але не спачуваньне. Ён прыкаваны да свайго літаратурнага дабрабыту і, нават калі яму ўдаецца на імгненьне сарвацца з ланцуга, ён усё роўна шчыра шукае знаёмыя пахі:

І ён штовечар свой знаходзіў сьвет,
Нібы сабака чалавечы сьлед
Сярод сьлядоў звярыных у траве.

Менавіта таму, што, выбіраючы паміж свабодай ваўка і дабрабытам сабакі, паэт Шніп выбірае дабрабыт, другі з вобразаў-сымбаляў, якія дамінуюць у ягоным зборніку, — вобраз Храму, Царквы — атрымлівае значэньне сумнага месца, дзе, колькі ні маліся за здароўе, усё роўна выходзіць просьба аб дараваньні — гэта значыць той гук, які ў рэальнага сабакі зноў-такі ператвараецца ў скавытаньне:

…аж чэрцям весела было,
І зьнікала боскае сьвятло,
І на Храмах выраслі травы,
І мярзотнікі шукалі славы…

Або:

Штовечар ён адзін свой сьвет шукаў,
Пакуль на сьцежцы ля царквы ня ўпаў.
І зашумела па-над ім трава,
І зьнікла ў небе, як душа, царква…

Або:

Начныя вуліцы залітыя сьвятлом,
Нібыта русла рэк, залітыя віном
Краіны райскай, што начамі сьніцца
нам
У гэтым сьвеце, што даўно ня Храм,
А дымная майстэрня п'яных
падмайстроў,
Што любяць гаварыць пра грошы і
любоў…

Колькі б у місцы ні было смачнага, душа ўсё роўна хоча трапіць туды — да Храму. І адчуваньне недасягальнасьці гэтага храму якраз і напаўняе сабачую — і чалавечую — душу сумам, які потым водгульлем праціне кожны радок кнігі.

І ад гэтага зьяўляецца яшчэ адно пачуцьцё — пачуцьцё ўсьведамленьня паэтам сваёй віны. Ня перад Айчынай і ня перад Паэзіяй — перад імі аўтар «Беларускага мора» ні ў чым, здаецца, правініцца не пасьпеў. А вось перад каханай жанчынай — несумненна.

Цыкль вершаў, прысьвечаных каханай, бясспрэчна, займае цэнтральнае месца ў зборніку. Гэта такі востраў сярод штылявога паэтычнага зацішша, якое раптам запанавала ў беларускім моры. Калі Шніп хоча адпачыць ад «грамадзянскіх» тэм, ад абавязковых для кожнага буйнога паэта размоў з папярэднікамі па ліры, тугі па былой велічы Радзімы і г.д., ён даплывае да гэтага выратавальнага берага, прычальвае да яго (бо плыве, зразумела, на лодцы, а не галышом, змагаючыся з хвалямі) і робіцца самім сабой. Тут яму і доўгачаканы Храм, дзе можна паспавядацца, і стол, і дом. Ёсьць пра што пагаварыць.

Вось і ўсё… Няма ўжо ў садзе руж,
Толькі сьнег бялюткі, як папера,
На якой твой вечна п'яны муж
Піша вершы пад Апалінэра.

Праўда, каханая магла б запярэчыць, што аднаго ап'яненьня далёка не дастаткова, каб пісаць вершы «пад Апалінэра». Але рэч ня ў гэтым.

І можаш ты мяне шчэ палюбіць…
І я магу ўжо больш віна ня піць…

І дзякуй богу, бо жанчыне, якая вярнулася дамоў, выгляд мужа, што сьпяваецца ад тугі, наўрад ці прыйдзецца да густу. Ёй больш даспадобы культурны суразмоўнік, які ведае, што ёсьць на сьвеце іншая літаратура, вечная і не такая тужлівая. І паэт успамінае пра гэтую літаратуру якраз у цыклі прысьвечаных каханай санэтаў, наскрозь цытатным, — прычым цытаты, што паўстаюць у яго памяці, сьведчаць пра ўсё яшчэ не прапітую ўнутраную паэтычную культуру:

…І вось мы разам едзем на клады,
Дзе пахаваны малады Ясенін…
І мы гаворым пра свае клады,
І з намі Багдановіч малады
У вершах адзінокіх ажывае.

…У дворыку, які апеў Булгакаў
І дзе Платонаў сьмецьце падмятаў,
Я над тваёй запіскай ціха плакаў
І вершамі адказ табе пісаў…

…Быццам дзяўчыну, царкву на Нерлі
Нёс у душы Караткевіч з каханьнем,
Каб да царквы мы з табою прыйшлі,
Разам з царквою стрчалі сьвітаньне.

…Вось і ты, прыгожая, як квет,
Як Шэксьпіраў пра любоў санэт,
Мне ідзеш насустрач па Цьвярскім…

Аказваецца, тут, удалечыні ад таго самага «беларускага мора», можна ня піць, не скавытаць, а знаходзіць і культурную аснову для пачуцьця, і незацяганыя, нязьбітыя вобразы — накшталт той жа царквы на Нерлі ў душы Караткевіча (хаця не, і гэта ўжо было ў Рыленкава), і ці ня самы нечаканы радок ва ўсім зборніку:

І, смакуючы, як славу, каву…

Цьвярозы радок. Разважны, але дакладны і востры па сэнсе. Слава не абавязкова кружыць галаву, але неадменна мае аскомістасьць кававы смак, і п'еш яе ня залпам, а глыткамі, імкнучыся зьведаць максымальна магчымую асалоду.

Так, мабыць, піў сваю славу аўтар показак пра Сабаку і Граждана.

У «Беларускім моры» п'юць славу віннную — Караткевіч, Сыс. Яны — нібыта апраўданьне для таго «п'янага мужа», што строчыць «пад Апалінэра»: маўляў, і гэтыя, не раўня мне, грашылі чаркай. Але якраз Караткевіч і Сыс, непасьпяховыя, нелюбімыя ўладай, непрыкаяныя, робяцца судзьдзём яшчэ строжэйшым, чым каханая жанчына. Успамінаеш пра апошні Сысоў зборнік, што выйшаў на грошы чытача тыражом 300 экзэмпляраў, — і ўсё становіцца на свае месцы. Разумееш: вось быў паэтвоўк, які ведаў, што такое свабодная творчасьць, што такое палёт думкі, палёт натхненьня. Але — захацелася ня бегаць самому ў пошуках грошай на выданьне кніг, а прыходзіць у дзяржаўнае выдавецтва, знаходзіць там разуменьне і падтрымку, выдавацца тыражом 1200 экзэмпляраў (пачэсны тыраж, «Яўген Анегін» такім выдаваўся) і з гонарам бачыць свае кнігі ня ў штаб-кватэры БНФ і не ў ТБМ, а ў вялізных дзяржаўных кнігарнях, на пачэсных месцах, недзе паміж Петрусём Броўкам і Ўладзімерам Гніламёдавым.

І воўк прыйшоў да чалавека і папрасіў пасадзіць яго на ланцуг.

Там і сядзіць. На ланцугу каля будкі, што на беразе беларускага мора.

Туга, туга-а-а-а…

Ёсьць гарэлка, і можна запіць,
Каб забыцца, што сёньня зіма,
Што цябе тут са мною няма,
Нібы думак вясёлых прасьвет,
Дзе з душы няшчасны паэт
Адзінокім вярнуўся дамоў,
Нібы воўк, што ўцякаў ад ваўкоў…

Сумна жыць на гэтым сьвеце, панове.

**Шніп В. Беларускае мора: Вершы.** — Менск: Маст. літ., 2004. — 142 с.

# Прыднястроўская Малдаўская РБ



Бігборд у Тыраспалі: герб ПМР на фоне чырвона-зялёна-чырвонага сьцяга непрызнанай рэспублікі.

Працяг са старонкі 1.

### Сястра-блізень

Парада адэптам рэжыму, што зьбіраюцца за мяжу. Каб пазьбегнуць цывілізацыйнага шоку, набывайце туры ў Прыднястроўе. Беларускіх наведнікаў Тыраспалю чакае сюрпрыз: сталіца непрызнанай Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікі як дзьве кроплі вады падобна да сталіцы сёлетніх «Дажынак» — Слуцку. Будаўнікі фарсіруюць капітальны рамонт будынку вакзалу, іхныя калегі ў рэжыме цайтноту мосьцяць пліткай галоўную авэню гораду — Імя 25 кастрычніка. 2 верасьня тут будуць адзначаць Дзень незалежнасьці.

15 гадоў таму на хвалі пратэсту супраць мясцовага закону аб мовах Прыднястроўе дэ-факта стала асобнай краінай са сваім войскам, грашыма з выявай Суворава і нават гімнам, што сьпяваецца на матыў савецка-расейскага.

ПМР, або, як зьдзекліва называюць у Кішынёве, ПаМідоРыя, была створана за чатыры гады да прыходу да ўлады А.Лукашэнкі, які таксама абапіраўся на аналягічныя лёзунгі. Таму рэжым на левым беразе Днястра можна разглядаць і як футуралягічную праекцыю РБ — пагатоў алюзіі паміж ПМР і РБ не сканчаюцца на канстатацыі факту ідэйнай гармоніі лідэраў абодвух дзяржаўных фармацый.

Прыднястроўскі «бацька» — Ігар Сьмірноў — задоўга да беларускага адкарэктаваў канстытуцыю, атрымаўшы права балятавацца на найвышэйшы пост безьліч разоў. Расея амаль на халяву транспартуе сюды сыравіну. Як сьлед — гаспадарка квітнее, і Сьмірноў у кожным публічным выступе не губляе магчымасьці ўштыкнуць свайго малдаўскага калегу Вароніна: «А ў нас на кухні газ, а ў вас?» І такой бяды, што ён вінны Маскве каля мільярда даляраў.

### «Працы ў нас багата»

Актывісты няўрадавых арганізацый перад размовай з замежнікамі выключаюць мабільнікі, каб унікнуць праслухоўваньня супрацоўнікаў Міндзяржбясьпекі. Працы прыднястроўскім чэкістам хапае. Край жыве ў стане дыпляматычнай блякады. Таму галоўнай задачай нашчадкаў Дзяржынскага, калі меркаваць па прэсе, зьяўляецца перасьлед, пошук і дэпартацыя чыноўнікаў Міністэрства рэінтэграцыі Малдовы (МРМ).

Так, 3 жніўня зьлавілі чарговага Джэймза Бонда — Васіля Шова, дырэктара МРМ, які прабраўся на тыраспальскі стадыён, на матч кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў паміж мясцовым «Шэрыфам» і бялградзкім «Партызанам». Але пільнае вока МДБ адфільтравала міністра ў натоўпе тыфозі. Шова дэпартавалі на правы бераг як «дэстабілізатара грамадзкай сытуацыі» за намер «зьнішчыць дзяржаўнасьць ПМР».

Зрэшты, тут ня ўсё так і мінорна. У мясцовым парлямэнце працуюць штаны ажно два апазыцыйныя дэпутаты. Апусьцім тое, што апазыцыянэраў асабіста прызначыў Сьмірноў — каб захоўваў імідж дэмакратыі. Вельмі падобна да сытуацыі з Гайдукевічам і Абрамавай.

Хоць адзіная незалежнае выданьне «Новая Газета» друкуецца ў Кішынёве, улады з вялікім тактам ставяцца да журналістаў. «Нячэсных» на «хімію» не адпраўляюць, а запрашаюць у «кантору», дзе за кубкам гарбаты пераканаўча даводзяць, што мясцовы клімат не пасуе іх здароўю. Мясцовы «Маркевіч» усё разумее і ціха зьяжджае ў Кішынёў або Адэсу.

Калі ж застанецца ў яго непрыемны асадак ад прыднястроўскіх парадкаў, то хіба па дарозе ў эміграцыю. Кожны пераходны пункт у ПМР — асобны фэод. Яго сюзэрэн — памежны афіцэр, можа запатрабаваць 25 «суворыкаў», а можа проста прапусьціць, ад усяго сэрца перадаўшы прывітаньне беларускаму прэзыдэнту.

### Імпэрыя «Шэрыфа»

Швэндаючыся па Дубасарах, паспрабаваў знайсьці хаця б адзін пабудаваны не за савецкім часам будынак. І знайшоў: новы супэрмаркет фірмы «Шэрыф».

«Рэспубліка Шэрыф» — другое, нефармальнае, імя ПМР. Кампанія, створаная пры ўдзеле сьмірноўскага клану, кантралюе амаль усе сэктары эканомікі.

Стаўленьне насельніцтва да манаполіі амбівалентнае. З аднаго боку, тутэйшыя ганарацца, што «шэрыфы» пабудавалі адзін з найбуйнейшых у Эўропе спартовых комплексаў. Зь іншага, не хаваюць люмпэнскіх інстынктаў: цэнтар Тыраспалю нагадвае пляцоўку пад карпаратыўную вечарыну: казіно «Шэрыф» падміргвае нэонавай рэклямай букмэкерскай канторы «Шэрыф».

Насамрэч карпарацыя — бомба запаволенага дзеяньня пад сучасны рэжым Сьмірнова.

Бізнэсмэнам «Шэрыфу» цесна ў рамках непрызнанай ПМР. Яны мараць выйсьці на шырокі прастор, а дзеля гэтага патрэбны саюз з Малдовай у любым фармаце — канфэдэрацыя або фэдэрацыя. Малдова згодна на такі плян, аднак Сьмірноў і Масква наўрад ці пагодзяцца.

Таму «Шэрыф» пачаў сваю гульню. Летась падчас выбараў у мясцовыя органы ўлады на фоне агульнай апатыі карпарацыя інвэставала грошы ў сваіх кандыдатаў. Сёньня гэтыя людзі кантралююць шмат мясцовых саветаў. Цяпер усе чакаюць сьнежаньскіх выбараў у парлямэнт. Згуляе «Шэрыф» зноў сваю партыю, — значыць, на выбарах прэзыдэнта ў 2006 г. паспрабуе прапіхнуць у прэзыдэнцкі фатэль свайго чалавека.

Той, хто пераможа ў схватцы за кіраўніцтва ПМР, атрымае незвычайны падарунак. У галоўную трыбуну, зь якой кіраўніцтва ПМР прымае 2 верасьня парады, у 1967 г. працоўныя замуравалі капсулу з пасланьнем да нашчадкаў, якую трэба дастаць акурат 7 лістапада 2017 г. Ніякай інтрыгі ў тэксце пасланьня няма — гэта эпісталярнае пасланьне пра камунізм ды мір ва ўсім сьвеце.

Інтрыга палягае ў тым, хто праз 11 гадоў дастане тую капсулу. Сын Сьмірнова, сын дырэктара «Шэрыфа» альбо сын Вароніна.




**Прыднястроўска— Малдаўская Рэспубліка** была створана на левым беразе Днястра ў 1990 годзе.

# Крывавая серада ў Іраку

Каля тысячы шыіцкіх пілігрымаў загінулі ў цісканіне ў паўночным Багдадзе. Здарэньне адбылося на мосьце праз раку Тыгр, калі мільён шыітаў рушылі да магілы імама Мусы Казыма, каб узяць удзел у штогадовым фэсьце. Спачатку па людзях стрэлілі зь мінамёта — загінулі 16 чалавек. Але сапраўдная цісканіна пачалася, калі між людзей пайшлі чуткі, што ў натоўпе ёсьць тэрарыст-камікадзэ. Многіх затапталі на мосьце, іншыя ўпалі ў раку і патанулі.

Трагедыя на гэтым ня скончылася. Калі людзі дайшлі да мячэту, зноў пачаўся мінамётны абстрэл, загінулі дзясяткі чалавек.

Шыіты жывуць гэтыя дні ў трывожным прадчуваньні помсты ад суніцкіх экстрэмістаў, разьюшаных тым, што шыіцкая большасьць краіны пачала браць верх у дзяржаве, першым прадвесьнікам чаго стала прыняцьце невыгоднага сунітам праекту Канстытуцыі.



AP

Калі цісканіна была адмыслова сплянаваная — гэта найвялікшы тэракт у Іраку з пачатку вайны. Важнейшая паміж мусульманамі-шыітамі і мусульманамі-сунітамі па маштабах кровапраліцьця пераўзыходзіць нават мусульманска-хрысьціянскае процістаяньне і цягнецца ўжо амаль паўтары тысячы гадоў. Пачалася ж яна ў тым самым Іраку ў далёкім 661 г. Крывавая серада ў Багдадзе паказала, што да канца гэтага кровапраліцьця яшчэ далёка.

**Сяргей Радштэйн**

**Найбуйнейшыя тэракты супраць шыітаў у Іраку**

**29 жніўня 2003** — аўтамабіль узарваўся каля мячэту шыітаў у Наджафе, забіўшы 95 чалавек, у тым ліку аятлу Хакіма.

**2 сакавіка 2004** — у выніку выбухаў у Багдадзе і Кербале загінуў 181 чалавек.

**19 сьнежня 2004** — у выніку выбуху бомбы падчас пахаваньня ў Наджафе і на аўтавакзале ў Кербале загінулі 60 чалавек.

**10 сакавіка 2005** — у выніку выбуху бомбы падчас шыіцкага пахаваньня ў Масуле загінулі 47 чалавек.

## Пекла на зямлі

«Усе людзі мусяць пакінуць Новы Арлеан» — увечары ў сераду заклікала губэрнатар штату Луізіяна Кэйтлін Блянка. Пад вадою зьнікае мільённы горад-порт, заснаваны французамі ў 1718 г. як паўночны фарпост Новай Францыі на Карыбскім моры.

У выніку ўрагану «Катрына» прарвала дамбы, што абаранялі горад ад марскіх хваляў. Прагалы не ўдаецца зацыкаваць мяхамі зь пяском, і вада наплывае. Больш за 200 чалавек загінулі, 80% тэрыторыі гораду знаходзяцца пад вадой.

Радзіма знакамітага Луі Армстранга, знаходзіцца ніжэй узроўню Мэксыканскае затокі.

Мэр гораду Рэй Наджын заявіў, што такія трагедыі здараюцца раз у жыцьці, а CNN ахрысьціла жнівеньскі Новы Арлеан «пеклам на зямлі».

## Што за сасуд яны насілі?



WWW.TUT.BY



REUTERS



KOMMERSANT

**Цягам усяго казанскага саміту СНД лідэры яго славянскіх краінаў рабілі дзіўныя пасы рукамі. Магчыма, кожны дэманстраваў, наколькі беражна ён трымае ў руках свой крыштальны сасуд, які з часам робіцца ўсё менш спалучаным з астатнімі.**

# Чатыры цэнтры Эўропы

Там каталікі моляцца разам з праваслаўнымі ў адных храмах. Там газэты лепш за калгасьнікаў ведаюць вынікі бітвы за ўраджай. Там летам мыюцца ў адной лазьні, а зімой у іншай. Чатыры цэнтры Эўропы аб'ехала экспэдыцыя «НН». З возера Ша — рэпартаж **Андрэя Скурка**.



У цэнтры Эўропы вісіць шыльда, на якой пазначаныя Бэрлін і Сталінград.

### Шо must go on

Шлях да цэнтру Эўропы ляжыць праз вёску Шо. Адзіная дарога ідзе проста праз людзкія двары. Мінуўшы дзясятак хацін і аббегшы прыватны мэндвор самага заможнага гаспадара, яна спыняецца на грудку перад возерам Шо. Тут, пад разлапістымі дубамі, — напэўна, якраз там, дзе стаіць закураны мангал для шашлыкоў — і знаходзіцца цэнтар Эўропы. Кропка, адкуль да Ўралу, за якім пачынаецца Сібір, і да Партугаліі, за якой сканчаецца Стары Сьвет, — роўная адлегласьць. А можа, цэнтар Эўропы недзе на плыткім азёрным дне: там, дзе ў сонечныя дні відаць каменныя крыжы. Іх паходжаньне туманнае. Мог апусьціцца пад ваду сярэднявечны цьвінтар, такое здараецца на балацявінах.

З возера Ша хацелі здабываць сапрапель, але мясцовыя жыхары забайкатавалі справу, баючыся за свой спакой.

Людзі самай цэнтральнаэўрапейскай вёскі (саманазва — шанскія) ня ведаюць, дзе дакладна цэнтар Эўропы. Сям'я, зь якой мы разгаварыліся, складае мяккае кудлатае сена. Гаспадар, гаспадыня, дарослыя дочкі, унук і ашалелы ад цэнтральнаэўрапейскага шчасьця гладкі гарадзкі сабачка. Во, кажуць, летась прыяжджаў карэспандэнт зь Пінску. Распавёў, што цэнтар Эўропы вызначыў касьмічны спадарожнік і скінуў туды нейкую тычку. «Але мы той тычкі ня бачылі», — прастадушна прызнаецца цётачка. Вераць людзі друкаванаму слову і яго носьбітам.

Га? Чаму вёска называецца Шо? «Некалі тут жыла глухая паня, якая перапытвала падарожных: «шо?» — пераказваюць нам людзі тыповую легенду. Хоць самі перапытваюць ня «шо?», а «га?».

### Папяровая ўраджайнасьць

Навукоўцы ж лічаць Шо балцкім тапонімам. Старая цераспалосіца славянаў і балтаў дагэтуль тут заўважная. Наша гаспадыня — цёмна-русая, з арыстакратычным простым носам. У гаспадара клясычнае «быкаўскае» аблічча.

Зь недалёкае адсюль вёскі Завулак Рускі паходзіла маці Васіля Быкава. Там дагэтуль жыве ягоны стрыечны брат Антон Скрабатун. Нам зь ім пабачыцца не ўдалося, ён пасьвіў каровы на далёкім полі. Апроч праваслаўнага Рускага, ёсьць каталіцкі Літоўскі Завулак. Але ён стаіць пусты, там ужо зусім няма людзей. Мінаючы напаўзакінутыя вёскі і зарослыя бярэзьнікам палі Віцебшчыны, пачынаеш моцна сумнявацца ў рэальнасьці тэлевізійных «сямі мільёнаў тон хлеба».

— Ураджайнасьць у нас — цэнтнэраў дваццаць пяць з гектара, — дакладвае загадчыца зерняскладу недалёкай ад Шо вёскі Івесь.

— Ідзі ты, дваццаць пяць… — кпіць дзядзька-прыёмшчык у бэйсболцы, з запечаным на сонцы тварам, падобны да вясёлага афраамэрыканскага рэпэра.

— Ты што, газэтаў не чытаеш, ня ведаеш, якая ў нас сёлета ўраджайнасьць? — чырванее мілая загадчыца. — Летась была дваццаць сем, а сёлета дваццаць пяць...

— А дзе ў вас тут цэнтар Эўропы? — перапытваем, імітуючы стылістыку карэспандэнтаў АНТ.

— А во тут, у цяньку, дзе мы сядзім, — сьмяюцца ссушаныя нізкааплатнай працай і танным віном шофэры. Мясцовы анэкдот гэты цэнтар. Дакладней, цэнтры, бо іх у ваколіцах аж чатыры. У першым, на возеры Шо, мы ўжо былі. Кіруемся ў другі — у вёску Хралы.



Возера Шо ляжыць зьлева ад дарогі з Вушачаў на Глыбокае.

### Сталінград—Бэрлін

«Вы яго адразу ўбачыце, там да дрэва леваруч знак прыбіты», — арыентуе нас цётка. Яна рабіла шопінг у Івесі — хлеб, батон, крупы, цукар. Там у крамах «усё ёсьць» — не ў дзяржаўнай, дык у прыватнай. Плюс у Хралы тры разы на тыдзень прыяжджае аўталаўка. «Калі гарэлкі трэба, ідзіце ў дзяржаўны магазын, бо прыватны зачынены ўжо», — па-свойму разумее яна нашу цікавасьць да мясцовага гандлю. Мілая звычка старэйшых людзей пераходзіць на паўшэпт, калі гаворка пра гарэлку — бо сорамна ж.

Знак, які мы шукаем, уяўляе сабой бляшаны ромб зь серабрыстым абрысам эўрапейскага кантынэнту і пазначанымі на ім чатырма населенымі пунктамі: Сталінградам, Масквой, Івесьсю і Бэрлінам. Ён тырчыць на таполі перад самымі весьніцамі ўжо досыць даўно.

«А чаго я яго здымаць буду — ня я ж вешаў», — кажа гаспадар. «Зь Віцебску прыяжджалі, з абласнога тэлебачаньня. Яны і прыбілі знак. Перадачу тут рабілі», — тлумачаць мясцовыя

### Самы стары знак

цэнтру Эўропы з лацінскім надпісам ужо 125 гадоў стаіць каля вёскі Дзелавое ў Рахіўскім раёне ўкраінскага Закарпацьця. Вылічылі гэты цэнтар географы Аўстра-Вугорскай імпэрыі ў 1887 годзе. А францускія навукоўцы ў 1989 годзе сказалі, што цэнтар Эўропы месьціцца ў Літве, за 26 кілямэтраў ад Вільні. Літоўцы паставілі там велічную калёну зь белага граніту. Ёсьць яшчэ вэрсія, што цэнтар Эўропы месьціцца ў Славакіі, у горадзе Крэмніца. Цэнтральнаэўрапейскімі ёсьць усе краіны, якія лічаць, што цэнтар Эўропы ляжыць на іхнай тэрыторыі.

# за паўгадзіны

людзі. Відавочна, да 60-годзьдзя перамогі Хралы вырашана аб’явіць цэнтрам уратаванай Эўропы. Той, што пачынаецца пад Сталінградам і сканчаецца ў Бэрліне. Але вайну тут помняць і бяз гэтага.

### Маскі-шоў для рыбнагляду

«Мой брат старэйшы ў партызанах быў, — апавядае дзядзька. — Дык і я кожную ноч на жалезку дынаміт цягаў». А на браканьерства заставалася выбухоўка? — сьмяемся. «Дык есьці ж трэба было ў вайну», — цалкам сур’ёзна адказвае ён.

Запасы дынаміту падупалі з вайны. Цяпер больш цягаюць рыбу сеткамі. Але і рыбнагляд ня дрэмле. Інспэктар здымае на відэакамэру нялёгкую браканьерскую працу, а потым едзе да падазраванага, паказвае яму «кіно» і выпісвае квітанцыю. Нядаўна два мясцовыя мальцы — гэтае непаўторнае крывіцкае слова — заплацілі па 200 тысячаў штрафу. Але на кожнае ноў-гаў знойдзецца гаў яшчэ лепшае. Цяпер браканьеры ставяць сеткі ў масках з прарэзамі для вачэй – каб твараў было не пазнаць. Рыбу тут звычайна не прадаюць, ловяць сабе. Дый меней яе стала: «Ня так як раней — як нераст, дык яе бераць мяшкамі».

Мы стаім з талакою чакаем, пакуль пад’едзе прыватны камбайн — касіць людзкое жыта. Бярэ прыватнік паўтары тысячы за сотку. А старшыня аблвыканкаму Андрэйчанка на сэлектарнай нарадзе дакладваў прэзыдэнту яшчэ месяц таму, што столькі й столькі камбайнаў працуюць на ўборцы прыватных участкаў. «Раз Лукашэнка сказаў, будзе выпаўнена! — абсякае дзядзька. — Толькі невядома калі». «Ён тут у нас другія Раўбічы пастроіць!» — ні з пушчы ні зь поля прарокуе цыганаватая кабета. — Дык у вас жа тут гораў няма. — «Ёсьць у нас горы за сялом! І запомні: няма нічога немагчымага! Галоўнае — захацець! — тараторыць яна. — Бо ў нас усё добра, і тэрапэўт да нас прыяжджае раз на месяц з Падсьвільля!»

Жывуць у Хралах няблага і бяз лыжнага курорту. Гаспадары маюць па дзьве лазьні: зімовую — бліжэй да хаты, каб прасьцей было дабрацца па сьнезе, і летнюю — на беразе возера Івесь. «Тых, каму за трыццаць пяць, туды не пускаюць», — сьмяюцца дзядзькі. Наведнікаў у маладзевай лазьні небагата. «Летам прыгожа, а зімой нудна ў Хралах. Няма маладых», — уздыхае бабуля. Жыве тут 26 чалавек. Гэтыя чалавекі атрымліваюць ад 120 да 200 тысяч пэнсіі. Яшчэ ёсьць дачнікі.

### Дачы зь відам на азёры

Яны пакуплялі хаты ва ўсіх навакольных вёсках. У адной Шы іх пяць. Мясцовы гонар — рэжысэр Купалаўскага тэатру Валеры Раеўскі. Яго дача — малюсенькая канцавая хатка ў засені дбайліва абрэзаных яблыняў. Людзі хваляцца, што Раеўскі так упадабаў цэнтар кантынэнту, што набыў і яшчэ адзін дамок у вёсцы Бабруйшчына. У гэтай вёсцы ў 1945—1950 гадах месьціўся савецкі канцлягер. Дагэтуль захаваўся барак, у якім жылі ахоўнікі. Але мэмарыяльнай шыльды на ім няма.

Загарадны дом ля Шы, у Заазёрным, мае і пісьменьніца Вольга Іпатава. Каб трапіць на яе лецішча, трэба аб’ехаць возера Псуя. А з самое дачы відны яшчэ два возеры, і якія! Самае глыбокае возера Беларусі — Доўгае. І тое самае Шо. Дыхтоўны дом абсаджаны туямі, але ім не расьцецца на ветрагоне высокага плято над катлавінай Доўгага.

«Мы ўратавалі гэты дом, які ўжо развальваўся. Але цяпер рэдка выпадае бываць там», — журыцца Вольга Іпатава, запрашаючы нас частавацца апошнімі аж віннымі парэчкамі. Ад Менску да Шы — чатыры гадзіны язды. Калі не перавышаць хуткасьці, вядома.

Аб знакамітых дачніках тутэйшы люд ведае і цешыцца іх прысутнасьцю. «Я Раеўскаму гарод рабіў», — кажа настаўнік фізкультуры зь Івесі.

Вучняў у школе, што стаіць на самым беразе возера, застаецца па пяць—дзесяць на год. Недахоп гадзінаў пэдагогам кампэнсуе гаспадарка. Фізрук мае два гектары зямлі, дзьве каровы і трактар. Паказвае нам яшчэ адзін цэнтар Эўропы — у Івесі, між помнікам ахвярам вайны і дубам, што праізрастае між помнікам і водным патокам. Тут віцебская моладзь ладзіла «Купальле ў цэнтры Эўропы». Раз тут Купальле было, значыць, тутака й цэнтар. Іншай матывацыі няма. А вось былы настаўнік геаграфіі Івескай школы скептычна настроены да ўсіх чатырох мясцовых «цэнтраў»: ён зь дзецьмі падлічваў, і цэнтар Эўропы ў іх выходзіў на паўднёвы ўсход ад Менску.

### Каталік у праваслаўным хоры

Ня згодны і старшыня Псуй-

Працяг на старонцы 14.



Малако ў сялян прымаюць па 330 рублёў за літар.



Амаль усе івескія дзеці.



Зь лецішча Вольга Іпатава бачыць цэнтар Эўропы.



Дачаю Валер’я Раеўскага ганарацца суседзі.

# Чатыры цэнтры Эўропы

Працяг са старонкі 13.

скага сельсавету. На яго думку, быць цэнтрам Эўропы вартая вялікая вёска Псуя. Там і цэнтравая сядзіба КУП «Яблынька», былога саўгасу імя Сталіна, і царква, і аграгарадок будзе. А побач — велічнае возера Доўгае, найглыбейшае ў краіне. Гэта вам не балацянае Шо.

Над Псуяй у распаленым летнім паветры вісіць звон. У царкве, што сьвіціцца на пагорку, пачынаецца спасаўская служба. Званы тут імправізаваныя: заваранымя з аднаго боку кавалкі тоўстай трубы, з прарэзамі для мілагучнасьці. Чуткай дня ў Псуі было тое, што бацюшка паехаў па новыя званы. На іх даўно зьбіралі грошы: 1300 даляраў за два 45-кіляграмовыя «фабрычныя». Але з царквою больш гармануюць сёньняшнія, самапальныя. Збудаваны дзясятак гадоў таму храм не назавеш прыгожым. Кантаватая цэркаўка з сылікатнай цэглы нагадвае трансфарматарную падстанцыю з цыбулінамі. Якая ж вера трэба, каб знаходзіць Бога ў такіх храмах! Нашы продкі будавалі цэрквы больш гарманічныя, хоць і меншыя. Але ж гэта свая, сваімі рукамі зробленая, пераважна немаладымі рукамі. Вокны, усё начыньне, крыжы, нават бляшаныя цыбуліны рабілі мясцовыя людзі. «Таемную Вячэру» маляваў сьвятар з суседняе Плісы. Толькі сьцены ставілі столінскія шабашнікі, землякі тутэйшага бацюшкі. «Там людзі рухавейшыя, ці што», — характарызуе столінскіх мясцовы дзядзька. Штогод беднасьць гоніць адтуль «брыгаду» чалавек з дваццаць працаваць на калгасных бураках.

У псуйскую царкву ходзяць і праваслаўныя, і каталікі. Бацюшка спавядае й прычашчае ўсіх. «А куды ім дзявацца?» Да касьцёлу ў Празароках, што на старым Альгердавым шляху, на тракце Полацак—Вільня, 13 км. Вось і Пятро Іосіфавіч каталік, але сьпявае ў царкоўным хоры. Па-царкоўнаславянску ня ўмею, кажа, дык перапісаў сабе малітвы рускімі буквамі.

## Самая цэнтральнаэўрапейская вёска

У прытворы бачок з вадой. «Вадзічка ад Макавея сьвятога. Дапамагае ад усіх хваробаў, — гаворыць ціхая ўсьмешлівая кабета зь літровым слоікам і вышэйшай эканамічнай адукацыяй. — Выпіла — галава перастала балець». У нас жыць можна, пераконвае яна. Ёсьць камэрцыйная крама «Спатканьне», ёсьць крыху моладзі, летась за жніво камбайнэры атрымалі па мільёне, будуюцца новыя прэзыдэнцкія дамы. І людзі ў нас харошыя, працавітыя — гэтая мантра, запазычаная з тэлевізара, паўсюдна паўтараецца перад карэспандэнтамі. А якія расейскія сэрыялы ідуць! Такія цікавыя, лепшыя за замежныя — хоць ты яго не выключай у будні дзень. Вось па АНТ — «КГБ у смокінгу».



Пятро Іосіфавіч каталік, але сьпявае ў праваслаўнай царкве.



Псуйская званіца.

Загаворваем пра высылку Севярынца. Няма адказу. Вечнае беларускае маўчаньне перад уладай. Людзі замаўкаюць і не глядзяць адно аднаму ў вочы. Жанчынка толькі пытае ціха і сардэчна: «Ну і як яму там жывецца?»

Служба па ўсіх праваслаўных правілах, пасьля ютрані бацюшка робіць перапынак, і людзі выходзяць з царквы адпачыць. Ідуць проста па могілкі, якія тут адразу за плотам. У цэнтры, пры вялізным дубе, — падмуркі колішняга храму. «То была вуніярская царква», — кажа бабулька.

350-гадовы драўляны храм перад вайною накрылі новай бляхай. А ў 1960-я дах спатрэбіўся дому культуры ў Плісе, таксама зробленаму з царквы. «Бурылі шафяры, што вучыліся ў Глыбокім. Іх страшылі, што правоў не дадуць, калі яны нашай царквы не пабураць. А яшчэ раней мясцовага чалавека падбівалі яе разабраць — таксама дзеля бляхі. Дык яму свае запіску напісалі: кранеш — спалім». Стары дастае з рота ўстаўную сківіцу, падкладае пад «прафсаюзныя зубы» кавалак газэты і ўстаўляе сківіцу назад у рот: «Пакуль быў жывы стары бацюшка, царквы не чапалі. Ён гаварыў па-нямецку і ў вайну дапамагаў партызанам». Ужо пасьля вайны, разьбіраючы дом сьвятара, у падполе знайшлі пару забытых партызанскіх вінтовак. Аднаўляць «вуніярскую царкву» ня сталі. Прасьцей было паставіць новую.



Гэтыя людзі збудавалі царкву ў Псуі сваімі рукамі.

## Помнік Маўчуну

А яна ж, старая, была зь лістоўніц. У Псуі й зараз расьце іх цэлая алея. На Захадзе алея рэдкіх дрэваў была б прадметам




Мікалай Маўчун паставіў бацьку помнік з надпісам па-беларуску.

# за паўгадзіны



**Доўгае возера**

Чырвонымі парэчкамі парасьлі стромыя берагі Доўгага возера. Яно па справядлівасьці заслугоўвала б іншай назвы. Доўгіх азёраў у Беларусі дзесяць, а вось 54 мэтры ўглыбкі мае толькі адно. Праз глыбіню вада ў возеры ніколі не праграецца вышэй за 20 градусаў. А глыбей за 20 мэтраў застаецца зусім халоднай — ніжэй за 5 градусаў нават у зэніце лета. Дзякуючы гэтаму ў возеры захаваўся рэліктавы рачок ледавіковага пэрыяду лімнакалянус.

гонару й апекі ўсяго мястэчка. Вакол яе купіліся б кавяранькі, крамы, яе б вымяталі, даглядалі, падсьвятлялі, паказвалі турыстам. Але тут і так хапае тураб'ектаў. «Вунь, перад студняй, у нас некалі ведзьмака забілі. Білі палкамі, аж ён у куль саломы ператварыўся. Дык цяпер там нядобрае месца. То аварыя, то яшчэ што. Раз так скруціла машыну, што ў чалавека ажно руль на грудзях паламалася», — апавядаюць сьветлатварыя ўцаркаўлёныя дзядзькі.

І пра калдуна, і пра «вуніярства» яны ведаюць з словаў краязнаўца-настаўніка Івана Воўкава, які зацікавіў людзей гісторыяй сваёй мясцовасьці. «А дубу нашаму — тысяча гадоў. Пры ім неяк капалі дол, знайшлі манэту з надпісам «soldon».

У дупло дуба складаюць старыя крыжы. На псуйскіх могілках радочкамі помнікі зь беларускімі прозьвішчамі. Гіль, Жандараў, Суравец, Малько, Рагіла. Прозьвішчы беларускія, а мова расейская. Цяжка пераадолець каляніяльныя звычкі: хоць дзе па-беларуску, а на магільных помніках спрэс па-расейску. На ўсе могілкі адзіны надпіс па-беларуску — «Маўчун Уладзімер Адольфавіч».

Уладзімераў сын Мікалай — сапраўдны маўчун гадоў пяцідзесяці. На ім сьветлая кашуля, акуратна выпрасаваныя штаны. Маючы гектар зямлі, ён працуе толькі на сябе. Трымае карову, авечкі, здае малако, за літар якога дзяржава плаціць цяпер 330 рублёў.

«Так захацелася, каб надпіс па бацьку быў па-беларуску», — сам сябе саромеецца ён. Згас у ім ранейшы імпэт да спазнаньня. «Калісь я многа розных газэтаў выпісваў, а цяпер толькі «Веснік Глыбоччыны» чытаю». Але яго сядзіба ў вёсцы Абруб зьзяе парадкам. Ён захоўвае нават пуньку з саламянаю страхою. Мікалай пахвальвае Лукашэнку, які абараняе краіну і ад Захаду, і ад Расеі. Непакоіць яго тое самае, што і ўсіх глыбачанаў: раптам Літва сапраўды збудуе атамны могільнік пры мяжы?

Псуйская царква з сылікатнай цэглы наўрад ці прастаіць трыста пяцьдзясят гадоў. Сьціплая памятка па Ўладзімеру Маўчуну здаецца больш дакладным знакам свайму часу.



Дуб у цэнтры Эўропы на возеры Шо.

Кожны час пакінуў тут па сабе помнік. Курганы, гарадзішчы, крыжы ў азёрах. Тут бяжыць Альгердаў шлях, мяшаюцца генатыпы і археалягічныя культуры, зямля аддае арабскія манэты і скандынаўскую зброю. Тут круцілі віхуры эўрапейскай гісторыі. Цяпер тут вераць у сьвятую ваду і аграгарадкі. Газэты лепш за калгасьнікаў ведаюць ураджай. Тут жывецца добра, тут працвітаньне і стабільнасьць, паўтараюць людзі за экранам. А хаты некалі шматлюдных вёсак пусьцеюць адна за адной. А моладзь папівае. Нібыта Эўропа ляжыць асобна ад свайго цэнтру. Усяго за мэтар. На мэтровай глыбіні.

Літоўцы ў сваім цэнтры Эўропы паставілі калёну зь белага граніту. А мы павесілі бляшанку на таполі. Абвесьцілі цэнтар Эўропы, а што зь ім рабіць — ня ведаем. З дапамогай малатка і зубіла пазначылі Сталінград на бляшанцы — мусіць, каб немцаў з італьянцамі завабіць. Палеткі не арэм, а мільёны тонаў растуць. Невымоўнае хараство азёрнага краю шчэ чакае прыватнага ўласьніка, сапраўднага гаспадара, які зробіць яго з пэнсіянэрскага турыстычным. Тады пра беларускі цэнтар Эўропы даведаецца большасьць эўрапейцаў.

**Здымкі Андрэя Лянкевіча**



**Дзе ня варта быць**

Хата Быкава і ўвесь падворак у Бычках — чысты муляж. Ні духу, ні знаку. Побач у Кублічах ляжаць некранутыя велічныя руіны ўніяцкай царквы, у якой хрысьціў Быкава.

**Возера Шо было названа**

цэнтрам Эўропы ў аддзеле картаграфіі Камітэту па зямельных рэсурсах, геадэзіі й картаграфіі пры Саўміне. У падліках выкарыстоўвалася кампутарная праграма, адмыслова распрацаваная на прадпрыемстве «Белкосма–аэрагеадэзія». Эўропу прынялі за адно цэлае, уключна зь Белым і Балтыйскім морам, Брытанскімі выспамі. Усю прастору накрылі інтэгральнай сеткай і вылічылі цэнтральную кропку.

# Школа моўнай карэктнасьці

Дыскусія вакол «Нямецкай хвалі» пайшла на карысьць. Піша **Алесь Кудрыцкі.**

Пасажыры тралейбусаў, якія праносіліся па вуліцы Багдановіча, некалькі дзён запар мелі магчымасьць назіраць за купкай людзей, якая стаяла ўздоўж ходніку, трымаючы ў руках плякаты «Russische DW über alles?» ды «Няма мовы — няма народу!». «Дыскусія» — так назвалі арганізатары сэрыю пікетаў, што прайшлі ад 23 па 25 жніўня на плошчы Бангалор. У апошні дзень акцыі ўдзельнікаў і актыўных гледачоў пікету можна было пералічыць па пальцах, аднак дыскусія ад гэтага не рабілася менш гарачай.

Удзельнікі пікету яшчэ не пасьпелі разгарнуць лёзунгі, як палітоляг Уладзімер Мацкевіч распачаў эмацыйны дыспут з каардынатарам акцыі журналістам Вадзімам Александровічам. У вастрыні моўнага пытаньня экс-вядучы токшоў «Выбар» мог пераканацца яшчэ на прыкладзе сваёй перадачы, прысьвечанай гэтай праблеме. Па словах Мацкевіча, той выпуск «Выбару» меў рэкордны глядацкі рэйтынг, які не пабіты і дагэтуль. Але гэтым разам Мацкевіч выступаў не як мэдыятар, а як крытык крытыкаў. На думку палітоляга, жорсткая рэакцыя на ініцыятыву «Нямецкай хвалі» была нясвоечасовай.

«Я разумею тых дзеячаў культуры, якія далучыліся да выказваньняў пра сытуацыю зь «Нямецкай хваляй», але я цалкам не разумею тых палітыкаў, якія зрабілі тое самае. Ператвараць гэта ў палітычную сварку могуць толькі людзі, якія цалкам не разумеюць сытуацыі ці шкодзяць дэмакратыі ў Беларусі». Уладзімер Мацкевіч лічыць, што нямецкія экспэрты зрабілі цалкам лягічны маркетынгавы праект. «Беларускамоўныя — найбольш сьвядомая частка грамадзтва, яны супраць Лукашэнкі, а перадача «Нямецкай хвалі» — супраць дыктатуры, таму яна цалкам рацыянальна пабудаваная на расейскай мове».

Падобнай думкі прытрымліваецца і Сяргей Калякін, які таксама завітаў на плошчу Бангалор. «Сёньня ёсьць пытаньне беларускай мовы, пытаньне прыгняценьня яе з боку расейскай мовы, няма дзяржаўнай палітыкі па падтрымцы і разьвіцьці беларускай мовы, але гэта не датычыцца тых мэтаў, якія мы ставім перад сабой па распаўсюджваньні альтэрнатыўнай інфармацыі. Нельга блытаць два пытаньні. Інфармацыя павінна паступаць на той мове, якая можа быць найлепш успрынятая грамадзтвам. А што да нібыта магчымага расколу ў апазыцыі па «моўным пытаньні» — дэмакратычная апазыцыя на тое і дэмакратычная, што мае розныя погляды».

Нягледзячы на крытыкаў, арганізатары акцыі выпускнік Унівэрсытэту культуры Зьміцер Касьпяровіч ды журналіст Вадзім Александровіч лічаць, што пікеты мелі посьпех: «Нам удалося прыцягнуць увагу многіх людзей да праблемы. Калі да гэтага часу абмеркаваньне не выходзіла за межы сайту «Наше мнение» і старонак «НН», дык цяпер пра гэта даведаліся нават чытачы «Белорусской газеты» і «Комсомольской правды». Любая дыскусія нараджае зрухі ў грамадзтве».

Нязграбны мэдыйны крок Эўракамісіі ды «Нямецкай хвалі» спараджае патрэбу разабрацца ў тым, што Захад мог бы зрабіць для Беларусі, але дагэтуль не зрабіў. «Галоўнае, што яны былі павінны зрабіць — дамовіцца паміж сабой і займець адзіную пазыцыю адносна Беларусі, — лічыць Уладзімер Мацкевіч. — На жаль, яны ня могуць гэта зрабіць, бо маюць адрозныя падыходы да дэмакратыі і да суседзяў, якія гэтых дэмакратыяў ня маюць. Да эўрапейскай бюракратыі будзе яшчэ год даходзіць тое, што адбываецца. На падтрымку дзеяньнямі, а ня словамі, спадзявацца не даводзіцца».

Сяргей Калякін таксама ня дужа задаволены дзеяньнямі Захаду: «Яны ж па вялікім рахунку нічога і не зрабілі. Ёсьць заявы, ёсьць прапановы, ёсьць дэкларацыі, гэта ўсё, што мы на сёньня маем».

Адзін з найбольш верагодных кандыдатаў у прэзыдэнты — Алесь Мілінкевіч — мяркуе, што найбольшыя праблемы з падтрымкай існуюць менавіта з боку Эўразьвязу. «Яны шмат разоў выказваліся пра патрэбу падтрымкі, але ўжо каля году ня могуць прыдумаць «схему дапамогі».

Апошні пікет, адрасаваны «Нямецкай хвалі», быў сьвятам карэктнасьці — і У.Мацкевіч, і С.Калякін прамаўлялі па-беларуску, а пікетоўцы ўсяляк падкрэсьлівалі тое, што выступаюць ня супраць расейскай, а за беларускую мову. Увогуле, вынік ад дыскусіі можна лічыць станоўчым. Палітыкі яшчэ раз пераканаліся, што, як ні круці, а моўнае пытаньне — адно з галоўных. Жорсткая рэакцыя была неспадзяванкай і для эўрапейцаў. Таму наступным разам, калі будзе высьпяваць сапраўды карысны мэдыйны праект, а не мікраскапічная радыёпраграма, яго арганізатары лішні раз пачухаюць сабе галаву.

## Зінаіда Бандарэнка: «Мы ўсё-такі даб'ёмся справядлівасьці»

Народная артыстка Беларусі патэлефанавала ў рэдакцыю, каб далучыць свой голас да патрабаваньня беларусізаваць «Нямецкую хвалю».

**Я далучаю свой голас да патрабаваньня да «Нямецкай хвалі» наладзіць вяшчаньне па-беларуску. Я вельмі рада, што столькі людзей уключылася ў барацьбу за беларускую мову. Гэта дае падставу верыць, што ня ўсё яшчэ згублена ў нашым грамадзтве, што мы ўсё-такі можам у поўны голас гаварыць у падтрымку беларускай мовы, у падтрымку дэмакратыі. Кажуць, што няма фінансавых сродкаў і як быццам бы бракуе прафэсіяналаў, але ў нас у Беларусі ёсьць людзі, якія маглі б дапамагчы наладзіць беларускамоўнае вяшчаньне. Тое, што «Нямецкая хваля» будзе так працаваць, выклікае абурэньне. Я не разумею, чаму так да нас ставяцца. Калі мы будзем як мага больш свой голас уздымаць, гаварыць, пратэставаць, я думаю, мы ўсё-такі даб'ёмся справядлівасьці, навучымся салідарна адваёўваць свае правы.**

**Запісаў АК**

## «Рэакцыя беларусаў была нечаканая для Эўракамісіі»

Прадстаўнікі Беларуска-эўрапейскага задзіночаньня (Бэльгія) і Зьвязу беларусаў замежжа (Чэхія) сустрэліся ў Брусэлі з супрацоўніцай аддзелу ў справах Беларусі, Украіны й Малдовы Дэпартамэнту вонкавых дачыненьняў Эўракамісіі спн. Аннэ Койстынэн. У Эўракамісію былі перададзеныя звароты Рады БНР, Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі й Беларуска-Эўрапейскага Задзіночаньня супраць рашэньня «Нямецкай хвалі» зарганізаваць вяшчаньне на Беларусь па-расейску. Таксама была перададзеная заява Рады БНР у праблеме польскае меншасьці у Беларусі. Беларусы закцэнтавалі ўвагу на недаацэнцы эўраструктурамі беларускае мовы як складніку беларускае дэмакратычнае спадчыны. Спн. Койстынэн адзначыла, што рэакцыя беларусаў на рашэньне «Нямецкай хвалі» вяшчаць парасейску была нечаканай для Эўракамісіі, але пагадненьне пра дапамогу нямецкай радыёстанцыі падпісанае, таму ўжо цяжка ўнесьці зьмены.

На працягу дзеяньня дамовы з «Deutsche Welle» Эўракамісія дапускае магчымасьць падрыхтаваць новыя праекты, якія будуць разглядацца з улікам пажаданьняў беларускіх палітычных і грамадзкіх арганізацыяў стварыць беларускія службы «Нямецкае Хвалі» ці іншых электронных мэдыяў. З боку нашых арганізацыяў было прапанавана стварыць беларускамоўныя службы замежных радыёстанцыяў з выкарыстаньнем патэнцыялу беларускіх журналістаў, якія маюць досьвед працы ў незалежных сродках масавай інфармацыі.

**Ігар Лазарчук, Антвэрпэн**

## АБВЕСТКІ

### Беларускі калегіюм

**Прапануе дадатковае навучаньне па спэцыялізацыях:**

— журналістыка;
— найноўшая гісторыя;
— філязофія / літаратура.

Запрашаюцца студэнты старшых курсаў альбо асобы з вышэйшай адукацыяй. У асобных выпадках прымаюцца й студэнты малодшых курсаў. Навучэнцам БК можа быць толькі той, хто пастаянна альбо на час навучаньня пражывае ў Менску.

Навучальныя праграмы БК арыентаваныя на выкладаньне найноўшых фрагмэнтаў сучаснай веды і не дублююць існуючыя праграмы дзяржаўных і недзяржаўных унівэрсытэтаў. Сэртыфікат Калегіюму не замяняе дыплём аб вышэйшай адукацыі. Навучаньне ў БК — бясплатнае.

Пачатак заняткаў з 3 кастрычніка.

Запіс на сумоў'е — да 27 верасьня. Абавязковай умовай запрашэньня на сумоў'е зьяўляецца падача да пазначанай вышэй даты аднаго альбо некалькіх уласных тэкстаў памерам ня меней 5000 знакаў. Тэкстамі лічацца як друкаваныя, так і недрукаваныя матэрыялы (журналісцкія, паэтычныя ці празаічныя тэксты, тэксты дасьледніцкага, рэфэратыўнага ці іншага характару, эсэ на вольна абраную тэму і г.д.). Фармуляваная ўмова ня тычыцца спэцыялізацыі «Найноўшая гісторыя».

Даведкі і запіс па тэл. 264-66-27 з 14.00 да 18.00 штодня, акрамя суботы і нядзелі. Дадатковую інфармацыю пра БК можна знайсьці на сайце: www.bk.baj.ru.

### Узнагароды імя Зоры Кіпель за лепшую кнігу ці артыкул пра Беларусь

Паўночнаамэрыканская асацыяцыя беларусаведных штудыяў разам зь сям'ёй в.п. Зоры Кіпель з задавальненьнем паведамляюць пра заснаваньне дзьвюх грашовых прэмій: $500 за лепшую кнігу й $200 за лепшы артыкул на беларусаведную тэму. Прымаюцца да разгляду публікацыі 2002—2005 г. на беларускай ці ангельскай мовах. Тэматычна публікацыі могуць ахапляць літаратуру, мовазнаўства, гісторыю й палітыку. Друкі, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, будуць разглядацца спэцыяльнай камісіяй Асацыяцыі беларусаведных штудыяў. Удзельнікі конкурсу мусяць прыслаць свае працы да 1 студзеня 2006 г. на адрас:

Dr. Curt Woolhiser
Harvard University
Department of Slavic Languages and Literatures
Barker Center 327, 12 Quincy St.
Cambridge, MA 02138-3804, USA

Пераможцы будуць абвешчаныя летам 2006 г.

## ЦЫТАТА

### Мова ня мусіць быць крыніцай рознагалосьсяў

Лінгвістычная палярызацыя інтэлектуалаў, навязаная палітыкамі на пачатку 1990-х, прывяла да таго, што цягам апошняга дзесяцігодзьдзя расейска- і беларускамоўныя інтэлектуалы суіснавалі нібы ў паралельных сусьветах. Расейскамоўная пасіўна падтрымлівалі ўладу (за падараваны прывілей прамаўляць на роднай мове) — пакуль не ачомаліся, убачыўшы, што ўсіх астатніх магчымасьцяў і правоў, за выняткам таго самага прывілею, акадэмічны асяродак ужо пазбаўлены. Беларускамоўныя сышлі ў апазыцыю — як палітычную, гэтак і эстэтычную. Што да пэўнага моманту было прадуктыўным (калі казаць пра «вынаходніцтва традыцыі», гэта значыць пра стварэньне сучаснай нацыянальнай — несавецкай і празаходняй — культуры). Неабходна прызнаць, што менавіта беларускамоўныя інтэлектуалы (праз часопісы «Фрагмэнты», «Архэ» і інш.) спрабавалі ажыцьцяўляць функцыю крытычнага мысьленьня ўсімі даступнымі сродкамі.

У любым выпадку, мова ня можа й не павінна быць сёньня крыніцай рознагалосьсяў, тым больш што існуюць супольныя, больш істотныя задачы, што патрабуюць кансалідацыі высілкаў. Можа быць, рух беларуска- і расейскамоўных інтэлектуалаў насустрач адзін аднаму, што нядаўна накрэсьліўся, ёсьць прыкметай палітычнай сытуацыі, якая зьмянілася, і якую мы самі, а тым больш улада, пакуль што не ўсьведамляем напоўніцу.

**Альміра Ўсманава, філёзаф, выкладчыца ЭГУ, «Топас», №1/2005.**

## Дыскусія аб «Нямецкай хвалі» на форуме www.nn.by

**Zuker**

Дзіўныя рэчы адбываюцца. Тэндэр «Нямецкая хваля» выйграла як самы фінансава моцны праект, а грошы на дадатковую мову знайсьці ня могуць. Вось бабуля Эўропа і дапамагла. А што, ёсьць паўнавартаснае радыё «Свабода». Але чамусьці на нармалёвыя рэтрансьлятары для РС дзе-небудзь у Беластоку грошай (мазгоў?, сумленьня?) не хапіла. Затое хапіла на 30 хвілінаў сурагату. Нешта там «часткова» на інтэрнэт-сайце выкінуць па-беларуску. А самае вясёлае — гэта матывацыя нямецкіх «паноў»: маўляў, палова ж перадачкі прысьвечаная «сусьветным праблемам», дык карысна будзе гэты матэрыяльчык паслухаць і нашым суседзям — украінцам і малдаванам. А яны ж па-беларуску не разумеюць! Такім чынам «беларуская» рэдакцыя «хвалі» будзе выконваць такую сабе касмапалітычную місію! Па-расейску. Напэўна, пра існаваньне ўкраінскай службы яны забыліся. Пра «сацыялягічную» матывацыю я ўжо проста змаўчу.

**Андрэй Ляўко**

Я падтрымліваю рашэньне нямецкіх «бюракратаў» арганізаваць вяшчаньне «Нямецкай хвалі» на расейскай мове.

Ладзячы радыёвяшчаньне на тэрыторыю нашай рэспублікі, немцы перасьледуюць больш маштабныя і больш далекасяжныя мэты, чым разьвіцьцё беларускай культуры і мовы ў прыватнасьці.

Я лічу, што істотна данесьці да значнай колькасьці людзей ідэі, якія будуць ім блізкія й цікавыя. Дзеля гэтага важна размаўляць на мове, зразумелай людзям.

Не выклікае сумневу і тое, што патрэбна культываваць і прапагандаваць беларускую мову як падмурак нацыянальнай культуры. Аднак, на маю думку, гэта можна і варта рабіць, выкарыстоўваючы ўнутраныя рэсурсы нашых грамадзян (нацыянальнага бізнэсу, асабістыя рэсурсы людзей), не адмаўляючыся ад вонкавых рэсурсаў. Пачынаць трэба зь невялікіх пасьлядоўных крокаў на месцах, а не зь вяшчаньня радыёстанцый на ўсю краіну.

Што да шуму беларускамоўных лідэраў грамадзкай думкі, я лічу, за крыкамі пра зьнішчэньне беларускай мовы яны імкнуцца схаваць і апраўдаць уласную няспраўджанасьць. Так можна любую сваю некампэтэнтнасьць, нягнуткасьць, карысталюбства бясконца доўга апраўдваць складанай сытуацыяй.

Больш правільна будзе вучыцца працаваць у складанай сытуацыі, рыхтавацца да горшага, улічваць чужы досьвед і навуковыя тэорыі, але не патрабаваць ад людзей, што ўзурпавалі ўладу ў краіне, стварэньня нармалёвых умоваў для палітычнай барацьбы.

**Чытачка**

Сп.Ляўко, во і Лукашэнка надта любіць заклікаць да таго самага: «разумець і ўлічваць інтарэсы й думкі простых людзей з глыбінкі». Падобны папулізм заўсёды выкарыстоўваецца, калі думка народу патрэбная для рэйтынгаў і дэмагогіі. Што да «культываваньня беларускай мовы на месцах», дык пераплешчыцеся. Беларуская мова будзе культывавацца паўсюль, а ня там, дзе вы ёй у хлеўчуку посьцілачку пакладзеце.

**czyk**

Калі б і пісаць што пра DW, дык у рэчышчы «размах на рубель, удар на капейку». Трэба выводзіць людзей з тафталягічнай рыторыкі мова-мала-здрада-гады. Ген «вечнага плачу» можа дорага каштаваць беларусам.

**чупс чыку**

Тут справа прынцыповая. 1) Расейская мова гэтага радыё — гэта як знак, што нас сымбалічна аддаюць у «расейскую Эўропу». Таму тут любыя формы пратэсту апраўданыя. 2) Само стварэньне 30 хвілінаў на кароткіх хвалях для Беларусі пасьля чатырох гадоў дыскусій — гэта таксама адчэпнае. Фактычна, нас пакідаюць тым самым адзін на адзін з Лукашэнкам і Расеяй. І тут таксама трэба ўзьнімаць голас, нагадваць пра сябе. Пратэст супраць «Нямецкай хвалі» — нармальная рэакцыя здаровага грамадзтва на справу, якая яго кранае, на абарону вартасьцяў. Гэта заўжды варта. Такімі акцыямі і творыцца грамадзтва.

**czyk**

Мне здаецца, вакол тэмы DW істотна зьмясьціліся акцэнты. Мы чакалі не такога радыё, ня ў тым дыяпазоне, і ці радыё мы чакалі наагул? Ад гэтага радыё эфэкту ня будзе ніякага, дык навошта пра яго наагул згадваць і траціць высілкі на нейкія там акцыі — заманулася расейскай службе DW зладзіць паўгадзінную праграму за кошт EU — ну й чорт з той DW і тым EU. Ёсьць праграма з назовам нешта кшталту «Беларускі дзёньнік» на «Голасе Амэрыкі», ну і колькі народу яе слухае ці хаця б ведае што пра яе існаваньне, апроч тых, каго запрасілі ў этэр? Ну і хай у ручкі ў ножкі і гэтай DW. А то апазыцыя на вушах, а хто і на нажах. Пагроза беларушчыне ў «НН» і дэмакратыі ў «БГ». Аёечкі ж мае. І сьмешна і млосна. Здарова, таварышы, доўга чакалі. Трэба выбірацца з шызоіднага стану, трэба спрабаваць глядзець наўкола цьвярозымі вачыма, узважваць, чым ёсьць тая ж DW, што яна зробіць для Беларусі. І ня трэба кленчыць і прыніжацца, ня трэба прасіць у дзядзі сваёй мовы. Дзядзя мае іншыя пляны, то бок ён працуе не для цябе. Ён цябе ігнаруе. Дык начорта скакаць вакол яго з працягнутай рукой?

Беларусам не стае беларускай гравітацыі, каб цьвёрда стаяць на нагах. Гэта ці не найважнейшае — знайсьці яе, хай праз высілак, нават калі беларушчына прыдбаная, а не прыроджаная. Толькі цьвёрда стоячы, можна ўпэўнена глядзець не пад ногі, а на кругагляд, праз трывалую сыстэму каардынат. Спакойна і ўпэўнена. І тады DW ня будзе інфармацыйнай нагодай, Лукашэнка ня будзе краем гісторыі і далакопам беларушчыны, а беларускамоўнасьць ня будзе дзівацтвам ці геройскім учынкам.

**czyk**

Пакуль мы б'ём гузакі з-за паўгадзіннай перадачы, якую ніхто ня будзе слухаць, на якой мове яна б ні была, «Эўраньюс» загаворыць украінскаю. Плянуецца закупіць 1% акцый «Эўраньюс», дзякуючы чаму пры канцы году кожны жыхар Украіны зможа глядзець сусьветныя навіны ва ўкраінскай вэрсіі. Пра гэта 23 чэрвеня падчас прэс-канфэрэнцыі паведаміў прэзыдэнт Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Ўкраіны Тарас Стэцькіў».

# Лісты чытачоў «НН» на тэму «Нямецкай хвалі»

### Гарантыя дзяржаўнай стабільнасьці

Прачытаўшы матэрыялы моўнай дыскусіі, якая разгарэлася на сайце «Наша думка», я сумеўся. Не чакаў, што праблема — хутчэй, трагедыя — беларускай мовы можа выклікаць у расейскамоўнай эліты такія развагі й пасажы. Згадалася мэмарыяльная дошка Якубу Коласу, што замацавана на прыватным доме на вуліцы ягонага імя ў Полацку. Шыльда паведамляе: «Улица названа в честь Якуба Коласа — народного поэта Белорусской ССР, одного из основоположников новой белорусской литературы». А вуліца тая — хутчэй, маленечкі завулачак у раёне прыватнай забудовы Запалоцьце, з тупікамі з абодвух бакоў. Маўляў, якія могуць быць прэтэнзіі — мы шануем вашага клясыка, вось і вуліцу назвалі яго імем, і нават шыльду адпаведную прыкруцілі. Толькі ад такога шанаваньня моташна робіцца.

Неяк гасьцяваў у мяне былы няўдалы палітык, які таксама апантана даводзіў, што беларусізацыя ў Беларусі прывядзе да трагедыі, бо людзі, і прыклад у яго ёсьць — моладзь у краінах Балтыі, адарвуцца ад расейскай мовы, а айчынная навука з тае прычыны наагул загіне. Аднак ці можна ўявіць такое, каб беларус не зразумеў расейскай мовы? Каб, знаходзячыся ў мэдыйнай прасторы Расеі, страціў веданьне вялікай і магутнай? І ніхто ж не патрабуе гвалтоўнай беларусізацыі.

Беларуская мова мусіць быць проста дзяржаўнай, як тое зафіксавана ў Канстытуцыі. Мовай улады і нацыянальнай культуры. І гэта абсалютна не датычыць выбару мовы для прыватнага карыстаньня. Але калі чалавек зьбіраецца ў палітыку, веданьне мовы краіны мусіць быць бездакорным. Гэтаксама і СМІ ў краіне (тыя, што фінансуюцца зь дзяржбюджэту) мусяць быць беларускамоўнымі. Перш за ўсё тэлебачаньне. Прыватную ж газэту выдавайце хоць на мове эвэнкаў.

Таму большасьць беларускіх палітыкаў, дзеячаў культуры і навукі абсалютна адэкватна прарэагавала на навіну пра тое, што «Нямецкая хваля» зьбіраецца рабіць беларускі блёк па-расейску. Нечакана адбылася кансалідацыя людзей з розных палітычных лягераў і сотні іншых вядомых у краіне людзей. Яны выступілі ў абарону прынцыпаў будучай беларускай дзяржаўнасьці. Пратэст прагучаў наступным чынам: калі гэта такая дапамога, дык нам яе ня трэба. Гэта апанэнты з «Нашай думкі» папрыдумлялі русафобію.

Сёньня ўжо відавочна, што краіна Беларусь можа адбыцца толькі зь вяртаньнем у паўнацэнны ўжытак беларускай мовы, як Літва — зь літоўскай, а Ўкраіна — з украінскай. Інакш наш дзяржаўны карабель бясконца будзе «штарміць» на хвалях «саюзнай інтэграцыі» і «пачуцьця меншых братоў». Беларуская мова — гэта ня толькі культурны скарб (спадчына), але і гарантыя дзяржаўнай стабільнасьці, самакаштоўнасьці і годнасьці. Інакш у найлепшым выпадку застанёмся з расейскамоўнымі бутафорскімі шыльдамі на завулках з тупікамі.

**Алесь Аркуш, Полацак**

### Разьвялі на грошы

Толькі прачытаўшы заяву нямецкай амбасады, робіцца зразумела, што «Нямецкая хваля» **спэцыяльнага** вяшчаньня для Беларусі рабіць увогуле не зьбіраецца і не зьбіралася.

Журналісты ня будуць **ствараць** тэкстаў перадач для Беларусі. Здаецца, гэтага ня толькі я, а і большасьць нашых людзей ня ведаюць.

Гэта ж, аказваецца, будзе паўтор перадач (расейскіх і зробленых для Расеі) расейскай рэдакцыі «Нямецкай хвалі», якія яны палічаць (ці не палічаць) цікавымі і для беларускага слухача. Расейская рэдакцыя такім чынам проста дадатковыя грошы сабе выдурыла ў Эўразьвязу. Павелічэньня працазатрат у супрацоўнікаў радыёстанцыі, за што звычайна грошы плацяць, тут ніякіх няма.

Тое самае, калі расейская газэта публікуе артыкул пра падзеі ў Беларусі ці адносіны зь ёй, разьлічаны на расейскага чытача, а беларусы ім таксама зацікавяцца — што там сусед пра нас думае? — і пачынаюць купляць газэту, чытаць артыкул ці нават передрукуюць яго ў свае газэты. Толькі расейскія газэты не даўмеліся пакуль грошай у Эўразьвязу за артыкулы пра Беларусь прасіць.

Напэўна, для простага павелічэньня этэрнага часу на Расею шляхам дадатковага паўтору перадачы Эўразьвяз бы грошай ня даў, дык яны дапялі «паклапаціцца аб дэмакратыі ў Беларусі». Ну хто толькі не карыстаецца з лукашэнкаўскага рэжыму… Як, напрыклад, часам расейскія эмігранты, каб атрымаць за мяжой дазвол на жыхарства, называюць сябе беларусамі, што зьбеглі ад перасьледу.

Перадачы расейскай рэдакцыі «Нямецкай хвалі» ў Беларусі і так добра чуваць, і той, хто ў Беларусі іх слухае, сам у стане вызначыць, што яму цікава, а што не. Рэдакцыйнае сіта тут не патрэбна.

Няўжо Эўракамісія не разумее, што іх проста «разьвялі на грошы»?

**Таіса Мішчанка, Масква**

### Прыярытэт беларускаму

Далучаю свой подпіс да заклiку аб байкоце «Нямецкай хвалі», аб зьмяненьні яе моўнай палітыкі. Аднак адначасова хачу зрабіць некалькі заўваг да артыкулу сп.Сіліцкага «Дзе выгадуеце новых Быкавых» («НН» №31). Але чаму мы ня можам абысьціся без расейскае мовы? Прыбалты могуць абысьціся, украінцы, грузіны, а мы ня можам. Параўнаньне моўнай сытуацыі Ўкраіны і Беларусі (хоць і ў Інтэрнэце) — увядзеньне ў зман чытача: ва Ўкраіне ўсе дзяржаўныя асобы — ад прэзыдэнта да простага чыноўніка — размаўляюць па-ўкраінску.

Расейскамоўнаму нацыяналізму беларуская мова не патрэбна, як не патрэбны і беларускамоўныя пісьменьнікі. Наагул «расейскамоўны беларускі нацыяналізм» — паняцьце штучнае, кабінэтнае, і ніякі ён ня наш паратунак. Нельга адной рукой пісаць за расейскую мову, а другой за беларускую, трэба быць на нейкім адным баку, а не пасярэдзіне. А калі выступаць і за нашых, і за вашых, то нічога з гэтага не атрымаецца. Калі хочаце, каб у краіне была адна дзяржаўная мова (беларуская), каб была адукацыя на дзяржаўнай мове на ўсіх узроўнях. Будзе адукацыя — будзе будучыня.

**В.Шаўроў, Горадня**

### От, гэтыя немцы

Нямеччына і немцы вачыма беларуса — цікавая тэма, вартая газэтных артыкулаў і цікавых аповедаў. Асабліва цяпер, калі не сьціхае абурэньне нязграбнасьцю і недальнабачнасьцю «Нямецкае хвалі» зь яе ігнараваньнем беларускае мовы. Нямеччына — загадка, якую можна адначасова любіць і ненавідзець, але немагчыма дарэшты спасьцігнуць. Таму варта проста дзяліцца асабістымі ўражаньнямі.

Немцы заўсёды ведаюць усё лепей за ўсіх. Дзе якая краіна, дзе хто як размаўляе, хто да каго належыць. У іх усё расстаўлена па палічках. А калі яны нечага і ня ведаюць, пытаюцца ў таго, хто ведае ўсё. Пытаньне мовы ў Беларусі заблытанае і для саміх беларусаў. А ў немцаў зь іхняй прагай да пэўнасьці і адназначнасьці яно выклікае алергію. Вось яны, відаць, і вырашылі спытацца, што рабіць, у «адказнага» за рэгіён — у Масквы. Тая параіла.

Наагул немцы любяць Маскву і Расею. Гэтая любоў глыбокая і мае прыметы захапленьня ўласнай процілегласьцю. Там, на ўсходзе, ёсьць нешта такое вялікае, нелягічнае і магутнае! А тут мы, немцы. А тое, што знаходзіцца паміж намі і гэтым магутным, неяк траціць сваю значнасьць. А яшчэ была грандыёзная ганьба, пра якую немцы ня вельмі жадаюць размаўляць. Яны проста любяць Расею за тое, што яна выйграла ў іх вайну!

Немцу цяжка давесьці, што ты беларус. Для іх гэтага панятку проста не існуе. Усё, што на ўсход ад Польшчы, — гэта Расея, прычым прыкладна за Менскам пачынаецца Сібір зь мядзьведзямі. Для іх Расея — гэта звышпаняцьце, якое ўключае ў сябе шмат кавалкаў, але ж гэтыя кавалкі ня вартыя таго, каб разглядаць іх асобна. Дый клопатна гэта. Трэба ж тады завучваць новыя нязручныя для нямецкай назвы краін, моваў… Таму, хоць ты і кажаш, што ты — беларус, ты для іх — усё роўна Russisch. Гэтая схема настолькі глыбока і непахісна сядзіць у нямецкай сьвядомасьці, што немцы не цураюцца апантаных спрэчак і нават пагаршэньня асабістых адносін, каб толькі давесьці, што для іх гэта ўсё роўна Расея. Нельга сказаць, што яны зусім ня здольныя да навучаньня. Прыкладна праз год гарачых дыскусій, тлумачэньняў і вывучэньня геаграфічнае мапы яны паступова пачынаюць разумець шматаблічнасьць Усходняе Эўропы і прымаюць, што ты — не расеец. Але ж гэта для іх — найглыбейшае расчараваньне. Таму што расейцаў у іх вачах ёсьць за што паважаць (ды хаця б за мінулую вайну). А паляка, чэха ці, яшчэ горш, якога беларуса паважаць, канечне, няма за што. Тут табе ні экзотыкі, ні велічы, ні вайсковае славы, ні ядзернае зброі, ні Пуціна. Таму, калі немец нарэшце ўцяміць, што ты як бы не зусім расеец (або расеец другога гатунку), інтарэс да тваe асобы і паходжаньня рэзка падае.

Зрэшты, гэтая нязграбнасьць немцаў у нацыянальных пытаньнях тычыцца ня толькі Ўсходняе Эўропы. Для немцаў, напрыклад, Шатляндыя — гэта таксама Англія, бо там размаўляюць па-ангельску! (Пазнаяце аналёгію?) А Аўстрыя — увогуле гістарычная недарэчнасьць і найлепшы аб'ект кпінаў ды анэкдотаў. Прыгадваецца такі. Нямецка-аўстрыйская мяжа. На нямецкім баку баварскі памежнік кліча свайго аўстрыйскага калегу і кажа яму:

— Ведаеш, хто самы дурны ў сьвеце?

— Не, — адказвае аўстрыяк.

— Ты і твой брат! — баварац корчыцца ад сьмеху.

Аўстрыяк засмучаецца і пачынае румзаць. Але баварац яго суцішае:

— Ня плач, сходзі да швайцарскае мяжы і раскажы тое самае швайцарцу!

Аўстрыяк так і робіць. Ідзе да швайцарскае мяжы, кліча памежніка і пытаецца:

— Ведаеш, хто самы дурны ў сьвеце?

— Не, — адказвае швайцарац.

— Я і мой брат!

**Сяржук Вінаградаў, Лёндан**

### Туарэгі сябе пакажуць

Аўтар артыкулу пра бэрбэраў («НН» №32) праігнараваў самае істотнае з гісторыі і культуры гэтай групы народаў. Найбольшую цікавасьць у этнографаў выклікаюць звычаі туарэгаў, асабліва касты воінаў — гэта спаборніцтвы кшталту турніраў, а таксама культ прыгожай дамы, каханьня якой дабіваліся, ня толькі дэманструючы вайсковае майстэрства, але й сьпяваючы песьні на ўласныя словы. Дарэчы, усё гэта цераз арабаў трапіла ў раньнесярэднявечную Эўропу.

Сп.Шатэрнік таксама піша, што нічога не было чуваць пра спробы палітычнага ці культурнага адраджэньня туарэгаў. Насамрэч адраджэньне даўно перарасло ва ўзброеную барацьбу. На поўначы Малі ў 1989—1994 г. вайну за незалежнасьць вёў Туарэгаўскі фронт вызваленьня (AZAWAD). Тады загінула каля дзьвюх тысяч чалавек. У Нігеры супраць ураду з 1990 г. ваявалі дзьве групоўкі. Арганізацыя «Рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы туарэгаў пустыні Сахара», што выступала за аўтаномію, у 1995 г. падпісала з урадам мірнае пагадненьне, больш радыкальны Дэмакратычны фронт адраджэньня падпісаў аналягічную дамову толькі цераз два гады. Але дамовы слаба выконваюцца, і час ад часу ў Нігерыі, Малі і Альжыры ўспыхваюць баі паміж туарэскімі аддзеламі і ўрадавымі войскамі. Да таго ж існуе грандыёзны праект стварэньня ў сэрцы Сахары вялізнай дзяржавы, якая б аб'яднала ўсіх туарэгаў.

**Зьміцер Віцько, tut.by**

# Ян Маўзэр



Мне не патрэбныя дадатковыя стымулятары, у мяне іншы кайф. Ужо больш за год я размаўляю па-беларуску. І сёньня мне ўтульна. Усе неаднаразова тлумачылі мне, які я дэбіл, як нацыяналізм перашкаджае ў жыцьці... Пра сябе піша **Ян Маўзэр**, пераможца «Басовішча», лідэр новае хвалі ў беларускай музыцы.

«Басовішча»! Трапіць сюды — мара кожнага беларускага музыкі. «Басовішча» элітарнае, вышэй за яго нічога няма. Яшчэ да нашага выступу здымачная група НТВ бярэ кароценькае інтэрвію ў Зоі са «Зьмяя». Наш сэмплер жартуе, што гэта інтэрвію зь пераможцай. Мы думалі, што пераможа «Зьмяя». Вельмі ўжо хадзіла яна зорная, недатыкальная, нават начавала не ў калектыўнай спортзалі. Калі аказалася, што перамог гурт з Магілёўшчыны, пачалося штосьці казачнае. Нас запрашаюць на сцэну, перад якой некалькі тысяч чалавек, пацiскаюць далоні сур'ёзныя людзі, пасьля фатаграфаваньні для польскіх мэдыяў, інтэрвію з намі бяруць шэраг газэтаў ды радыёстанцыяў. Уражаньне, што гэта ня з мной, што гэта сон. Адразу я й не зразумеў, што мы такога зрабілі, каб прыцягнуць да сябе столькі ўвагі.

**Гурт «Таварыш Маўзэр»**

утварыўся ў Магілёве ў 2002 годзе, упершыню выступіў у 2003-м. У 2005 годзе «Таварыш Маўзэр» перамог на «Басовішчы», і на зімовых вакацыях паедзе ў Беласток запісваць дэбютны альбом. Узрост удзельнікаў гурту — ад 17 да 22 гадоў. Найстарэйшы — лідэр, Янка Маўзэр. Апроч «Таварыша Маўзэра» ў Магілёве ёсьць яшчэ два беларускамоўныя гурты — «Глюкі» і «Водар Сусьвету».

### Праз усю Беларусь

Да Асіповічаў з Магілёва едзем дызэлем. Колькі гадзін — у бары, да Менску дабіраемся электрычкай. У сталіцы галоўнае — не пагубляць музыкаў, якія пасварыліся й разышліся ў розныя бакі. На Акадэміі навук, дзе трэба было грузіцца па аўтобусах, уздыхнулі з палёгкай. Далей стала прасьцей.

Дарога да Польшчы — асобны эпізод. Энэрджайзэр, які зьелі некаторыя музыкі, ня даў заплюшчыць вачэй усім астатнім удзельнікам вандроўкі. Блізу Баранавічаў маладая музычная эліта Беларусі ўжо шчыльна наблізілася да народу. Самі сабой пачалі ўзьнікаць паралелі паміж аўтобусам на «Басовішча» й звычайным піўнікам на раёне, дзе «простыя пацаны» ўжараюцца гарэлкай ці танным вінам. Не. Кожнаму сваё, мне не патрэбныя дадатковыя стымулятары, у мяне іншы кайф. І не прапаноўвайце мне «забухаць». Праз усё гэта ў Гарадку, калі нас прывезьлі й разьмясьцілі ў спортзалі школы, ад стомленасьці упаў спаць проста на падлозе.

### У атмасфэры свабоды

У піку сёньняшняй антыпольскай гістэрыі хацелася б адзначыць гасьцiннасьць і ветлівасьць насельніцтва Гарадка — як палякаў, так і беларусаў. У горадзе тамсям усталяваны намёты — беларускія аматары року ўжо больш за суткі кісьлі ў чаканьні культавага фэстывалю.

Гук, сьвятло, сцэна — прэтэнзій няма. Выступаць у такіх умовах — асалода. Шкада, што такое немагчыма зладзіць на радзіме. Людзей было б у некалькі разоў болей. На «Басовішчы» тысяч пяць народу, пэўная частка зь якога — мясцовае насельніцтва, якое прыйшло папіць піва пад музыку.

Напружанага чаканьня выступу таксама не было. Атмасфэра свабоды, што лунала на фэстывалі, расслабляла й надавала ўпэўненасьці. Нас мусіць задавальняць ужо тое, што ўсе сядзячыя месцы заняты. Але нас мала цікавяць гэтыя акалічнасьці. Перадусім мы граем для сябе. Калі б давялося выступаць перад абсалютова пустой заляй, каўбасілі б так жа бязьлітасна. Заўважаю, што нас выйшаў паслухаць Піт Паўлаў. І ўжо пасьля першай песьні чутны апладысмэнты — зваротная сувязь усталявана. Чым далей, тым больш узрастае падтрымка. Яна ідзе адусюль: ад тых, хто сядзіць, ад гукарэжысэра, ад тых, хто запальвае разам з намі. Ад гэтага яшчэ больш заводзімся, слаба кантралюем сябе, стан блізкі да экстазу. Сьпяваньне на сцэне — як сэкс, прыкладна тыя ж адчуваньні. Мяне адключае ад рэальнасьці. Кепска памятаю, як было далей... Памятаю толькі, як пасьля выступу паціскае далонь Памідораў. Было ўдвая прыемна. «Tav. mauzer» як гардкоравы гурт зьявіўся дзякуючы гэтаму чалавеку — я палюбіў цяжкі рэп, паслухаўшы «Сьвята пакрадзенае» Памідора. Дагэтуль слухаў расейскі рок.

Напрыканцы хачу паспрачацца зь Лявонам Тарасэвічам, які лічыць, нібыта выступоўцы працягвалі музычныя традыцыі 1990-х, сьпявалі пра сіняе неба. Мабыць, мелася на ўвазе гэтая песьня, тут ужываецца слова «нябёсы».

### Амэрыканскі шпіён

Пасьля вяртаньня на радзіму мясцовыя журналісты часта задаюць пытаньне: чаму перамаглі менавіта вы? Адказваю: ад безвыходнасьці... Наступнае іх пытаньне: чаму вы сьпяваеце па-беларуску? Раней я вырашыў на тупыя пытаньні не адказваць. Але тут раблю выключэньне для расейскамоўных музыкаў, зь якімі незразумела чаму давялося ехаць у адным аўтобусе на фэстываль беларускага року.

У нейкі момант жыцьця я перастаў пісаць па-расейску. А калі справа ішла да заканчэньня ВНУ, зьявілася разуменьне таго, што альбо трэба ператвараць мару ў рэальнасьць, альбо жыцьцё скончана. Атрымаўшы ўнівэрсытэцкі дыплём з адзнакай, перайшоў да напісаньня тэкстаў і музыкі. Цяпер гэта асноўны мой занятак. Але абставіны вымушаюць забіваць раніцу й першую палову дня на працы. Там, дзе мне пашчасьціла ўладкавацца, напэўна, хацелася б рабіць шмат якім выпускнікам эканамічных факультэтаў.

> Праца — дэкор майго жыцьця. На працы я пераходжу на расейскую. Там ніхто ня ведае мяне сапраўднага.

Праца — дэкор майго жыцьця. На працы я пераходжу на расейскую. Там ніхто ня ведае мяне сапраўднага. Пачуваюся амэрыканскім шпіёнам. У адным месцы, куды зьбіраўся пайсьці працаваць, мяне не ўзялі праз маю беларускамоўнасьць. Але ўжо больш за год я размаўляю па-беларуску. І сёньня мне ўтульна. Усе неаднаразова тлумачылі мне, які я дэбіл, як нацыяналізм перашкаджае ў жыцьці. Але ці можна жыць у здрадзе? Здрада — прымаецца, здраднік — караецца. Мы ўсе здраднікі. І сваім марудным паміраньнем Радзіма помсьціць за нашую слабасьць ды абыякавасьць. Мужныя працягваюць змаганьне. Я хачу, каб мае будучыя дзеці ганарыліся мной.

P.S. Усім дзякуй. Сустрэнемся на барыкадах. Ян Маўзэр.

**Шызафрэнія**

Ідэалізм — гэта ідыятызм? Ня веру! —
Тым, хто халоднымі пальцамі бярэ за каўнер,
Тым, хто ідзе выключна на крайнія меры,
Тым, хто мроіць краіну ў чырвоных шпалерах,
Тым, хто шчыры, з вусамі й хлусіць з рукою на сэрцы,
Тым, хто ў Расею гатовы паўзьці на каленях,
Тым, каго баяцца маленькія дзеці,
Тым, забіць каго нельга хіба што з-за лені.

Усё раптоўна, усё гвалтоўна. Усё цудоўна!
Я задаю шмат пытаньняў і ня чую адказу...
Зь цягам часу я раблюся ўсё больш памяркоўным.
Шызафрэнія — гэта заразна.

Бо я мрою краіну ў пялёстках нябёсаў.
Краіна ў ружовых панчохах і ракавай позе.
Звыкла хаваюць позех, усё прасякнута спакоем.
Гэта ўсё ня тое! Гэта ўсё ня тое!
Ірваць смугу гэтых дзён,
Пацiснуць плячыма й уніз,
Ня трэба шукаць унісон
З тым, што завецца фашызм.

«Поўны парадак, працэс ідзе,
Небясьпека мінула, сытуацыя пад кантролем».
Я разумею, да чаго ўсё гэта вядзе...
Хто ўзначаліць гарадзкое падпольле?!.

# Барсэлёнскія сУчасьнікі

АДАМ ГЛЁБУС

### 2005. Каталёнка і ліфт

У барсэлёнскіх музэях хораша, зацішна і халаднавата. У музэйных кавярнях вусьцішна і ўрачыста. У кавярні фундацыі Міро я люблю замовіць простую халаднаватую ваду і каву. Пасядзець. Адпачыць. Паглядзець наведнікаў… Ёсьць людзі, што і ў трохпавярховым будынку езьдзяць на ліфце, і не абавязкова гэта робяць інваліды. Вось каталёнка-ліцэістка выклікала сабе празрыста-шкляную кабіну. Прыйшоў ліфт, а ў ім пяць тоўстых ліцэістак. Тая, што выклікала ліфт, уціснулася ў кабіну, і ўсе шэсьць ліцэістак памахалі мне на разьвітаньне. Толькі ліфт паспрабаваў быў зачыніцца і ня змог — відавочны перагруз. Маладзенькія таўстухі паўсьміхаліся, пашчабяталі і выпіхнулі на пляцоўку самую тоўстую, і зусім ня тую, што выклікала ліфт. Ліцэісткі зьехалі. А таўстусе давялося калываць пешкі. Мне нават зрабілася крышку шкада пакрыўджанай каталёнскай ліцэісткі, якая пакінула мне ніякавата-сарамлівую ўсьмешку.

### 2005. Баск і выбуховае рэчыва

Баск падарваў кавярню ў Барсэлёне. Зацішную кавярню ў «Цэнтры італьянскай культуры», непадалёк ад «Paseo de Gracia», дзе стаіць дом-бутэлька, выштукаваная Гаўдзі. Калі быць паліткарэктным, трэба напісаць асуджэньне абстрактным экстрэмістам, тэрарыстам, бамбістам з групоўкі ЭТА і г.д, і да т.п. Але ж усе ведаюць, што канкрэтны баск заклаў рэальную бомбу, зробленую са звычайнай кававаркі, і выбухам цяжка параніў паліцыянта. Не тэрарыст, не экстрэміст, а баск. Чаму баск выказаўся такім чынам? Чаму не пайшоў на перамовы? Чаму трэба было выкладаць свае думкі ў форме бомбы? Можа, варта даць магчымасьць баску выказацца ў іншай форме? Даць баску свабоду слова на радыё і тэлебачаньні? Дапускаю, што ў гішпанца аргумэнтаў на перакананьне баска няма. Гішпанец апошнія гадоў пяцьсот гаварыў з баскам толькі з пазыцыі моцы і гвалту. Толькі ў Эўропе, акрамя гішпанца, ёсьць шмат іншых перамоўцаў. Хай паміж гішпанцам і баскам стане вугорац ці датчанін. Тады, спадзяюся, перамовы пойдуць без выбуховых рэчываў.

### 2005. Кітаянка і сон

Самае глупства летняга дня, муча калёр — страшэнная гарачыня. Сіеста. У Сытчазе, на плошчы Індустрыі, на белай лаўцы сьпіць маладая кітаянка. Напэўна, кітаянка сьніць Кітай і кітайскага матылька. Кітаянка надзіва сьветласкурая, яна ўся ў белым, яна ўся нібыта з парцаляны. Яна сьніць свайго белага кітайскага матылька… А можа, гэта белы кітайскі матылёк сьніць сваю кітаяначку ў далёкай-далёкай Каталёніі? Можа, і я толькі маленькі фрагмэнт у сьне вялікага кітайскага матылька? Хто скажа?

### 2005. Галяндзец і самбрэра

У барсэлёнскім аэрапорце ўбачыў знаёмага галяндзкага хлопчыка ў зялёным самбрэра. Хлопчык быў зь сям'і тых галяндцаў, што жывуць на выспах. Гэта ня тыя вялікія і мудрыя галяндцы з амстэрдамаў-ратэрдамаў, якіх апявалі на сваіх палотнах Рэмбрант з Гальсам, і не малыя галяндцы, уславленыя Вэрмэерам з Дэльфту. Гэта галяндцы Вінцэнта Ван Гога, аматары кроснаў ды бульбы. Хлопчык за тыдзень угаварыў-такі маці набыць яму шыракаполае мэксыканскае самбрэра. Як я пазайздросьціў яму зялёнай зайздрасьцю! У дзяцінстве я таксама хацеў такую выдатную шапку насіць… А тата, хоць і любіў Ван Гога, яе мне не купіў — давялося мне хадзіць пад пальмамі ў чырвонай цюбецейцы.

P.S. Вярнуўшыся з Барсэлёны, я расказаў маці пра пяшчотна-зялёнае самбрэра. «Ды што ты, сынок, было ў цябе самбрэра, жоўтае з чорным. Хіба ты забыўся?» І ўспомнілася, сапраўды ж самбрэра было!




АЛЕНА АДАМЧЫК

### 2005. Гішпанка з крыжамі

У Беларусі веры ў крыж у мяне ўдвая меней, чым у Барсэлёне. У Гатычным квартале я штогод купляю срэбныя крыжыкі. Купляю не сабе, а камусьці ў падарунак: маці, дачцэ, нявестцы… Везьці крыжыкі лёгка, і падарунак містычны. Гішпанцы спрадвеку любілі і шанавалі крыж, адпаведна, і рабіць навучыліся добра. Вось і прызвычаіўся я ў невялікіх крамках крыжыкі выбіраць. На адзінаццаты год заўважыў, што дзяўчына, у якой купляю крыжы, зусім не старэе. Маладзенькая гішпанка як была маладою, так маладою і засталася. Вось баск — гандляр барэтамі — пасівеў, зусім састарэў цыган з надзьмутымі балёнікамі і цацкамі, сагнуўся ў крук каталёнец у вінным лёху, а гішпанка з крыжамі не зьмянілася. Можна сказаць праўду, што гэта ня тая гішпанка, якая прадавала крыжы ў мінулыя разы, але мне лёгка верыцца ў вечную маладосьць гандляркі гішпанскімі крыжамі, верыцца, што і адзінаццаць, і сто адзіннаццаць гадоў таму срэбныя крыжы прадавала адна і тая ж дзяўчына.

*21.08.2005, 00:32*

### 2005. Гішпанка і жахлівасьць

Гішпанская жанчына бывае жахлівая, яшчэ трапляецца жахлівейшая за жахлівую ды пачварнейшая за самую жахлівую. Зрэдку можна ўбачыць зграбную гішпанку, але, гледзячы на яе, пачынаеш сумнявацца… Ці гішпанка яна? Можа, яна і не жанчына зусім? Мо якая вядзьмарка? Так пачынаеш разумець вялікіх гішпанскіх інквізытараў… Гэта адразу па прылёце ў Барсэлёну, а потым прывыкаеш да чужынскага аблічча гішпанак і забываесься на інквізыцыю.

*21.08.2005, 11:09*

### 2005. Гішпанка і пакіданьне

Гішпанка пакідае каля крамы мапэд, сабачку і дзіця. Яны натомлена сумуюць. У гэтай стоме, у гэткім суме ёсьць непадробная любоў да жанчыны-маці, жанчыны-карміцелькі.

*21.08.2005, 11:10*

### 2005. Гандляр гадзіньнікамі й прасьвятленьне

Цікаўнасьць — неабходны элемэнт для азарэньня. Азарэньне — найвышэйшая кропка на шляху цікаўнага. Вось я й зацікавіўся вітрынаю з антыкварнымі гадзіньнікамі. Адзін залаты гадзіньнічак каштаваў 2000 эўра. Астатнія былі таньнейшыя: 1970, 1930, 1950… Каб удакладніць цэны ды расчытаць назвы гадзіньнікаў, я нахіліўся і ўдарыўся лобам у чыстае, да нябачнасці, вітрыннае шкло. У нетрах крамы загула сыгналізацыйная сырэна, і мільгануў цень гандляра. Якраз у момант удару на мяне і сышло прасьвятленьне. Я зразумеў, што лічбы азначаюць ня цэны, а даты нараджэньня механізмаў. Пагладзіўшы пабіты лоб, я спакойна перагледзеў наноў усе гадзіньнікі. Гандляр так і ня выйшаў з крамы, напэўна, ён адчуў, што купляць старыя рэчы я не зьбіраюся.

*21.08.2005, 11:16*

### 2005. Нудыстка і дракон

Паўнацелая, з малочнай скураю і чорнасмаляным хвастом густых валасоў нудыстка легла на бок так, каб усе прысутныя на пляжы змаглі любавацца і зачароўвацца ня толькі вытатуіраваным, вялізным і шматколерным, драконам, які віўся вакол яе цела, але і цёмнымі вуснамі вылеглай похвы. Гледачы, збольшага мужчыны, зь непрытоенай цікаўнасьцю разглядалі зялёна-блакітную луску старанна зробленага малюнку, разглядалі і сакаўную похву, але пажада ў іх вачах не зіхацела. Пэўна ж, юр не зьяўляўся праз малінавы фурункул з гніласна-жоўтай галоўкаю. Фурункул важна сядзеў на незататуіраванай дупе разьняволенай нудысткі і ўшчэнт нішчыў экзатычную эратычнасьць.

*21.08.2005, 11:20*

### 2005. Каталёнка і лёд

Сівагаловая каталёнка, якой далёка за семдзесят, лякіраванымі кіпцямі драпае рэстарацыйнае паветра. Так дзярэ, ажно скрыгат чуваць. Гэтак старая каталёнка кліча маладзенькага чарнабровага афіцыянта, каб замовіць шклянку пустой вады зь лёдам.

*21.08.2005, 11:27*

### 2005. Італьянка й Бураціна

Назіраю за афіцыянткай-італьянкаю і думаю, што Бураціна мог быць старанна прыхаванай жанчынкаю, а ягонае каханьне да прыгажуні Мальвіны мела лесьбійскі каларыт. Тутака зьяўляецца афіцыянт-італіец, і мне робіцца відавочным: Бураціна — мужчынка, самец, італіец.

*21.08.2005, 11:28*

### 2005. Амэрыканка і абнова

Вяртаюся з гораду ў гатэль. Паперадзе шыбуе амэрыканскае сямейства. Гучная размова. Залівісты сьмех, мёртвага з труны падыме. Іх чацьвёра: бацька з маці і дочкі, гадоў пятнаццаці й сямнаццаці. У руках яны нясуць рознапамерныя пакеты з бутыкаў. У малодшай у дупу заехалі шорты. Яна спыняецца, выцягвае іх, разгладжвае на непамерных клубах, робіць пару-тройку крокаў, і наравістыя шорты зноўку ў дупе. Таўстуны ажно прысядаюць ад сьмеху. Пасьля чарговай спробы паправіць шорты дзяўчына вырашыла зьмяніць ходу. Яна раскірэчваецца, выгінае сьпіну, адстаўляе дупу і робіць колькі крокаў інвалiднай ходою. Наравістыя шорты лезуць у дупу. Якраз мінаем могілкі. Амэрыканцы рагочуць на ўсе клады. Прысьпешваю хаду і пакідаю амэрыкосаў ззаду.

*21.08.2005, 11:32*

ВЕРА БУРЛАК

# Беражыце вочы!


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Яны і мы

Гендэрны верш

Яны апранулі нас у прыгожыя строі,
Яны нас паставілі, каб у нас на вачах,
Пасеўшы на коней, пахапаўшы зброю
Закутымі ў жалеза біцца на мячах.

Яны прыпісалі нам адмысловую мову,
Якою мы быццам бы ня можам не размаўляць.
А мы з гэтай мовы ня ведаем ані слова,
А зь іхняй два ведаем: на тры літары і на пяць.

Яны паселі на коней, узброіліся і, строга
Зірнуўшы на нас, паехалі — нашыя палядзіны, —
Напэўна, каб прывезьці нам адмысловага Бога.
Як быццам яны ня ведаюць, што Бог — адзіны.

### Паэту

Пакуль тваіх ахвяраў Фэб ня просіць,
Князь Цемры іх атрымлівае ўсмак,
І нема з-за дажджэзных хмар галосіць
Галодны і зьдзічэлы задыяк.

Стыхіі прэч з палону Апалёна
Прарваліся па твой крывавы труп,
І вецер грае трэш на саксафонах
І вадасьцёкаў, і астатніх труб.

Паэце, ведай: вершык на паперцы
Мацнейшы за крышталеўскі бальзам.
Слабенькі вершык рве слабыя сэрцы,
А моцны сэрцам — моцна піша сам.

Чытаў газэты? Дасьпяваюць ружы,
У гэтым годзе неблагі ўраджай.
Вунь далакоп ідзе — вясёлы, дужы,
Ўсіх закапае, толькі нараджай!

А потым будуць буры і ўраганы,
Наганы, рэкі, поўныя крыві:
Што ты равеш? Плыві! Ты ж беззаганны,
Адзіны ў сьвеце — ты за ўсіх жыві!

За ўсіх адказвай ты, як той вучыў, —
За ўсіх казлоў, якіх ты прыручыў,
Каго зьняважыў і па кім тужыў,
Адзін — за ўсіх, каго ты перажыў!

Бо ўжо чацьвёрка чарапах памерла,
І тры сланы, і нават тры кіты.
І над табою плача Мэльпамэна,
Адказная за ўсіх такіх, як ты.

***

Я даўно нежывая, даўно мне пара ў труну,
Толькі ранак мяне нацягвае, як струну
І ўвесь дзень на мне нешта грае.
Я выходжу на двор, дзе з дакладнасьцю да хвілін
Шпацыруюць штодня суседзі — Зомбі і сын —
І праседжваюць лаўкі Граі.

А з акенца дому насупраць глядзіць Жыцьцё:
Ўжо старое, бяззубае, з лапкамі, як асьцё,
І з усьмешкай, як мех трухі.

Я схаджу для яго ў гастраном па кефір і батон,
Бо яно — гэта мой мэтраном, і мой камэртон,
І адзіны слухач…

### Аб’ява

На плоце — бы сэрца, што прагне разьбіцца, —
Трапеча паперка ў цямрэчы сырой:
«Сябры! Суайчыньнікі! Госьці сталіцы!
Ратуйце! Згубіўся лірычны герой.

Прыгожы, як вы, дваццацідвухгадовы
(Бульдожка, бабулька ці брудны гіпар),
Калі ён да вас зазірне выпадкова,
Яго вы дакладна пазнаеце ў твар.

Тады, я прашу, набярыце мой нумар.
Я дам што заўгодна — хоць золата воз!..»
Чытаю — і шэрань сьціскае мой гумар,
І фары вясёлкай квітнеюць ад сьлёз.

***

А на нашай плянэце ўсё ня так, як у вас.
Нашы дзеці жывуць менш за год,
Дарослыя — тры як найболей.
Мы ня ведаем цьвёрдай сушы і вадкіх вод,
Як і вы — смаку мяккіх цьвікоў і салодкай солі.
Мы ляталі на Месяц, бо мы тонкія, быццам шкло,
І лятаем па прынцыпе бумэрангу.
А ў вольны час мы зьбіраем усё сяло
І танчым сатурніянскае танга.
У гэтым танцы толькі адзін рух — паварот галавы
Пад кутом, няясным як зьява.
А ўранку мы прачынаемся, як і вы,
І сьняданак у нас падобны: каша і кава.

# Знакі прыпынку



УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ

* * *

Герой Савецкага Саюзу Фёдараў, былы сакратар Чарнігаўскага абкаму, ува Ўкраіне вядомы як «генэрал-лейтэнант Арленка», а ў Беларусі — як «генэрал-лейтэнант Сяргееў», расказвае:

— У мяне пытаюць: «Ці не паедзеш партызаніць ува Ўкраіну?» «Чаму ж не паехаць?» — «Але давядзецца скідвацца». Скідвацца ня скідваўся, скакаў з вышкі ў ваду. Думаю: «Наўрад ці страшней». Далі парашут. Ляцім у «Дугласе». Кінуўся, рвануў за колца. Штуршок. Апускаюся. Па дарозе ўстаўляю ў аўтамат дыск з патронамі. Сьнег па пояс. Бачу, бягуць зь вінтоўкамі. «Хто такія?» — «Партызаны, мы чакаем вас!» Так я і стаў партызанам. Страшэнна цікава! Асабліва машыны ўзрываць. Ці цягнікі. Едзе… Тузанеш — ён і паляцеў…

Пасьля Фёдараў дорыць Міколу Бажану нямецкі пісталет і кажа: «Вы беражыце яго, ён з *фона* зьняты. Ня помню, як таго маёра звалі, але *фон*, з парадзістых… Дапыталі, а потым я зь ягонага ж пісталета яго і прыстрэліў».

За савецкім часам ва ўсялякіх агітацыйна-пісьменьніцкіх паездках, палётах і плаваньнях я сустракаўся шмат з кім з гэтай «фёдараўскай» пароды людзей. Спрабаваў, як звычайна, каб зразумець — сябе паставіць на іх месца… Не ўдавалася. Мусібыць, гэта немагчыма, калі ты ня зь іх пароды.

* * *

Яўген Еўтушэнка, зь якім даўно ня бачыліся, распытвае, хто мы такія, што мы такое, якія мы — беларусы… «Ну няхай добрыя, шчырыя, а што яшчэ?..» Кажа, што яму гэта цікава, бо сам — хай напалову ці на колькі там — беларус. І расказвае, як Мікалай Матукоўскі ў 1963 годзе напісаў у ЦК КПСС ліст пра антысэмітызм... Пра тое, што ёсьць людзі, якія ў такой інтэрнацыянальнай краіне, як СССР, сьвядома гэты самы антысэмітызм правакуюць. Ня толькі ў побыце, але і ў мастацтве, што страшней…

Падставай для ліста стала выкананьне 30-й сымфоніі Шастаковіча ў Менску. Маўляў, слухаючы сымфонію, габрэі коса пазіралі на славян, а славяне — на габрэяў. І Матукоўскі піша ў лісьце: антысэмітызму ў нас няма, аднак яго правакуюць такія людзі, як Шастаковіч і Еўтушэнка. Маючы на ўвазе Еўтушэнкаў «Бабін Яр».

У канцы 1970-х (здаецца, у 1978-м) Еўтушэнка прыяжджае ў Менск. Матукоўскі сустракае яго з кветкамі, вязе адразу не ў гатэль, а да сябе сьнедаць. Назаўтра яны ляцяць на верталёце (разам з Макаёнкам) у Хомічы — шукаць магілу Еўтушэнкавай бабулі. Знаходзяць. «І Коля, — кажа Еўтушэнка, — стаіць каля магілы, глядзіць на мяне і плача. І я не разумею, што адбываецца… Дагэтуль ня ўцямлю, калі ён шчырым быў? Калі ліст у ЦК, а па сутнасьці, данос на мяне пісаў ці калі над магілай маёй бабулі плакаў?..»

Я някепска, хоць блізка мы і не сябравалі, ставіўся да Матукоўскага, таму кажу, што, магчыма, ён быў шчырым у абодвух выпадках. Ну вось такія мы, беларусы, — шчырыя…

Еўтушэнка прыжмурваецца на мяне і дадае: «І добрыя…»

# «Спорт-Экспресс»: Прыезд у Беларусь як вяртаньне ў мінулае

БАТЭ — «Крылы Саветаў» 0:2 (0:2), «Цепліцэ» — МТЗ–РІПО 2:1 (1:1). Рэпартаж з барысаўскага матчу **Алега Раяўца**.

Шанцы трапіць у асноўную сетку Кубку УЭФА ў беларусаў былі. Перад матчамі ў адказ 25 жніўня іх было болей у менскага МТЗ-РІПА. На БАТЭ спадзеваў было меней. Тут дадавалася няўпэўненая гульня ў сёлетнім чэмпіянаце, а таксама параза ў першым матчы ў Самары з «Крыламі Саветаў» 0:2. Каб прайсьці ў наступны раўнд, барысаўцы мусілі забіць тры мячы, не прапусьціўшы ніводнага. Задача з сфэры фантастыкі. Простая перамога над расейцамі дадала б пару балаў у агульны каэфіцыент беларускіх клюбаў на эўрапейскай арэне.

Матч пачаўся а 21-й па просьбе гасьцей. А 19-й піцерскі «Зэніт» гуляў з аўстрыйскім «Супэрфундам», і маскоўскім тэлевізійнікам карцела паказаць абодва матчы.

За БАТЭ хварэюць ня толькі ў Барысаве. Па дарозе мы даганялі мікраааўтобусы зь менскімі й жодзінскімі заўзятарамі.

За «Крылы Саветаў» жа прыехалі пахварэць заўзятары ня толькі з Самары й Масквы, але нават з Украіны і Літвы. Усяго каля 200 чалавек, у дзесяць разоў болей, чым беларусаў на матчы на берагах Волгі два тыдні таму.

Утульны барысаўскі стадыён быў цалкам запоўнены (5500 гледачоў). Усё было зроблена пад гасьцей. Нават замест беларускіх песень перад матчам трансьлявалі «Течет река Волга».

Апошняя надзея на пазытыўны вынік у гульні зьнікла з пачаткам матчу. Самарцы адразу кінуліся ў атаку і за першыя чатыры хвіліны сустрэчы пасьпелі падаць ажно тры кутнія ўдары. На 5-й хвіліне кропку ў беларуска-расейскай дуэлі паставіў форвард валжанаў і беларускай нацыянальнай зборнай Віталь Булыга, забіўшы галоўпрыгажун у левы верхні ад кіпэра БАТЭ Федаровіча кут. Дзе ты, Віталя, быў у матчах з Славеніяй і Шатляндыяй, калі мяч упарта пасьля сустрэчаў з табой ня лез у варожыя вароты?

Зрэшты, ніякай варожасьці з боку барысаўскіх заўзятараў да Булыгі не назіралася. Калі яго на 66-й хвіліне замянілі на Амары Тэтрадзэ, гледачы праводзілі беларуса апляцысмэнтамі. За «Крылы» згулялі таксама беларусы Аляксей Скварнюк і Дзяніс Коўба.

Беларусы актывізаваліся хіба ў другой палове першага тайму — правялі некалькі атак і нават забілі гол, аднак мяч ня быў залічаны — судзьдзя зафіксаваў напад на брамніка «Крылаў» бразыльца Лобаса. Скрасіў змрочны настрой трыбунаў ганскі форвард гасьцей, экс-гулец менскага «Дынама» Баба Адаму, што ня раз прамахваўся з найвыгоднейшых пазыцый. А пад канец першага тайму ён, знаходзячыся на варатарскай лініі, прамахнуўся па мячы і ўпаў. Пабіўся колькі хвілін у канвульсіях — і падняўся. У нас ня Афрыка, можна і прастудзіцца.

На пасьляматчавай прэс-канфэрэнцыі трэнэр самарцаў Гаджы Гаджыеў канстатаваў, што з афрыканцам будуць працаваць далей, майстэрства яму відавочна бракуе.

У перапынку стадыённы дыджэй паспрабаваў завесьці публіку: «Яшчэ крыху — і перамога будзе за намі». Але для беларусаў зноў нешчасьлівай аказалася 5-я хвіліна, гэтым разам другога тайму, калі «Крылы» забілі другі мяч. Беларускія трыбуны прыціхлі, і з гэтага часу гледачоў куды больш цікавіла, хто лепш пускае «хвалю» — заходняя ці ўсходняя трыбуны. Потым гэта надакучыла, і за пятнаццаць хвілін да канца сустрэчы пачаўся масавы адток гледачоў. Глядзець не было на што. Большасьць удараў барысаўцаў наносілася з-за межаў штрафной, а форварды БАТЭ надта ўжо нехвотна перасоўваліся па полі.

«Хуткі гол фактычна вырашыў ход гульні. Некаторыя нашы гульцы проста прысутнічалі на полі».

На шляху ў цывілізаваную Эўропу нас абганяюць ня толькі заходнія суседзі, але і ўсходні. Расейскія карэспандэнты прыехалі з ноўтбукамі, каб перадаць рэпартаж у наступны, пятнічны нумар, а адзін з самарскіх журналістаў вёў жывую трансьляцыю на тамтэйшае FM-радыё па мабільным тэлефоне. У беларускай спартовай штодзённай прэсе рэпартаж пра матч зьявіўся толькі на пяты дзень, у аўторак. І праблема тут ня столькі ў журналістах, колькі ў манаполіі айчынных друкароў.

Таму мяне не зьдзівіў рэпартаж аб матчы ў аўтарытэтнай расейскай газэце «Спорт-Экспресс», карэспандэнт якой параўнаў візыт у Беларусь зь вяртаньнем у мінулае: «Пабываўшы ў Беларусі, вельмі цяжка абысьціся без матываў рэтра. Адныя павязкі «дружыньнік» чаго вартыя... Ці абсалютная адсутнасьць атрыбутыкі ў мясцовай каманды. Паводле суворых беларускіх законаў, каб выпускаць праграмкі на продаж, клюб мусіць набыць дарагую ліцэнзію, што робіць гэты бізнэс нявыгадным. У выніку праграмкі выдалі строга па адной толькі журналістам, футбалістам і VIP-гасьцям».

Але галоўнае — розьніца ў клясе. Тыя ж «Крылы» нічога звышнатуральнага ў Барысаве не прадэманстравалі. Прачзь фінансавыя цяжкасьці і зьмену прэзыдэнта клюбу каманду пакінула дзесяць вядучых футбалістаў, замест іх набрана моладзь, а «Крылы» ў чэмпіянаце Расеі скаціліся на 13-е месца. БАТЭ ж — адзін з найлепшых беларускіх клюбаў, ён ніводнага разу не апускаўся ніжэй за трэцяе месца. Але прайгралі па ўсіх артыкулах. Той жа «Спорт-экспресс» вельмі трапна ахарактарызаваў моц беларускага футболу, заўважыўшы, што БАТЭ прыйшлося б цяжка нават у першай — не вышэйшай — лізе расейскага чэмпіянату.

У наступным раўндзе Кубку УЭФА «Крылы Саветаў» сустрэнуцца з галяндзкім AZ, што летась зьдзівіў усіх, выбіўшыся ў паўфінал Кубку УЭФА. Чэскі «Цепліцэ» трапіў на каталёнскі «Эспаньёл». Клюбы з Алькмаару і Барсэлёны маглі б прыехаць і ў Беларусь, але пакуль наша доля — кіпрыёты і грузіны ў кваліфікацыйных раўндах.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Форвард гасьцей, экс-гулец менскага «Дынама» Баба Адаму, ня раз прамахваўся з найвыгоднейшых пазыцый.**

## СПОРТ СЬЦІСЛА

### Італія вызначылася

Галоўны трэнэр зборнай Італіі Марчэла Ліпі назваў меркаваных кандыдатаў на адборачны матч зь Беларусьсю.
Брамнікі: дэ Санчыс («Удынэзэ»), Пэруцы («Лацыё»);
абаронцы: Барцальлі, Гроса, Дзакарда (утрох — «Палерма»). Дзамброта, Ф.Канавара (абодва — «Ювэнтус»), Матэраццы («Інтэр»), Нэста («Мілян»);
паўабаронцы: Гатуза, Пірла (абодва — «Мілян»), Баронэ («Палерма»). Камаранэзі («Ювэнтус»), дэ Росьсі («Рома»), Мэста («Рэджына»), Эспазіта («Кальяры»);
форварды: Джылярдына, В'еры (абодва — «Мілян»), дэль П'ера («Ювэнтус»), Тоцці («Рома»), Тоні («Фіярэнціна»), Якінта («Удынэзэ»).
Матч зборных Беларусі ды Італіі пройдзе 7 верасьня (серада) на сталічным стадыёне «Дынама». Пачатак а 20-й. А 19-й гледачоў чакае канцэрт зорак беларускае попсцэны.

### Эўрапейскі футбол

На мінулым тыдні прайшло лёсаваньне групавога турніру футбольнае Лігі чэмпіёнаў. 32 каманды разьбіты на восем групаў па чатыры клюбы ў кожнай. Матчы пройдуць з 13 верасьня па 7 сьнежня (па аўторках і серадах). Лёндanskі «Арсэнал», за які гуляе паўабаронца нацыянальнай дружыны Аляксандар Глеб, трапіў у адну групу з швайцарскім «Тунам», праскай «Спартай» і амстэрдамскім «Аяксам». Першы матч — 14 верасьня з «Тунам».
У Кубку УЭФА «Самподорыя», за якую заяўлены беларускі форвард Віталь Кутузаў, у першым раўндзе згуляе зь «Віторыяй» (Сэтубал, Партугалія).

### Перамагаць швэдаў

Больш суворае жэрабя напаткала мужчынскую гандбольную зборную. У пятніцу ў Вене прайшло лёсаваньне кваліфікацыі чэмпіянату сьвету 2007 г. Супернікамі беларускіх хлопцаў сталі каманды Швэцыі, Турцыі і Бэльгіі. У наступны раўнд — плэй-оф — трапляюць пераможцы груп. Абысьці швэдаў — пакуль з сфэры фантастыкі. Кваліфікацыйныя матчы пройдуць у студзені.

### Беларусы — найлепшыя верталётчыкі

Нацыянальная зборная Беларусі заваявала шостае агульнакамандное месца на чэмпіянаце сьвету па верталётным спорце ў Францыі. У індывідуальных практыкаваньнях «Слалам» і «Дастаўка грузаў» нашыя былі трэцімі. Гонар беларусаў адстойвалі прадстаўнікі Віцебскага клюбу ДТСААФ.

**AP; sport-express.ru, belta.by**

ІНФАРМАТАР

# Начныя крамы Менску


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Заводзкі раён**

**Унівэрсам «Байкальскі»**
вул. Ангарская, 36
Т.: 243–61–34
Час працы: круглыя суткі, перапынак 15:00—16:00

**Унівэрсам «Аўтазаводзкі»**
вул. Енісейская, 1
Т.: 242–11–13
Час працы: круглыя суткі

**Крама «Рада»**
пр–т Партызанскі, 12
Т.: 214–21–05
Час працы: круглыя суткі

**Крама «Гарачы хлеб»**
пр–т Партызанскі, 97
Т.: 295–44–54
Час працы: круглыя суткі, перапынак 8:00—9:00

**Ленінскі раён**

**Гандлёвы дом «Палесьсе»**
пр–т Ракасоўскага, д. 62
Т.: 249–99–68
Час працы: круглыя суткі

**Маскоўскі раён**

**Унівэрсам «Берасьце»**
пр–т Любімага, 17
Т.: 271–04–04
Час працы: круглыя суткі

**Унівэрсам «Ля кургану»**
пр–т Любімава, 26
Т.: 271–07–23
Час працы: круглыя суткі

**Кастрычніцкі раён**

**Крама «Палукс»**
вул. Варанянскага, 17
Т.: 213–23–65
Час працы: круглыя суткі

**Крама «Інвастрой»**
вул. Кірава, 3
Т.: 206–62–58
Час працы: круглыя суткі

**Крама «Комбак»**
вул. Кірава, 4
Т.: 200–85–51
Час працы: круглыя суткі

**Крама «Дэтройт»**
вул. Брылеўская, 17
Т.: 224–47–88
Час працы: круглыя суткі, кожны панядзелак выходны

**Фрунзэнскі раён**

**Унівэрсам «Заходні»**
вул. Ляшчынскага, 1
Т.: 258–67–56
Час працы: круглыя суткі

**Крама «Лярэнда»**
пр–т Пушкіна, 20
Т.: 252–99–98
Час працы: круглыя суткі

**Крама «Парк»**
вул. Альшэўскага, 27
Т.: 210–20–74
Час працы: круглыя суткі, перапынкі: 8:00—8:30, 20:00—20:30

**Першамайскі раён**

**Унівэрсам «Эўрапейскі»**
пр–т Ф.Скарыны, д.117, к.1
Т.: 263–20–03
Час працы: круглыя суткі

**Унівэрсам «Першамайскі»**
вул. Русіянава, 7
Т.: 260–83–51
Час працы: круглыя суткі, перапынак 8:00—9:00

**Крама «Прадсэрвіс №1»**
пр–т Ф.Скарыны, 89
Т.: 280–05–21
Час працы: круглыя суткі

**Цэнтральны раён**

**Крама «Капеечка»**
вул. Дразда, 8
Т.: 203–11–25
Час працы: круглыя суткі

**Крама «Прэстанмаркет»**
вул. Варвашэні, 77
Т.: 234–52–27; 234–33–55
Час працы: круглыя суткі, перапынак 8:00—9:00

КАІСА

# Хвала пільнасьці ў эндшпілі

Часта даводзілася назіраць, дый правяраць на сабе, як шахматыст, давёўшы партыю да фіналу, губляецца і праз недарэчныя хады прайграе ў нічыйнай пазыцыі — або, што нават больш крыўдна, робіць нічыю ў выйгранай. Трэнэры па традыцыі навучаюць дзяцей гуляць у шахматы, разьбіраючы эндшпільныя пазыцыі, бо лічыцца, што эндшпіль — найпрасьцейшая стадыя партыі. Сапраўды, калі гаворка ідзе аб заканчэньні «пешка і кароль супраць караля», усё ясна — гульцу трэба ведаць правілы апазыцыі і квадрату. Большасьць жа астатніх заканчэньняў пралічыць да канца пад сілу хіба машыне, а чалавеку выпадае спадзявацца на інтуіцыю і вопыт. Калі ў пачаткоўцаў ёсьць першае, то па азначэньні няма другога… Дадамо, што пад канец партыі бакам зазвычай бракуе часу. Стала пагалоскай байка пра майстра, што ня здолеў паставіць мат сланом і канём — забыў, як тое робіцца, а на ўспамін не хапіла пары хвілін. Праўда, у чэмпіянаце Беларусі ўвесну 2005 г. Андрэй Жыгалка, застаўшыся зь дзвюма пешкамі супраць каня і слана Аляксея Фёдарава, ня стаў выпрабоўваць умельства гросмайстра — здаў партыю.

У жаночым першынстве краіны пашчасьціла майстарцы Надзеі Паліводзе. Віцэ-чэмпіёнка краіны-2004 г., адбіўшы атаку Вольгі Герасімовіч, белымі атрымала пазыцыю, пра якую можна было марыць (*дыягр. 1*):

Відавочна, пасьля 1. Kc6+ Кра6 2. Tb8 чорным заставалася здацца. У выніку ж абсурднага 1. Крс2? Се7 39. Kd5? Cd6 3. Kpd3 f5 чорныя выблыталіся. І вось у сёлетнім чэмпіянаце Н.Па-лівода, адна з найбольш пэрспэктыўных шахматыстак Беларусі, замацавалася на пятым месцы.

Прыклад з сэансу, праведзенага Зьмітром Лыбіным для чытачоў «Нашай Нівы» на Дзень шахмат (*дыягр. 2*):

Белыя (сп.Лыбін) рашуча і з грукатам узялі пешку: 1. Cf6! Чорныя, загіпнатызаваныя ўпэўненай гульнёй гросмайстра, ледзь не пайшлі ў яго на повадзе. Вядома, пасьля 1… gf?? пешка «h» бесьперашкодна бегла ў фэрзі. Добра, што ў чорных было трохі часу на роздум: «рознакаляровыя» сланы ўсё-такі далі ім пажаданую нічыю (1… Се8 2. Cg7 Ch5=).

Выглядае, што эндшпіль — няпростая стадыя шахматнай партыі. Да яго лепш за ўсё рыхтавацца ў дэбюце, калі контуры заканчэньня толькі намячаюцца, а яшчэ лепей… да пачатку новай гульні. Поўная аналёгія з выбарамі: на зыходзе адных варта ўжо думаць пра другія.

**ВР**


Дыяграма 1.


Дыяграма 2.


Дыяграма 3.

**Як бы вы згулялі?**

Ход белых. Як скончыцца гульня ў гэтым эндшпілі?

**Адказ:** белыя ставяць мат за 2 хады: 1. Ke6! (цугцванг). На конкурсе «Шахматнай кампазыцыі» (1996) гэтая задача жыхара Бабруйску Леаніда Лебедзева атрымала спэцыяльны прыз. На праўдзе, пазыцыя нібы ўзятая з партыі!

ВАРТА БАЧЫЦЬ

**Пятніца, 2 верасьня**

**АНТ, 21.05**

«Мумія»

ЗША, 1999, рэж. Стывэн Сомэрз

Прыгоды, фільм жахаў, камэдыя

Кампанія з археоляга (Брэндан Фрэйзэр), прывабнай дзяўчыны-гісторыка (Рэйчэл Ўэйз), яе шахрая-брата шукае скарбы ў эгіпецкай пустэльні. Шукальнікі абуджаюць старажытную мумію Імхатэпа, якая імкнецца аднавіць цела (запчасткамі з асобных тавырышаў) і мае далёкасяжныя благія пляны.

Клясычны пэрсанаж старых амэрыканскіх жахавак дапоўнены відовішчнымі кампутарнымі эфэктамі, драйвам ды добрым гумарам.

Намінацыя на «Оскар» за найлепшы гук.

**Субота, 3 верасьня**

**«Лад», 12.15**

«Апошнае лета дзяцінства».

Беларусь, 1974, рэж. Валер Рубінчык

Прыгодніцкая кінааповесьць па матывах твору А.Рыбакова «Стрэл»

Паэтычны, лірыка-іранічны і «барочны» тэлефільм Валера Рубінчыка пра эпоху НЭПу. Героі «Корціка» і «Бронзавай птушкі» пасталелі і цяпер ужо не шукаюць скарбы, а сутыкаюцца з сапраўднымі злодзеямі. У адрозьненьне ад папярэдніх «піянэрскіх» карцінаў, «Апошняе лета дзяцінства» вылучаецца дынамізмам, атмасфэраю і выразнай аўтарскай інтанацыяй.

Рубінчык настальгічна-пяшчотна гуляе са знакамі эпохі: спрэчкі, старыя фотасалёны, касьцюмы.

Галоўнага «д’ябла-спакушальніка» грае выбітны Яўген Еўсьцігнееў, а музыка Яўгена Глебава — асобны падарунак для гледачоў.

**НТВ, 21.25**

«Блэйд–2»

ЗША, 2002, рэж. Гілерма дэль Тора

Вампірычны баявік, комікс

Новая раса мутантаў-крывасмокаў пагражае вампірскаму сьвету. За дапамогаю ўпыры зьвяртаюцца да свайго «кроўнага» ворага — Блэйда (Ўэсьлі Снайпс). Блэйд вымушаны прапанову прыняць — і распачынаецца новая бойка з элемэнтамі «Матрыцы».

Рэжысэр Гілерма дэль Тора («Хронас», «Хрыбет д’ябла») знаны стылёвымі відовішчнымі карцінамі, і стужка «Блэйд-2» атрымалася бадай найлепшаю часткаю вампірскай трылёгіі. Энэргічнае дзеяньне, агрэсіўная музыка, готыка-тэхнакратычны дызайн і шыкоўныя адмысловыя эфэкты зь зяпамі мутантаў.

**АНТ, 23.20**

«Тыгр, які крадзецца, дракон, які затаіўся»

Ганконг—Тайвань—Кітай—ЗША, 2000, рэж. Энг Лі

Драма, усходні баявік

Майстра баявых мастацтваў Лі Мубай адпраўляецца на пошукі магічнага мяча, скрадзенага невядомымі. Карціна агаломшыла Амэрыку і была адзначана чатырма прэміямі «Оскар» і дзесяцьцю намінацыямі. Пастаноўку баявых сцэнаў рабіў майстар Юань Упін, якога потым запрасіць у «Матрыцу».

**СТВ, 23.45**

«Маленькая настаўніца»

Кітай, 1999, рэж. Чжан Імоў

Драма


WWW.MOVIEWEB.COM

Настаўнік зьяжджае на месяц зь вёскі і пакідае 13-гадовую дзяўчынку Вэй Мінжы за сябе. Гераіня да вяртаньня дарослага мусіць дапільнаваць усіх вучняў, але нястрыманы хлопчык Чжан адпраўляецца ў горад. Маленькая настаўніца ідзе за ім.

Рэжысэр Чжан Імоў («Чырвоны гаалян», «Падымі чырвоны ліхтар») — выбітны кінатворца, ключавая фігура новага кітайскага кіно.

Фільм «Маленькая настаўніца» атрымаў «Залатога ільва» на кінафэсьце ў Вэнэцыі і заслужыў яшчэ дзевяць узнагародаў.

**Нядзеля, 4 верасьня**

**АНТ, 21.05**

«Злаві мяне, калі зможаш»

ЗША, 2002, рэж. Стывэн Сьпілбэрг

Дэтэктыў па аўтабіяграфічнай кнізе Фрэнка Эбэгнэйла.

Фрэнк Эбэгнэйл у сваім жыцьці пераўтвараўся ў лекара, адваката, пілёта — і геніяльна займаўся шахрайствамі. Па сьлядох Фрэнка (Леанарда Ды Капрыё) ідзе паліцэйскі (Том Хэнкс), што марыць яго схапіць.

**Андрэй Расінскі**

## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ



**Яна і я**

У Доме літаратара (Вул. Фрунзэ, 5) **13 верасьня** прэзэнтацыя кнігі «Яна і Я. Вершы і песьні пра каханьне».

У імпрэзе возьмуць удзел Р.Барадулін, Г.Бураўкін, Л.Вольскі, Л.Драньков-Майсюк, А.Камоцкі, У.Някляеў, В.Скорабагатаў, М.Скобла, А.Хадановіч і інш.

Уваход і выхад вольныя. Пачатак а 18.45.

## СПОРТ

**Футбол**

**6 верасьня** на Гарадзкім стадыёне ў Барысаве пройдзе адборачны матч да моладзевага чэмпіянату Эўропы па футболе. Моладзевая зборная Беларусі згуляе са зборнай Італіі. Пачатак а 19-й.



**7 верасьня** ў Менску на стадыёне «Дынама» матч нацыянальных зборных Беларусі і Італіі. Пачатак а 20.00. А 19-й — канцэрт зорак беларускай поп-музыкі. Квіткі ад 5 да 35 тыс.

**Чэмпіянат Беларусі. 19 тур**

**10 верасьня (субота)**

«Лякаматыў» (Менск) — «Дняпро-Трансмаш» (Магілёў). Гульня пройдзе ў Смургонях.

**11 верасьня (нядзеля)**

«Зорка-ВА-БДУ» — БАТЭ (Барысаў). Стадыён «Трактар».

«Нафтан» (Наваполацак) — «Тарпэда» (Жодзіна)

«Дарыда» (Ждановічы) — «Дынама» (Менск). Стадыён у Кунцаўшчыне. Цяпер у Кунцаўшчыну можна даехаць на мэтро.

«Дынама» (Берасьце) — ФК «Гомель»

«Нёман» (Горадня) — «Шахтар» (Салігорск)

«Славія» (Мазыр) — МТЗ-РІПА (Менск)

**Гандбол**

10 верасьня (субота). Палац лёгкай атлетыкі ва Ўруччы.

Матч кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў.

БГК імя Мяшкова (Берасьце) — «Сандэф'ёрд» (Нарвэгія). Пачатак а 17-й. Першы матч пройдзе 3 верасьня на радзіме Рагвалода.

**Коні і мы**

**9—11 верасьня** ў Ратамцы пройдуць рэспубліканскія спаборніцтвы памяці Л.Даватара па пераадоленьні перашкодаў.

У Гомелі з 15 па 18 верасьня — Алімпійскія дні моладзі па трохбор'і з удзелам юнакоў і дзяўчат1988—1989г.н., а таксама першынство Беларусі па трохбор'і з удзелам юнакоў і дзяўчат 1987г.н.

## КРЭЎСКІЯ КАМЯНІ

**10 верасьня** ў Крэве (Смургоншчына) пройдзе дабрачынны фэстываль «Крэўскія камяні — 2005», што ладзіцца гісторыка-краязнаўчым таварыствам «Этна». Сабраныя грошы пойдуць у фонд кансэрвацыі Крэўскага замку.

Удзел у сьвяце бяруць гурты сярэднявечнай музыкі, сучасныя выканаўцы, барды, рыцарскія клюбы, скульптар Гэнік Лойка. Арганізатары сьвята кажуць, што у мурах замка можна спаткаць прывіда.

Тэл. для даведак: 8-029-77-62-435 (Павал), 782-04-11 (Галіна), 709-70-22 (Вольга).

## ВЫСТАВЫ

**Спортэкспа**

З 8 да 10 верасьня ў павільёне НВЦ «Белэкспа» (Я.Купалы, 27) адбудзецца Міжнародная спартовая выстава «Спортэкспа-2005». У праграме выставы таксама чэмпіянат Беларусі па судамадэльным спорце ў клясе стэндавай мадэлі-копіі, выступы прафэсіяналаў бодзібілдынгу і фітнэсу.

**Паляваньне і рыбалоўства**

З **15 да 17 верасьня** ў НВЦ «Белэкспа» (Я.Купалы, 27) — міжнародная спэцыялізаваная выстава-кірмаш «Паляваньне і рыбалоўства. Восень — 2005», дзе можна будзе паглядзець паляўнічыя і рыбалоўныя аксэсуары, трафэі, а таксама набыць грыбы, ягады, мёд.

**Займеньнікі**

Да **7 верасьня** ў музэі-галерэі «Сьвет фота» (Прытыцкага, 10) працуе выстава фатаздымкаў Дзьмітрыя Лельчука (Гамбург) і Ганны Громавай (Менск) «Займеньнікі». Уваход вольны.

## КАНЦЭРТ

**8 верасьня** ў клюбе «Рэактар» — нарвэская мэтал-легенда «Ancient». Разам зь ёю зайграюць нашыя «Зьніч», «Сонцаварот», «Imprudence», «Iratus Dominus». Пачатак у 17.30. Даведкі па тэлефонах 649-08-88, 565-65-60.

# Ладзьдзя роспачы



Ад 9 да 18 верасьня ў Менску — гастролі Коласаўскага тэатру зь Віцебску. Не прапусьціце «Ладзьдзю роспачы» паводле Караткевіча (9 і 10 жніўня). Гэтыя й іншыя спэктаклі аднаго з найстарэйшых беларускіх тэатраў пройдуць у памяшканьні Расейскага тэатру імя Горкага: вул.Валадарскага, 5.

**9** (пт), **10** (сб) — **«Ладзьдзя роспачы»**

**11** (ндз), **12** (пн) — **«Муж і жонка»**

**13** (аўт), **15** (чц), **16** (пт) — **«Ён. Яна. Акно. Нябожчык»**

**14** (ср) — **«Праўда — добра, а шчасьце лепш»**

**17** (сб) — **«Жанчына ў пясках»**

**18** (ндз) — **«Бацька»**

**Для дзяцей**

**10** (сб), **11** (ндз) — **«Доктар Айбаліт»**.

Вячэрні сэанс — 19.00, дзіцячы сэанс — 11.30, 14.00.

## ІМПРЭЗЫ



**Шапэн**

2 верасьня ў Вялікай залі Акадэміі музыкі (Інтэрнацыянальная, 30) адбудзецца канцэрт Віталя Стахіевіча. У праграме творы Ф.Шапэна. Пачатак а 16-й. Уваход вольны.

**Васіль Быкаў па-ўкраінску**

1 верасьня, у бібліятэцы Дома літаратара (Фрунзэ, 5) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі апошніх твораў Васіля Быкава ў перакладзе на ўкраінскую мову «Ходільці» («Пахаджане»). Бярэць удзел перакладчык кнігі, украінскі пісьменьнік Аляксандар Ірванец, сябры Васіля Быкава, а таксама Андрэй Хадановіч і Ўладзімер Арлоў, чые кнігі выйшлі сёлета ва Украіне. Пачатак а 16-й. Уваход вольны.

**Лера Сом**

16 верасьня а 18-й у чытальнай залі бібліятэкі Дома літаратара — прэзэнтацыя новай кнігі вершаў Леры Сом «Свабода слова зіма».

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Графіці** (758-40-54)

**1** (чц), 20.00 — канцэрт клюбу аўтарскай песьні БДУ «Адкрыцьцё сэзону».

**Madison** (219-00-10)

**1** (чц), 22.00 — Lady's Thursday. Girls only untill 1.30.

**2** (пт), 23.00 — dj Nice.

**3** (сб), 22.00 — dj Nice.

**4** (ндз), 23.00 — Staff party.

**Ізюм** (206-66-18)

**1** (чц), 23.00 — Back2School RNB: dj Tonik (SPB), dj Induss.

**2** (пт), 21.00 — Live: Apple Tea / Love-party: school-girls, hot fashion show, dj Jerry B, Live Erotic Show.

**3** (сб), 22.00 — Fire dance: dj Lexa, IzUM dance, erotic show.

**4** (ндз), 21.30 — Live: Blues Street / Sunday dance: dj Luxury.

**Bronx** (288-10-61, gsm velcom: 103 і 105)

**1** (чц), 22.00 — dj-bar.

**2** (пт), 21.45 — Жывая музыка / dj-bar.

**3** (сб), 23.00 — Back 2 Back (VS party) #3: dj Kefir (SPB), LP aka Палены, Даша Пушкіна, dj Mitya, dj Kudesnikoff.

**Белая Вежа** (284-69-22, 239-16-00)

**1** (чц), 23.00 — White Tower: dj Top, dj Grizzly, dj Bergamo.

**2** (пт), 23.00 — Жывая музыка «Acoustic Band» / dj Alex.

**3** (сб), 1.00 — dj Dee.

**X-Ray** (223-93-55)

**2** (пт), 23.00 — Gangsta Boogie: dj Light (Moscow), dj Iduss

**3** (сб), 22.00 — dj-bar.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Выспа» (2с, прэм'ера): **1—4** (чц—ндз) 15.50.

«Прыгоды Шаркбоя і Лавы-3D»: **1—4** (чц—ндз) 10.30 (іл)

**«Берасьце»** (272-87-91)

«Мама, не бядуй—2»: **2** (пт) 16.30, 18.50.

«Горад грахоў»***: 1—4 (чц—ндз) 21.00.

**«Дружба»** (240-90-13)

«Няўлоўны» (прэм'ера) ***: **2—4** (пт—ндз) 16.30.

«Гарфілд»: **1** (чц) 14.30, **2** (пт) 12.00, **3** (сб) 13.00, **4** (ндз) 11.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Мадагаскар» (прэм'ера): **1, 2** (чц, пн) 12.00, 13.40.

«Выспа» (2с, прэм'ера): **1—4** (чц—ндз) 15.40, 18.20, 21.00.

**«Масква»** (203-14-48)

«Мадагаскар» (прэм'ера): **1, 2** (чц, пт) 17.00; **3, 4** (сб, ндз) 15.00 (іл).

«Выспа» (2с, прэм'ера): **1, 2** (чц, пн) 19.00, 21.20; **3, 4** (сб, ндз) 16.40, 19.00, 21.20.

**«Мір»** (288-22-33)

«Мама, не бядуй—2»: **1—4** (чц—ндз) 19.00, 21.00.

«Вайна сусьветаў»: **1—4** (чц—ндз) 18.20, 20.20.

«Прыгоды Шаркбоя і Лавы-3D»: **1, 2** (чц, пн) 10.30 (іл), 14.00, 15.00, 16.00, 17.00; **3, 4** (сб, ндз) 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00.

**«Перамога»** (203-77-66)

«Забіць Фройда»*** (прэм'ера): **1, 2** (чц, пн) 19.00.;**3, 4** (сб, ндз) — 16.40 (іл), 19.00.

«Мама, не бядуй—2»: **1, 2** (чц, пн) 19.00; **3, 4** (сб, ндз) 14.30 (іл), 21.10.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)

«Няўлоўны» (прэм'ера): **1, 2** (чц, ндз) 11.00, 13.00, 17.00, 19.00, 21.00; **3, 4** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.00, 17.00, 19.00, 21.00

«Эўратур»: **2—4** (пт—ндз) 15.00.

«Тэстамэнт прафэсара Доўля»: **1** (чц) 15.00.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці

(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)

Рэйтынгавыя абмежаваньні:

*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;

**** — дарослым з 18 год.

## КІНО НА DVD

**Master Records**

**Памятай, дзеля ўсяго сьвятога**

Драма, Гішпанія, 2005, рэж. **Патрысія Фэрэйра**

У ролях: **Фэрнарда Фэрнан Гомэз, Эма Віларасаў.**

Ірэн, якая жыве са старым бацькам і з сынам, не задаволеная сваёй будучаю нявесткай і не жадае адпускаць сына. Непрыязнасьць расьце, але страшная падзея зьбліжае жанчын.

**Менск, Кісялёва, 12, т.: 643-21-08**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Таталітарызм у пячонцы

**Выспа** (The Island)

ЗША, 2005, каляровы, 136 хв.

**Жанр:** фантастычны трылер, баявік.

**Адзнака:** 5,5 (з 10).



WWW.MOVIEWEB.COM

Лінкальн Шэсьць-Эха (Юэн Макгрэгар) жыве ў прыязна-таталітарным грамадзтве, дзе ўсе носяць аднолькавае адзеньне і мараць трапіць на выспу — адзіную чыстую тэрыторыю на Зямлі. Герой, аднак, высьвятляе, што выспа — падман, і ўсе яны толькі целы-клоны для забору органаў. А тут падасьпела чарга яго дзяўчыны (Скарлет Ёхансан). Героі ўцякаюць, каб сустрэцца са сваімі заказчыкамі.

У карціне Майкла Бэя ўсяго патроху. Салодка-таталітарнае грамадзтва — ад «Уцёкаў Логана» і «Матрыцы», павучкі-«вокалюбы» — з «Асаблівага меркаваньня» Сьпілбэрга; а бойка са злым доктарам-богам — намёкі на «Бегуна па лязу брытвы».

Але рэжысэр «Армагедону» і «Пэрл-Харбару» асаблівы акцэнт робіць на экшане — бесьперапынны лёт гелікоптэраў, перакуленыя машыны ды штангі на дарогах у якасьці «выбуховага» сродку. Пасьля нудна-стэрыльнага пачатку кадры зь перасьледамі, падзеньнямі і перастрэлкамі ідуць адзін за адным, і менавіта яны галоўныя ў фільме.

Сацыяльна—палітычны складнік карціны прыцішаны, сустрэча героя з «арыгіналам» — дызайнэрам з цырозам печані — прадказальная і шчасьлівая; любоўная лінія паміж Макгрэгарам і Ёхансан стрыманая (некаторыя нават абураліся, што Ёхансан так і не распранулася). Гераіня, праўда, так і не сустрэлася са сваёй «заказчыцай», але прадэманстравала, што валодае пісталетам.

Бюджэт карціны ў $122 млн і здольнасьці Майкла Бэя зрабілі яе нясумнай.

**Андрэй Расінскі**

# Ворша-2005

Адзначэньне ўгодкаў Аршанскае бітвы адбудзецца 3 верасьня, а 19-й. Да месца можна даехаць з чыгуначнага вакзалу Воршы на аўтобусе №11 да аўтавакзалу (канец маршруту), далей аўтобусам «Ворша—Дуброўна» да прыпынку «Гацькаўшчына».

Гуртам можна наняць маршрутку з чыгуначнага вакзалу проста да Гацькаўшчыны.




Ад прыпынку «Гацькаўшчына» да месца каля 1 км.

Даведкі: **mihalca@tut.by**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Школьны базар



Нешта падгніла ў нашай роднай дыктатуры. Сёлета кабінэт міністраў вырашыў ня ўводзіць абавязковай школьнай формы. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Асабіста я па БТ бачыў як мінімум дзьве праграмы ў падтрымку ўніфікацыі школьных манатак, правільна, думаю, даўно пара «па шматлікіх просьбах працоўных увесьці стандарт школьнай формы: для хлопчыкаў — зялёныя пінжакі і чырвоныя штаны, для дзяўчынак — чырвоныя блюзкі ды зялёныя спаднічкі, плюс значок члена БРСМ». І раптам чытаю ў «Саўбелцы»: «Сёлета Мінадукацыі толькі рэкамэндавала вучням дзелавы стыль».

Гэта як жа зразумець, таварышы? Чарлі Мэнсан на сваім іміджы трансвэстыта зарабіў мільярд баксаў лавандоса. Хто скажа, што гэта не дзелавы стыль?

А што такое «рэкамэндаваць»? Прыгадайце, калі апошні раз якое-небудзь міністэрства нешта «рэкамэндавала» грамадзянам? Што замінала чыноўнікам адкінуць каронны трук: у адпаведнасьці з Дырэктывай надзяліць канкрэтнае атэлье або камбінат манапольным правам адзяваць вучняў дадзенай школы або рэгіёну. А каб не дапусьціць дэмпінгу з Кітаю або Ўкраіны, увесьці спэцыяльныя акцызныя маркі на ўсю намэнклятуру тэкстыльных вырабаў, уключаючы шкарпэткі і ніжнюю бялізну.

Ніколі не паверу, што праблема пераходу на адзіную форму завязана на грошах. У той жа «Саўбелцы» нейкі спэцыяліст сьцьвярджае, што праз асаблівасьці сынтэтыкі дзецям трэба набываць зімні і летні варыянты школьных касьцюмаў. Для любой беларускай сям'і двойчы на год мяняць гардэроб дзіцяці — як мазырскай «Славіі» зьліць чарговы матч.

Таму я прапаную сваю вэрсію: беларускія Макаранкі і Пэсталёцы ніяк ня могуць дасягнуць адзінага эстэтычнага пункту гледжаньня.

Стэнаграма паседжаньня Мінадукацыі аб школьнай форме, на маю думку, мусіла б выглядаць наступным чынам:

**Міністар:** Якія будуць прапановы?

**Першы намесьнік:** Прапаную стыль пад рэп: гэта самы антыбушаўскі фасон у сьвеце, хлопчыкі ў байках з капелюхамі і надпісамі на грудзях «Yankees, go home from Iraq». Дзяўчаты — у майткахстрынгах, каб можна было прачытаць антыэўразьвязаўскае тату ніжэй сьпіны.

**Другі намесьнік:** «Я прапаную стандартны славянскі стыль, які б адлюстроўваў геапалітычны выбар дзяржавы. Дзяўчынкі ў какошніках і доўгіх па пяты сукенках — каб не было ніякіх сэксуальных намёкаў. Хлопчыкі — у белых кашулях са слуцкімі паясамі.

**Міністар:** мне падабаецца першая ідэя, другая — занадта нацыяналістычная. Аднак, каб перавесьці прадпрыемствы на вытворчасьць баек ды стрынгаў, патрэбны нейкі час. Давайце сёлета яшчэ паходзім у дзелавых касьцюмах.

А магчыма, міністры проста навучаны замежным вопытам. Нядаўна мой знаёмы прыехаў з Пхэньяну і кажа, што іхняя залатая моладзь, каб адрозьнівацца ад сваіх пагодкаў-плебэяў, узяла за моду насіць значак з выявай любімага Кім Чэн Іра на адвароце кашулі, а суседняя школа, каб адрозьнівацца ад тых мажораў, той жа самы значак вешае на іншае месца.

Каб у нас такога чаго ня выйшла з новай формай.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА**

**4 верасьня** (нядзеля) па маршруце:
Менск—Ішкалдзь—Вольна—Паланэчка—Завосьсе—Сталовічы—Новая Мыш—Крошын—Стайкі—Менск.

**11 верасьня** (нядзеля)
Беніца—Крэва—Баруны—Гальшаны—Дзясятнікі—Вішнева—Валожын.

**22—25 верасьня**
Вільня—Трокі—Меднікі
Т.: **232-54-58, 622-57-20** (Зьміцер)
**264-12-38, 776-24-35** (Павал)

**Наведайце разам з намі**
**Самыя прыгожыя замкі замкі Ўкраіны**
**КАМЯНЕЦ-ПАДОЛЬСКІ І ХОЦІН**
**16—19 верасьня**

**Праграма туру**
Адпраўленьне зь Менску а 18–й.
1–шы дзень
Прыбыцьцё ў Камянец–Падольскі; разьмяшчэньне ў гатэлі турклясы;
аглядная пешаходная экскурсія па старадаўнім Камянцы; экскурсія ў Катэдральны касьцёл; экскурсія ў Старую крэпасьць.
2–гі дзень
Паездка ў «Крышталёвыя пячоры»; экскурсія ў Хоцінскую крэпасьць;
Прыбыцьцё ў Менск зранку.
Кошт туру 50 у.а. + 22 000 руб.
У кошт уваходзяць транспартныя паслугі, пражываньне ў гатэлі турклясы, экскурсійнае абслугоўваньне. Уваходныя квіткі аплачваюцца дадаткова.
Адрас: г. Менск, вул. Кастрычніцкая, 5–320 (будынак к/з «Менск», 3–ці паверх)
Т.: **222-46-51, GSM 551-30-75**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### АТЭСТАТ

**Згублены атэстат** аб сярэдняй адукацыі, выдадзены на імя Кацярыны Ягелы ў 2001 годзе Ліцэем БДУ, лічыць несапраўдным

### КАНТАКТЫ

**Сержуку Б. зь Берасьця.** Змагайся, сыне! Выпрабаваньне, якое выпала, няхай умацуе цябе ў Веры. Надзеі табе. Зь Любоўю. Маці хросная МФ

### КВАТЭРА

**Студэнт** здыме аднапакаёвую кватэру або пакой. Чысьціню, спакой і своечасовую аплату гарантую. Т.: 531–58–82. Аўген

### КАМПУТАР

**Прадам** новы кампутар. Любое зьмяненьне канфігурацыі. Танна, зь фірмовай гарантыяй. Т.: 780–06–42

### КНІГІ

**Чытайце** «Добрыя вершы» сваім дзеткам ад самае калыскі да школы! Т.: 325–24–23

**Кнігаабмен.** Аўдыё: прапаную касэты, CD , фанатэку, у т.л. «Я нарадзіўся тут», «Народны альбом», «Стары Ольса», «Крамбамбуля», «IQ–48», «Ладзьдзя роспачы», рэдкія запісы аўтэнтычнага фальклёру. Т.: 753–91–96.

**Архіўныя матэрыялы** з жыцьця і творчасьці М.Багдановіча, «Быкаў на свабодзе», «ARCHE», іншыя кнігі, энцыклапэдыі, часопісы, фільмы ды музыка на CD, значкі, майкі, плякаты на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (15.30—19.30). Т.: 707–40–01

**Прадам кнігі**: І.Насовіч «Словарь беларускаго наречия» 1870 г. факсым., Байкоў, Некрашэвіч «Беларуска–расейскі слоўнік» 1926 г. факсым., «Тэўтонскі ордэн», А.Разанаў, 3 кнігі, Л.Геніюш «Споведзь» ды шмат іншага. Багаты выбар. Т.: 753–70–05

**Прадам кнігі**: Кацар «Беларускі арнамэнт», «Пан Тадэвуш», «Армія Краёва на Беларусі», Ніцшэ, «Беларуска–польскі размоўнік», Беларускі кнігазбор: Баршчэўскі, Гётэ, «Летапісы і хронікі» ды шмат іншага. Гісторыя, архітэктура, паэзія, проза і г.д. Т.: 753–70–05

### ПРАЦА

**Беларускамоўная няня** шукае працу. Т.: 372–96–32

**Навучу** нямецкай мове. Падрыхтую да пасьпяховай здачы тэсту ці іспытаў па нямецкай мове. Т.: 290–47–72

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17–й. Т.: 235–18–72. Юры

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Сержуку П. з Барысава.** Дзякуй за допіс пра ўласныя імёны.

**Эдуарду Х. з Бабруйску.** Ідэі абноўленае лацінкі абмяркоўваліся ў «НН» у 1998—1999 гадах. Па выніках дыскусіі было вырашана не мяняць клясычнай беларускай лацініцы, замацаванай доўгай традыцыяй ужываньня.

**Наступны нумар газэты**
выйдзе праз два тыдні,
**16** верасьня.
З Днём Беларускай вайсковай славы і добра вам выкапаць бульбу.

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

### Я ад вас далёка...

Я ад вас далёка, бацькаўскія гоні, —
На чужое неба ўжо гляджу сягоньня.
Але думкай, сэрцам толькі вас я знаю,
Як і жыў, жыву я ў сваім родным краю.

І няма на сьвеце так вялікай меры,
І няма на сьвеце так каваных дзьвераў,
Каб хоць на часіну ў будні ці ў нядзелі —
Беларусь са мною разлучыць пасьмелі!

**Янка Купала, Пецярбург**
**17/30 ліпеня 1910 г.**

**В. Рэчкі, Вялейск. пав., Віленск. губ.**

Была я нядаўна тут, у сваім баку, і дзіву далася, ня ўгледзеўшы там ніводнай газэты. Калі ў Вільні ўжо ўсе прывыкаюць чытаць або слухаць — калі сам няграматны, а тамака аб гэтым нават і ня ведаюць. Толькі чаму гэта ў Рэчках ня знойдзецца такі, каторы, сабраўшы гаспадароў і сказаўшы, што ёсьць газэта «Наша Ніва», друкаваная нашай роднай бацькоўскай мовай, падгаварыў бы іх выпісаць яе хаўрусам (бо тутака народ дужа бедны), або і сам бы пачытаў. А слухалі б з ахвотай, бо мова свая, мудрых незразумелых слоў няма...

**Марыся Вясковая**
**№33, 1910 г.**

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3388 Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 20.00 31.08.2005.

Замова № 5001

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а